КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 9 (1292) 4 сакавіка 2017 г.

"К" інфармуе

Першадрукар: экран, кнігі, сцэна...

2 сакавіка ў прэс-цэнтры БелТА прайшла прэс-канферэнцыя па падрыхтоўцы да святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання з удзелам намесніка міністра інфармацыі Беларусі Аляксандра Карлюкевіча, начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры краіны Наталлі Задзяркоўскай і дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Рамана Матульскага.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

З галоўных анансаваных навін адзначым сказанае Карлюкевічам: у хуткім часе ў Беларусі выйдзе энцыклапедыя, прысвечаная дзейнасці Скарыны і яго паслядоўнікаў. Акрамя таго, паводле слоў намесніка міністра, Міністэрства інфармацыі, дзяржаўныя выдавецтвы рэалізавалі шэраг значных праектаў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

Мерапрыемствы да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання пройдуць сёлета і за мяжой. Плануюцца яны ў Польшчы, Чэхіі, Сербіі і іншых краінах. Напрыклад, у Бялградзе запланавана навукова-практычная канферэнцыя, у Маскве адбудзецца шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку прадстаўленне друкарскага станка, які наведвальнікі XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу маглі бачыць у рабоце. Падключацца да гэтай эстафеты краіны Цэнтральнай Азіі, Кітай. Ідуць перамовы аб фармаце скарынаўскіх мерапрыемстваў у Польшчы. Сярод мерапрыемстваў, якія ўжо адбыліся за мяжой, — прадстаўленне нашай кнігі на XVIII Міжнародны Вільнюскай кніжнай выставе-кірмашы.

У сваю чаргу, начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Наталля Задзяркоўская адзначыла, што сёлета на Дні беларускага пісьменства прэзентуюць дакументальны фільм пра Францыска Скарыну.

Заканчэнне — **на старонцы 2.**

8 сакавіка — Міжнародны жаночы дзень

АМАЗОНКІ З БРЭСТА. І НЕ ТОЛЬКІ...

Нечаканы — праблемны — ракурс для тэмы Міжнароднага жаночага дня прапанавалі "К" у Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі. Маўляў, якім чынам адлюстраваць у стацыянарнай экспазіцыі"жаночае пытанне". Погляд на тэму ад брэсцкіх музейшчыкаў чытайце на старонцы 7, а ўжо з першай паласы можна пазнаёміцца з аглядам "дамскіх" праектаў на выставачных пляцоўках. І спробай разабрацца, чаму іх так няшмат у астатнія 364 дні года.

На здымках, прадастаўленых музеем: заняткі ў Арганізацыі падрыхтоўкі жанчын да абароны краіны ў Брэсце-над-Бугам у 1920-я (фота з экспазіцыі); фрагмент залы, прысвечанай гісторыі Брэстчыны ў 1921 — 1939 гадах.

Форум

Жаночая лабараторыя

Штогод напярэдадні Міжнароднага жаночага дня адкрываюцца выставы з адпаведнымі матывамі. Карэспандэнт "К" даведалася, што сёлета падрыхтавалі музеі краіны: душэўныя нацюрморты або гучныя заклікі — адгалоссе Клары Цэткін і Розы Люксембург. Ды ўвогуле, выставы мастачак, прымеркаваныя да 8 сакавіка, — працяг так званай традыцыі, "класіка жанру", гендарная роўнасць (ці няроўнасць) і ў гэтым крыецца штосьці істотнае для грамадства?..

Вольга РОПАТ

Гісторыя свята ўсім вядомая, але, як мне падаецца, цікава назіраць, як трансфармуецца ўспрыманне яго ў грамадстве. Ад "рэвалюцыйнага" дня мы перайшлі да "цёплага", "хатняга" з кветкамі ды падарункамі. І зараз 8 Сакавіка толькі падкрэслівае жаноцкасць і мяккасць асоб ужо даўно "не слабага полу", бо ў некаторых жыццёвых сітуацыях жанчына куды больш смялейшая. Як на маю думку, чым больш жанчыны ўплываюць на грамадства (займаюць пасады, кіруюць буйнымі праектамі і гэтак далей), тым больш свята набывае падтэкст "сям'я, гармонія, утульнасць", быццам бы "ставячы на сваё месца" інтэлектуалак з грунтоўным унутраным стрыжнем. І добра. Зараз не заўсёды звяртаецца ўвага на біялагічны пол, а — на навыкі, прафесійнасць, працаздольнасць ды іншыя моманты. (Праўда, на жаль, жанчыны да 30 гадоў, як і тыя, хто нядаўна нарадзіў дзіця, не ў прыярытэце для наймальніка.) Нягледзячы на тое, што ў сённяшніх умовах жанчына павінна быць моцнай, толькі ў творчасці яшчэ застаецца "слабая" нота, якая надае работам тых жа мастачак адпаведны шарм, падкрэслівае душэўную цеплыню і мяккасць, якія апрыёры закладзены ў характары (але, вядома, ва ўсіх правілах ёсць выключэнні).

Прагледзеўшы ў сеціве сайты некаторых музеяў краіны, бачыш: да 8 Сакавіка, акрамя выстаў, падрыхтаваны вечары з класічнай музыкай ды іншыя музейныя праекты. Але засяродзім увагу менавіта на выставах. Так, у Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка адбылося адкрыццё выстаў габеленаў "Судакрананне" Ніны Пілюзінай і акварэлі "Акваторыя. Нацюрморт" Святланы Урублеўскай. У выставачнай зале Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці ў другі дзень вясны адкрылася выстава Лідзіі Шпектаравай "Пейзажы і кветкі", на работах яе — у тым ліку і помнікі архітэктуры Гродзеншчыны. У філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь — Гасцёўні Уладзіслава Галубка — сёння адкрываецца выстава акварэлі Ларысы Стрыжак і Наталлі Харольскай "Мы любім кветкі...", дзе ўлюбёныя ў паўпразрыстыя пераходы колераў убачаць 50 работ.

У арт-кавярні Нацыянальнага мастацкага музея краіны працуе выстава "Замілаванне простым" Юліі Гайдуковай, дзе ў большасці прадстаўлены нацюрморты ды пейзажы. Вядома, зараз нацюрмортамі не здзівіш, таму мастакі прыдумляюць розныя тэхнікі (нездарма вельмі часта сустракаецца пазнака "змяшаная тэхніка"). Нацюрморты Юліі запамінальныя, у іх адчуваецца акварэльнасць, паветранасць, маладосць. На размытым, паўпразрыстым фоне — грувасткія, кіслотныя мазкі, якія выбіваюцца, падказваючы форму аб'екта. Разглядаючы нацюрморты, злавіла сябе на думцы: яны нагадваюць цукеркі — карамелькі з кіславатым прысмакам, якімі ласавалася ў дзяцінстве. Інтуітыўна выдзяляючы дэталі, Юлія не "раскладвае" нацюрморт, а наадварот, пярэстыя плямы ды фігуры быццам бы зліваюцца ў пяшчотную мелодыю вясны. Так, з ейнай работай "Букет" грамадства пазнаёмілася яшчэ на "Восеньскім салоне…", дзе, як мне падаецца, яна крыху згубілася ў нагрувашчванні розных стыляў. Прадстаўленыя пейзажы — з асаблівым бачаннем. Мастачка звычайны краявід пераўтварае ў карціну-настрой. Гэта жывапіс жыццярадаснага чалавека, які не страціў дзіцячую наіўнасць. Жывапіс Юліі супакойвае, ён не "крычыць" і не імкнецца вырвацца наперад. Ён жыве ў гарманічных адносінах з асяроддзем. Здаецца, у такіх "ціхіх" нацюрмортах і крыецца самадастатковасць творцы.

Тым часам, у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў працуе выстава тэкстыльных аб'ектаў з воўны "Што ў жаночай галаве?", у якой удзельнічаюць мастачкі з Беларусі, Швецыі, Польшчы, Латвіі і Славеніі.

Заканчэнне — **на старонцы 7.**

Экспрэс-тур з...

Паездка ў Косава: амаль без замка і Касцюшкі

У перапынку паміж удзелам у пастаноўках ды гастролямі я ўсё ж такі "выкраў" Сяргея Суцько з Мінска і выкарыстаў у сваіх "карыслівых" мэтах. Для яго ж самога яны апынуліся карыснымі. З артыстам-вакалістам Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра мы выправіліся з настальгічным візітам да яго на радзіму — у Косава Івацэвіцкага раёна Брэстчыны. І даведаліся, як жывуць тыя ўстановы культуры, куды ён хадзіў 20 — 30 гадоў таму...

Алег КЛІМАЎ,
Мінск — Косава — Мінск

Пасля другога класа агульнаадукацыйнай школы бацькі аддалі Сярожу ў музычную на аддзяленне баяна. Яе іх сын і скончыў праз пяць гадоў. Са спадарожных прадметаў больш аддаваў перавагу спевам у хоры. "Заразіўся" вакальным мастацтвам будучы лаўрэат міжнародных конкурсаў шмат у чым ад бабулінага прайгравальніка пласцінак, якому ён з задавальненнем падпяваў, пераканаўшыся, што дома, акрамя яго самога, нікога няма. А вось шчырага жадання навучацца ігры на інструменце не адчуваў, імкнучыся ўсяляк адлыньваць ад заняткаў.

— Але ў мяне ўжо ў юным узросце было разуменне таго, што, калі я хачу вырвацца з роднай, аднак усё ж глыбінкі, з усімі яе не заўсёды вабнотамі, то музыку кідаць не варта, — тлумачыць свае "кар'ерныя памкненні" Сяргей Аляксеевіч. — Пры ўсім маім спакойным дачыненні да баяна, музыку ўвогуле я любіў.

У "музыкалцы" яе вучні арганізавалі гурт, у які ўваходзіў і Сяргей: у ім ён граў на клавішных. І крышку займаўся танцамі ў харэаграфічным гуртку. Наязджаючы ў Косава спачатку пачаткоўцам, а потым ужо артыстам, які адбыўся, у альма-матар ён заходзіць перакінуцца парай слоў з тымі, хто яго вучыў. Глыбока ў тое, што адбывалася ў музычнай школе апошнія гады, Сяргей Аляксеевіч не ўнікаў, і таму наш з ім візіт стаў, як я мяркую, у чымсьці адкрыццём для былога выпускніка. Дык вось, ужо гадоў з дзесяць школа знаходзіцца ў іншым будынку і называецца паіншаму — Дзіцячая школа мастацтваў (яшчэ ёсць выяўленчае аддзяленне).

— Да мяне даходзілі чуткі, — вырашаецца на шчырасць Суцько, — што і ў Косаве, і ў Баранавічах сёйтой лічыць, што гэта дзякуючы ім я стаў тым, кім цяпер з'яўляюся. А тады некаторыя педагогі ледзь не ў твар казалі мне, што я балбес і з мяне нічога талковага не выйдзе. Магчыма, з-за такога "асадачка" я не надта ахвотна іду на кантакты з некаторымі ўстановамі, у якіх вучыўся.

У 1996 годзе ён з другой спробы паступіў у Баранавіцкае дзяржаўнае музычнае вучылішча (цяпер — музычны каледж), прычым зноў на аддзяленне баяна (але там, праслухоўваючы фрагмент оперы "Іван Сусанін", цяга да спеву ў падлетку і ўзяла верх). Далей — па ўзыходзячай...

Заканчэнне — **на старонцы 10.**

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Віншаванні

Усім супрацоўніцам галіны культуры

Прыміце сардэчныя віншаванні з цудоўным вясновым святам!

Дзень жанчын заўсёды з асаблівай цеплынёй адзначаецца ў нашай краіне. Вобраз жанчыны быў і застаецца ўвасабленнем пяшчоты і матчынай любові, святла і дабрыні. Менавіта на жаночых плячах ляжыць штодзённы клопат аб падтрыманні агню ў хатнім ачагу і дабрабыце ў сям'і, выхаванні дзяцей. Вы ўмела сумяшчаеце гэтыя абавязкі з уласнай прафесійнай самарэалізацыяй.

У галіне культуры працуе амаль што пяцьдзясят тысяч жанчын, і кожная з вас заслугоўвае падзякі за сваю працу, таму што на сваім працоўным месцы вы праяўляеце высокі прафесіяналізм, талент, адказнасць і адданасць сваёй справе.

У гэты вясновы дзень хачу пажадаць вам шчасця, кахання і здароўя, здзяйснення самых запаветных мараў, надзей і жаданняў. Выказваю шчырую падзяку за ваш унёсак у развіццё нацыянальнай культуры.

Няхай кожны ваш дзень будзе напоўнены мірам і радасцю, сагрэты душэўнай цеплынёй, клопатам і ўвагай дарагіх і блізкіх людзей!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ

Дарагія жанчыны!

Ад імя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — членаў Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы і ад сябе асабіста віншую вас з Днём жанчын!

Спрадвеку беларускія жанчыны славяцца сваёй прыгажосцю, розумам, талентам і працавітасцю. На розных этапах гістарычнага шляху Беларусі яны ўнеслі і працягваюць уносіць адметны ўклад у развіццё нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці і дзяржаўнасці. Сёння прыгожая палова беларускага народа з годнасцю абараняе інстытут сям'і, нацыянальныя традыцыі, іншыя духоўныя каштоўнасці ад сучасных выклікаў свету.

Асаблівыя словы падзякі і ўдзячнасці выказваем мілым працаўніцам культурнай нівы за плён стваральнай і адказнай працы, дзякуючы якой умацоўваецца духоўны падмурак асобы, грамадства, дзяржавы.

Ад усёй душы жадаем вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту. Няхай вас заўсёды шануюць, цэняць і любяць мужчыны.

Старшыня камісіі Ігар МАРЗАЛЮК

Першадрукар...

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

— Праект стаў пераможцам адкрытага конкурсу кінапраектаў летась, — сказала Задзяркоўская. — Здымачны перыяд гэтага фільма завершаны, ідзе мантаж.

Акрамя таго, як адзначыла прадстаўнік Мінкультуры, верасень будзе насычаным па колькасці мерапрыемстваў, якія пройдуць згодна з праграмай святкавання 500-годдзя кнігадрукавання. Так, у Дзень беларускага пісьменства плануецца прадставіць спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі па п'есе Віктара Марціновіча, якая стала адным з пераможцаў конкурсу п'ес на тэму 500-годдзя кнігадрукавання і творчасці Скарыны. Акрамя таго, Нацыянальны гістарычны музей прапануе цікавы мультымедыйны праект — падарожжа Францыска Скарыны па месцах кнігадрукавання.

Годнай падзеяй стане 95-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі. З гэтай нагоды адбудзецца міжнародны кангрэс, прысвечаны 500-годдзю кнігадрукавання. Рэгістрацыя на форум, як зазначыла Наталля Задзяркоўская, сёння ўжо адкрыта. Акрамя таго, верасень будзе адзначаны буйным выставачным праектам "Францыск Скарына і яго эпоха". На ім прадставяць арыгіналы выданняў Францыска Скарыны з розных краін свету.

Як удакладніў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, на выставе мяркуецца прадставіць выданні Скарыны, што раней не пакідалі краіны іх знаходжання.

— Дзякуючы праекту "Францыск Скарына і яго эпоха" мы зможам увачавідкі прадставіць маштабную спадчыну першадрукара, — адзначыў Раман Матульскі. — Як вядома, каля 50 краін валодаюць асобнікамі кніг першадрукара. Сёння перамовы пра ўдзел у выставе вядуцца з многімі дзяржавамі свету, таму назваць колькасць краін, якія возьмуць удзел у выставачным праекце ў Мінску, пакуль яшчэ рана. Бо, як вядома, арганізацыя вывазу кніг за межы краіны знаходжання — складаны і працаёмкі працэс.

Па словах Рамана Матульскага, Нацыяналка з партнёрамі рэалізавала праект па выданні факсімільнай 20-томнай серыі "Кніжная спадчына Францыска Скарыны: факсімільнае выданне". У хуткім часе выданне будзе прэзентавана журналістам. Мяркуецца, гэтыя кнігі будуць перададзеныя ўстановам, якія аказвалі дапамогу ў падрыхтоўцы і стварэнні серыі. Таксама плануецца папоўніць выданнем фонды публічных бібліятэк Беларусі. Напрыклад, як адзначыў Матульскі, факсімільныя Бібліі Скарыны абавязкова будуць прадстаўлены ў кожнай раённай і абласной бібліятэцы краіны, у бібліятэках ВНУ.

Акрамя таго, як адзначыў "К" намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Алесь Суша, лічбавыя копіі выданняў Францыска Скарыны перадасць у дар Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі Брытанская бібліятэка.

— Рашэнне агучыў дырэктар Брытанскай бібліятэкі Роўлі Кітынг на сустрэчы з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раманам Матульскім у Лондане, — адзначыў Алесь Суша, які таксама прысутнічаў на імпрэзе. — Да таго ж, Брытанская бібліятэка ўпершыню стала арганізатарам мерапрыемства з удзелам беларусаў: ім стала святочная акцыя да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

Акрамя таго, па словах Сушы, падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Брытанскай бібліятэкай і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, прэзентацыя факсімільнага перавыдання кніжнай спадчыны Францыска Скарыны і яго перадача Брытанскай бібліятэцы, знаёмства з беларускімі ўнікальнымі выданнямі. Яшчэ адной важнай падзеяй дня стала канферэнцыя, прымеркаваная да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, у якой прынялі ўдзел гісторыкі-славісты, супрацоўнікі дзвюх бібліятэк, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, шырокай грамадскасці і СМІ. У час канферэнцыі адбылася ўрачыстая перадача факсімільнага выдання кніжнай спадчыны Францыска Скарыны Брытанскай бібліятэцы, якая з'яўляецца захавальніцай некалькіх каштоўных пражскіх і віленскіх выданняў беларускага першадрукара.

Як паведаміў Алесь Суша, адмыслова да свята ў Вільнюсе Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры падтрымцы Пасольства Літвы ў Беларусі было падрыхтавана выданне "Вільня часоў Францыска Скарыны" — альбом на беларускай, літоўскай і англійскай мовах, які расказвае пра колішнюю сталіцу ВКЛ.

Віктар Бабарыка і Раман Матульскі прэзентуюць выданні. / Фота Юрыя ЧАРНЯКЕВІЧА

А 3 сакавіка Нацыянальная бібліятэка Беларусі і "Белгазпрамбанк" прадстаўлялі ў галоўнай кніжніцы краіны Міжнародны выставачны праект, прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, пад назвай "Дарогамі Скарыны з "Белгазпрамбанкам".

У рамках праекта прэзентавалася вернутая ў Беларусь "Малая падарожная кніжыца", выдадзеная Францыскам Скарынам у 1522 годзе ў Вільні. Прычым, як адзначыў на прэс-канферэнцыі кіраўнік банка Віктар Бабарыка, гэта не адно выданне, а цэлых 18 кніг, сабраных разам пад адну вокладку. Яны ўпрыгожаны ўнікальнымі гравюрамі, застаўкамі і ініцыяламі. 9 кніг маюць пасляслоўе самога першадрукара. Перамовы аб набыцці, да слова, ішлі цягам 10 гадоў.

Такім чынам, як у сваю чаргу сказаў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі, цяпер у Беларусі налічваецца 28 кніг Скарыны: 10 з іх, пражскага перыяду, здаўна знаходзяцца ў Нацыяналцы, а цяпер яшчэ 18 — у карпаратыўнай калекцыі банка. Дарэчы, "Малая падарожная кніжыца" перададзена на захоўванне ў фондасховішча галоўнай бібліятэкі краіны, таму з ёй можна будзе працаваць розным айчынным навукоўцам і даследчыкам.

Сам жа праект "Дарогамі Скарыны…" пройдзе цягам года ў краінах, звязаных з жыццём і дзейнасцю першадрукара — у Літве, Польшчы, Чэхіі і Італіі. Першай кропкай на маршруце стане Нацыянальны музей "Палац вялікіх князёў літоўскіх" у Вільнюсе, дзе з 4 мая па 4 чэрвеня пройдзе выстава, на якой будуць экспанавацца як "Малая падарожная кніжыца", так і яшчэ адна кніга Францыска Скарыны "Кніга Іава" (Прага, 1517) менавіта з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Фаліянт таксама прадэманстравалі гасцям прэс-канферэнцыі.

К

Мацей Радзівіл праводзіць экскурсію па сваёй калекцыі. / Фота аўтара

"Люблю згадваць словы апошняга нясвіжскага ардыната Альбрэхта Радзівіла. Ён нарадзіўся ў Берліне, яго маці была родам з Украіны, бабуля і прабабуля — з Францыі і Германіі. Ён вучыўся ў Санкт-Пецярбургу, ажаніўся з амерыканскай дзяўчынай. Калі князь ужо жыў у Нясвіжы і адзін з журналістаў запытаўся ў яго, кім па нацыянальнасці той сябе лічыць, Радзівіл без прамаруджвання адказаў: "Я — тутэйшы". Дык вось, я таксама адчуваю сябе тутэйшым, хоць і наведваю радзіму продкаў два-тры разы на год", — гэтымі словамі князь Мацей Радзівіл адкрыў выставу твораў з асабістай калекцыі "Радзівілы: лёсы краіны і роду" ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Настасся ПАНКРАТАВА

Для спадара Мацея зладжаная экспазіцыя мае асаблівую энергетыку: па ягоным прызнанні, у Нацыянальным мастацкім з'явіліся карціны, на якія князь глядзеў, калі быў яшчэ маленькім хлопчыкам. Гэты позірк продкаў надаваў яму ўпэўненасці ў неабходнасці далейшага даследавання гісторыі роду. Прамоўца працягваў: "Упершыню я патрапіў у Беларусь 28 гадоў таму. У мяне быў дазвол на наведванне Мінска, але я нелегальна паехаў у Мір, Нясвіж… Уявіце: я стаў

Італьянскі рэжысёр Матэа СП'ЯЦЫ для айчынных тэатралаў стаў амаль што сваім. Пачаўшы са сцэнічных замалёвак са студэнтамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, што ставіліся колькі гадоў таму, спадар Матэа хутка перайшоў на прафесійную сталічную сцэну. Прызнаны спецыяліст па камедыі дэль артэ, ён у 2014-м выпусціў прэм'еру "Viva Commedia!" у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Максіма Горкага. Сёлета на той жа сцэне за яго іменем з'явілася знакамітая "Карчмарка" Карла Гальдоні. Але маладому рэжысёру падалося замала займацца адным праектам, таму паралельна ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек распачаліся рэпетыцыі горкай — па вызначэнні аўтара — трагедыі "Пансіён "Belvedere".

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота Аліны САЎЧАНКА

— Спадар Матэа, дзе навучаюць рэжысуры італьянскую моладзь?

— У Італіі дзве ВНУ займаюцца адукацыяй рэжысёраў: адна акадэмія знаходзіцца ў Рыме, другая — у Мілане. Аднак самае галоўнае адрозненне нашай акадэмічнай сістэмы ад вашай у тым, што мастацкая адукацыя для рэжысёраў (як і для большасці спецыяльнасцей, звязаных з мастацтвам), не ўключаны ва ўніверсітэцкі сектар. Я чуў, што нашы чыноўнікі імкнуцца вярнуць яе ва ўніверсітэцкае лона, нашым міністрам культурнай спадчыны, культурнай дзейнасці і турызму Дарыа Франчэскіні зроблены першыя крокі па выпраўленні сітуацыі, аднак пакуль усё застаецца, як ёсць. Што да мяне, то я спачатку вучыўся на акцёра камедыі дэль артэ. А пасля, з пасады галоўнага акцёра, які трымае трупу, паступова перайшоў у галіну рэжысуры. Зазначу, менавіта работа ў камедыі дэль артэ, даследаванне традыцыйнай маскі народнага тэатра, пошук яе характару прывялі мяне непасрэдна да той працы, якую я раблю зараз, і якую можна назваць у нейкай ступені эксперыментальнай.

— Ці лёгка вашаму выпускніку-рэжысёру знайсці сабе працу па спецыяльнасці?

— Вы закранулі болевую кропку нашай краіны. У нас гавораць, што па заканчэнні акадэміі былы студэнт выскоквае ў пустэчу… Часам шанцуе: узнікаюць свабодныя праекты ці мастацкі кіраўнік тэатра запрашае пэўнага рэжысёра і перадае яму паўнамоцтвы набіраць пастаноўчую каманду, адбіраць акцёраў і гэтак далей. У цэлым жа шляхі прафесійнага станаўлення рэжысёра бываюць вельмі таямнічымі. Таму ад шчырага сэрца хачу падзякаваць Беларусі, што яна дала мне магчымасць паказаць сябе. У Італіі гэта складана, асабліва зыходзячы з майго ўзросту. Мне падалося неверагодным, калі мастацкі кіраўнік Горкаўскага тэатра Сяргей Кавальчык, ацаніўшы маю працу са студэнтамі Акадэміі мастацтваў, прапанаваў зрабіць што-небудзь на прафесійнай сцэне.

Дарэчы, і арганізацыя акцёраў у нашых дзяржавах адрозніваецца. Мне шкада, што ў Італіі няма такіх добра структураваных тэатраў, як у вас. Італьянскія тэатры ў нейкай ступені можна назваць пустымі каробкамі, якія напаўняюцца з дапамогай разавых

Увага! Аб'ява!*

Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

— загадчык кафедры гукарэжысуры;
— загадчык кафедры малюнка, жывапісу, скульптуры;
— дацэнт кафедры скульптуры;
— дацэнт кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас:

220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў; тэлефон: 366-93-41.

Газета КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўнырэдактар—СяргейСяргеевічТРАФІЛАЎ. **Адказнысакратар**—ЮрыйКАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2017. Наклад 4 251. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 03.03.2017 у 20.00. Замова 1001. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Фрагмент экспазіцыі. / Фота Дзмітрыя КАЗЛОВА

Князь з "тутэйшых"

першым Радзівілам, які пасля вайны прыехаў у родавы маёнтак! Мае продкі жылі на гэтых землях больш за пяць стагоддзяў, лёс нашай сям'і цесна звязаны з гісторыяй Беларусі".

Спадчыннік фаміліі зрабіў добрую кар'еру ў бізнесе, стаў саўладальнікам некалькіх кампаній. Пры гэтым не забываўся на папаўненне збору твораў мастацтва, які ўдалося захаваць бацькам у часы Другой сусветнай вайны і панавання камуністычнага ладу: "Сучасная калекцыя дапоўнена ўнікальнымі партрэтамі з дакладна вядомай гісторыяй самога палатна і асобы, якая на ім адлюстравана, а таксама работамі невядомых аўтараў, якія я набываў на аўкцыёнах і ў Сеціве". У праекце Нацыянальнага мастацкага можна пабачыць галерэю вобразаў славутых дзеячаў гісторыі, сярод якіх Барбара Радзівіл, "Геркулес Літоўскі" Юрый Радзівіл, заснавальнікі Нясвіжскай рэзідэнцыі Мікалай Радзівіл Сіротка і мануфактуры слуцкіх паясоў Міхаіл Казімір Радзівіл Рыбанька. Безумоўнай каштоўнасцю калекцыі з'яўляецца тое, што некаторыя партрэтныя вобразы — напрыклад, Цэцылія з Радзівілаў Сняўская, Антаніна Мяньчыньская, Тэафілія з Радзівілаў Бжастоўская — вядомыя мастацтвазнаўцам толькі ў адзіным варыянце! Некаторыя партрэты падпісаны вядомымі еўрапейскімі майстрамі. Сярод аўтографаў можна пабачыць прозвішча італьянскага жывапісца Марчэла Бачарэлі, які служыў пры двары Станіслава Аўгуста Панятоўскага, аўстрыйца Францішка Ксаверыя Лампі, фламандскага гравёра Дамініка Кусто.

Намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Сяргей Вечар распавёў карэспандэнту "К", што на абароце некаторых работ музейшчыкі ўбачылі зроблены чырвоным колерам надпіс "Замак Вавеля". Высветліўся ўнікальны факт: у свой час кракаўскі Вавель узяў у Сапегаў некалькі палотнаў на дэпазіт, бо апошнія з-за розных прычын не цікавіліся сваёй спадчынай. Пасля падзення камуністычнай улады творы пачалі вяртаць былым уладальнікам, але Сапегам яны былі не зусім патрэбны, таму рарытэтныя партрэты выкупіў спадар Мацей. Суразмоўца звярнуў маю ўвагу на пахавальны партрэт Караля Станіслава Радзівіла: "Такія партрэты было прынята ставіць у саркафагу. Для Беларусі гэтая з'ява ўнікальная, у краіне захавалася, здаецца, усяго дзве аналагічныя работы". Між іншым, каб прывезці тое ў Беларусь, неабходна было атрымаць асобы дазвол у Міністэрстве культуры Польшчы, бо ён стаіць на ўліку, як каштоўная рэч тамтэйшай спадчыны.

Дарэчы, з такім жа грыфам на выставе яшчэ чатыры работы, у тым ліку акварэль Юльяна Фалата "Паляванне ў Нясвіжы з удзелам кронпрынца Вільгельма, пазней — імператара Германіі Вільгельма II, Антонія Вільгельма Радзівіла і Мацея Радзівіла". З гэтай работай звязаная сямейная легенда. Як распавёў публіцы князь Мацей, аднойчы да яго ў госці завітаў італьянскі князь, вядомы заўзятар палявання.

Заканчэнне — **на старонцы 6.**

"Правілы гульні" паводле Матэа

Матэа Сп'яцы.

праектаў. Сабраная пад пэўную пастаноўку трупа можа спадзявацца на турнэ на пяць-шэсць месяцаў. Толькі ў рэпертуарным тэатры я маю магчымасць пабачыць у фае фотаздымкі трупы, дзякуючы якім разумееш, што трапіў у сапраўдны дом.

— Беларускія спектаклі паспрыяюць вам у атрыманні цікавых праектаў на радзіме?

— Вельмі на гэта спадзяюся, але заўсёды згадваю лацінскую прыказку, якая вельмі падыходзіць да майго выпадку: "Няма прарока ў сваёй Айчыне"… Пакуль у планах улетку паставіць дома са сваім калектывам кабарэ. Астатнія месяцы распісаны пастаноўкамі ў замежжы, прынамсі, збіраюся папрацаваць у Кітаі ў якасці асістэнта опернага рэжысёра. Хачу паспрабаваць сябе ў розных жанрах і кірунках.

— З гэтай жа прычыны вы вырашылі выйсці на сцэну беларускага тэатра лялек? Вы неяк зазначалі, што гэты від мастацтва ў Італіі не так і распаўсюджаны, як у Беларусі…

— На мой погляд, у Італіі тэатр лялек існуе хутчэй як спадчына традыцыйнага народнага тэатра масак. Для мяне сталася адкрыццём ваша лялечнае мастацтва, якое адкрытае да найноўшых формаў, выкарыстоўвае сучасныя тэхнікі і нязвыклыя сістэмы лялек. У вас я атрымаў цудоўную магчымасць паглядзець іншыя спектаклі і такім чынам напоўніцца новымі тэхнікамі, якія, сыходзячы з маіх назіранняў, у нас не распаўсюджаны. На маю думку, самае значнае адрозненне паміж тэатрам лялек і тэатрам масак у тым, што ў першым акцёр выкарыстоўвае ляльку, а ў другім сам з'яўляецца лялькай. Як бачыце, маска становіцца тым звяном, якое звязвае тэатр лялек і драматычны тэатр.

— Вы адчувалі розніцу ў працы з драматычнымі артыстамі і лялечнікамі?

— Безумоўна, адзначыў, што акцёрам тэатра лялек прасцей чым драматычным працаваць з аб'ектамі і разумець некаторыя тэхнічныя моманты працы з маскай і неадушаўлёнымі прадметамі. Што да пытанняў інтэрпрэтацыі, бывае, драматычныя акцёры робяць гэтую працу больш філігранна. Але для мяне яны ўсе, у першую чаргу, артысты. Нават, як я высветліў, яшчэ і з'яўляюцца сябрамі па курсе, бо ў адзін час вучыліся ў вашай Акадэміі мастацтваў. Таму працаваць з усімі надзвычай прывабна, а вынік у адным і ў другім тэатрах атрымліваецца досыць цікавым.

— Традыцыю работы ў якасці старшага ў трупе акцёра, а не кіраўніка, хто дыктуе свае ўмовы, вы перанеслі ў сваю штодзённую працу. Ці лёгка даліся беларускім акцёрам нязвыклыя для іх правілы гульні?

— Так, я рэжысёр, які працуе не над артыстамі, а разам з імі. Адпаведна, я ніколі не даю вызначанага вобраза, якому павінны адпавядаць занятыя ў пастаноўцы. Найбольшую цяжкасць у беларускіх акцёраў выклікае неабходнасць быць актыўнымі складнікамі працэсу. Зразумела, тое вынікае з традыцый вашай школы ігры. Тая ж імправізацыя не нараджаецца на пустым месцы: каб рухацца, неабходна мець пэўную падрыхтоўку. Прынамсі, у "Пансіёне "Belvedere" мы шмат імправізуем: па сутнасці, у нас складваецца сцэнічная драматургія. Гэта вельмі здорава — і адначасова надзвычай складана. Бывае, з'яўляюцца цікавыя знаходкі, аднак мы не можам іх выкарыстоўваць у спектаклі. Ці рухаемся ў кірунку, які падаецца перспектыўным, але ў выніку трапляем у тупік.

Дадзены праект стаўся эксперыментам не толькі для акцёраў, але і для мяне. Справа ў тым, што мы адмовіліся ад традыцыйных масак камедыі дэль артэ, якія закрываюць тры чвэрці твару і пакідаюць вольным рот. Мастак Тацця́на Нерсісян прапанавала "нямую" маску, што цалкам зацягвае твар. Спектакль, адпаведна, будзе ісці без словаў. Гэта вялікі выклік і для мяне як рэжысёра, і для акцёраў. Слова нас больш не выратоўвае, з-за чаго нам неабходна быць вельмі дакладнымі, кожны рух на сцэне павінен мець значэнне. Мы ствараем новую сцэнічную мову, прыдумваем адмысловую пластыку. У гэтым выпадку маска выкарыстоўваецца на сто працэнтаў.

— Скарыстоўваць традыцыйнае прасцей за стварэнне арыгінальнага. Як доўга з мастаком шукалі патрэбны вобраз?

— Хацелася, каб на сцэну выйшлі розныя характары са сваімі адметнымі рысамі, таму я прыехаў да спадарыні Тацця́ны з серыяй ілюстрацый са старадаўняга трактату па фізіягноміцы. Каб зразумець форму і глыбіню выражэння, за аснову таксама браліся малюнкі Леанарда да Вінчы, на якіх ён занатоўваў старцаў. Мастак прапанавала мне сваю тэхніку першапачатковай працы з пластылінам. Яна прапаноўвала шмат варыянтаў, я крыху падпраўляў, напрыклад, мог зрабіць больш прыплюснутым нос, потым Тацця́на прыводзіла загатоўку ў парадак, я ўносіў новыя прапановы. Мы працавалі ў шмат рук, і вынік, на маю думку, атрымаўся адметным. Ад чыстага сэрца скажу, што маскі Тацця́ны Нерсісян шыкоўныя! 24 сакавіка адбудзецца прэм'ера спектакля, дзе публіка зможа сама ў гэтым упэўніцца.

К

Дзяжурны па нумары

Па-за зонай дзеяння сеткі?

Ужо некалькі месяцаў, як у Беларусі праходзіць літаратурны праект "Movabox". Здавалася б, гульня, забаўка: трэба зайсці на ягоны сайт, прайсці тэст, складзены з гумарам, пакінуць свае каардынаты — і чакаць прэзента. Не грашовага — крэатыўна-творчага.

Надзея БУНЦЭВІЧ

У "box" паклалі кнігу з аўтографам аўтара ў атачэнні жартоўных "артэфактаў", звязаных з яе зместам. Сярод "таямнічых каштоўнасцяў" можа быць кулёк семак, шышка, налепкі — ды якія заўгодна рэчы, што раптам пачынаюць ззяць дадатковымі сэнсамі. Але ўсё гэта — знешні бок, прызначаны скіраваць увагу на галоўнае — самі кнігі. А праз іх — на новае аблічча беларускай літаратуры, якое ўжо нарадзілася, але ўсё яшчэ застаецца быццам "нябачным", дзесьці "па-за зонай дзеяння сеткі".

Менавіта для гэтага ў кавярнях некалькіх беларускіх гарадоў, пачынаючы са сталіцы, усталяваны скрыні, якія з'яўляюцца чымсьці накшталт "міні-бібліятэк": тут можна ўзяць кнігу, пачытаць (нават з "дачытваннем" дома) — і вярнуць на паліцу. Ці проста прынесці свой улюбёны твор — і пакласці для больш грунтоўнага вывучэння яго іншымі.

Завершаны два этапы праекта, прысвечаныя "Авантурам студыёзуса Вырвіча" Людмілы Рублеўскай і "Дзецям Аліндаркі" Альгерда Бахарэвіча. Поўным ходам ідзе трэці, звязаны ўжо не з прозай, а з паэзіяй, — зборнікам Віктара Жыбуля "Дзяцел і дупло". А раней тая ж кампанія "Velcom" праводзіла акцыю "Чытаем па-беларуску", звернутую да дзяцей.

Пра ўсё гэта можна складаць гімнічныя оды, спяваць дыфірамбы, услаўляючы цудоўную ініцыятыву. Але міжволі ўзнікае пытанне: а дзе ж нашы кампазітары, рэжысёры, сцэнарысты, прадстаўнікі іншых творчых прафесій? Што чытаюць яны, чым натхняюцца? Бо літаратура заўсёды крочыла поруч з іншымі відамі мастацтваў і натхняла на з'яўленне шматлікіх музычна-тэатральных твораў. Тыя ж згаданыя вышэй кнігі, здавалася б, так і просяцца ў оперу, мюзікл, тэатралізаваны вакальны цыкл, іншыя жанры. Дык чаму ж не ўвасабляюцца? Можа, самі літаратары — супраць?

Цікава, што на пытанне, як бы ён паставіўся да "пераводу" яго аповесці ў мюзікл, аўтар адной з задзейнічаных у праекце кніг адказаў, што, па-першае, падобных прапаноў да яго не паступала (хто б сумняваўся!). А па-другое, ён быў бы занепакоены, што ў падобным выпадку ад яго твора застануцца хіба некаторыя сюжэтныя абрысы — і цалкам сыдзе філасофскі складнік. Што ж, у чымсьці ён меў рацыю, бо ў вядомай опернай класіцы (у тым жа "Фаўсце" Гуно ці "Яўгене Анегіне" Чайкоўскага) ад вялізных "энцыклапедый жыцця" засталіся найперш любоўныя перыпетыі, звязаныя з эмацыйным станам герояў. У "Кармэн" Бізэ, "Пікавай даме" ўсё таго ж Чайкоўскага і многіх іншых творах былі пераасэнсаваны характары персанажаў, сама матывацыя іх памкненняў. А калі далучыць сюды яшчэ і разнастайнасць рэжысёрскіх прачытанняў, уключаючы самыя "экстравагантныя", дык трывогу літаратараў, здавалася б, і ўвогуле можна зразумець. Разам з тым, будзем шчырымі: неверагодная папулярнасць некаторых аповедаў наўпрост звязана з іх адлюстраваннем у іншых відах мастацтва. Той жа Уладзімір Караткевіч, да прыкладу, не пагрэбаваў выступіць лібрэтыстам оперы "Сівая легенда" Дзмітрыя Смольскага, калі кампазітар паказаў яму частку напісанай музыкі.

Ды ўсё ж, здаецца, галоўная праблема ў тым, што пра новую беларускую літаратуру ні самі нашы музыканты, ні кіраўніцтва тых жа тэатраў, якое магло б стымуляваць іх цікавасць да яе, увогуле нічога не ведаюць. Адкінем прозу, возьмем паэзію, бо тут, здавалася б, шлях да спеўнага ўвасаблення яшчэ больш кароткі. І не абавязкова менавіта ў рок-стылістыцы! Узгадаю нашумелы ў праграме леташняга Міжнароднага тэатральнага форуму "TeART" спектакль паводле вакальнага цыклу Валерыя Воранава "З жыцця насякомых". У аснову былі пакладзены вершы расійскага літаратара першай трэці XX стагоддзя Мікалая Алейнікава, прапанаваныя кампазітару Святланай Бень. Але ж… ці не з'яўляецца творчасць нашага Віктара Жыбуля шмат у чым своеасаблівым працягам эстэтыкі паэтаў-абэрыутаў? Калі да радкоў Хармса звяртаўся ўжо суцэльны шэраг беларускіх музыкантаў (нават дысертацыя пра гэта пішацца), дык чаму ж не разабрана на музычныя цытаты паэзія Жыбуля? У свой час з Віктарам супрацоўнічала хіба кампазітар Вольга Падгайская: у складзе гурта "Рацыянальная дыета" ў іх быў праект, які дэманстраваўся ў зале Беларускага саюза кампазітараў у межах аднаго з фестываляў. Ёсць у Вольгі і раманс на яго радкі. Але гэтага замала!

Калі Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі ладзіць штогод тэматычныя кампазітарскія конкурсы, можа, наспеў час звярнуць увагу тых жа студэнтаў (а з імі і сталых творцаў) не толькі на прызнаную класіку, але і на маладую па часе нараджэння беларускую літаратуру? А яшчэ калі б да гэтага далучыліся арганізатары цяперашніх "моўных" праектаў — з іх крэатыўнасцю, уменнем давесці цікавую ідэю да бліскучага ўвасаблення, зацікавіць гэтым прэсу і грамадства. Дарэчы, а чаму і не?..

К

Лічбавы падыход

Для каго зарабіць — не праблема?

Працягваем падводзіць вынікі першага года дзеяння Дзяржпраграмы "Культура Беларусі" на 2016 — 2020 гады.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Не сакрэт, што дзяржаўная "кішэня" сёння, у параўнанні з мінулымі гадамі, паменшала. Адсюль і зварот кіраўнікоў сферы культуры да спонсарскай і мецэнацкай дапамогі, увядзенне новых відаў платных паслуг і многае іншае… У выніку ўсіх пералічаных захадаў доля пазабюджэтных даходаў у агульным аб'ёме фінансавання арганізацый культуры няўхільна расце.

Менавіта на гэты аспект, дарэчы, і звяртаў увагу на выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь міністр Барыс Святлоў. Ён адзначыў, што сродкі, атрыманыя летась ад пазабюджэтнай дзейнасці арганізацый сферы, склалі 133,9 мільёна рублёў, што на 8,9 % больш, чым у 2015 годзе (у лідарах тут — Міншчына і Гомельшчына). Вырасла на 3,3 % і сума спонсарскай дапамогі: яна "заважыла" за 2016 год на 6,2 мільёна рублёў.

Задача на год наступны, агучаная міністрам, — забяспечыць павялічэнне аб'ёму пазабюджэтных сродкаў не менш, чым на 9 %. А ўвогуле, паводле аднаго з даведзеных паказчыкаў Дзяржапраграмы "Культура Беларусі", доля пазабюджэтных даходаў у агульным аб'ёме фінансавання дзяржаўных арганізацый культуры павінна за пяцігодку дарасці да 26 %.

Натуральна, зарабіць чвэрць з усёй сумы фінансавання ўстановам культуры Беларусі не так і лёгка. Скажу нават больш: пакуль такое магчыма толькі некаторым буйным арганізацыям, якія ў першую чаргу месцяцца ў абласных цэнтрах ды сталіцы. Гэтую думку "К" пацвердзіла і першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Інга Заўгародняя. Па яе словах, працаваць з прыбыткам сёння могуць далёка не ўсе.

— І летась, і ў мінулыя гады ў Беларусі зніжаецца колькасць жыхароў сельскай мясцовасці, што адбываецца ў першую чаргу, у сувязі з адтокам маладых людзей у раённыя цэнтры ды ў сам Гомель, — кажа кіраўнік рэгіянальнай сферы культуры. — З гэтай прычыны адзначаецца і зніжэнне колькасці наведванняў кінавідэасеансаў, тэатральных і відовішчных пастановак, а таксама бібліятэк, музеяў, клубаў. Хаця варта прызнаць, што, напрыклад, абласная кінавідэагаліна спрацавала летась даволі паспяхова і прынесла за год неблагі даход.

Як дадала "К" начальнік аддзела фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння галіны ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Алена Паўлава, летась значны працэнт пазабюджэтных даходаў назіраўся не толькі ў кінатэатрах Гомеля, але і ў абласной філармоніі, Цэнтры моды і прыгажосці "Крыштальная Німфа", Гомельскім палаца-паркавым ансамблі і некаторых іншых установах, прычым як у абласным цэнтры, так і ў рэгіёне. Напрыклад, сярод лідараў быў згаданы культурна-спартыўны цэнтр, што месціцца ў аграгарадку Зашыр'е Ельскага раёна (у ім, дарэчы, "К" бывала не раз).

— У выніку доля пазабюджэтных даходаў у агульным аб'ёме фінансавання дзяржарганізацый культуры вобласці аказалася роўнай 21,2 % пры плане ў 20 %, — рэзюмавала Алена Паўлава.

У лідарах па гэтым паказчыку — і Мінская вобласці. Так, як адзначыла "К" першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ІРКСМ Мінаблвыканкама Святлана Баранок, рост даходаў арганізацый сферы культуры рэгіёна ў параўнанні з мінулым годам склаў 121,6 %.

— Акрамя таго, значную дапамогу сферы культуры Міншчыны аказалі летась і спонсары, — адзначыла Святлана Баранок. — Некаторых з іх мы вылучылі на ганаровае званне "Мецэнат года ў сферы культуры". Гэта, напрыклад, "Беларускалій", які заўсёды падтрымлівае нашы знакавыя мерапрыемствы. Але ёсць і прыватныя спонсары, якія выдаткоўваюць значныя асігнаванні на развіццё культуры Міншчыны. Скажам, гэта яскрава бачна на прыкладзе Ракаўскай дзіцячай школы мастацтваў.

Па больш падрабязную інфармацыю "К" звярнулася ў згаданую ДШМ. Як патлумачыла кіраўнік установы Юлія Мякінка, з бізнесменамі школа супрацоўнічае ўжо не першы год.

— Менавіта за кошт спонсарскіх сродкаў пазалетась для правядзення заняткаў нам быў прывезены з Расіі вельмі добры раяль, — адзначыла дырэктар Ракаўскай ДШМ. — А сёлета за грашовыя сродкі, прадастаўленыя неабыякавымі людзьмі, мы набылі ўсю мэблю, якая была нам патрэбная пры пераездзе ў новы, адрамантаваны будынак школы, а таксама з'ездзілі на Міжнародны фестываль-конкурс "Рэгата талентаў", які ладзіўся ў італьянскім горадзе Рыміні. У склад дэлегацыі, да слова, уваходзілі 24 чалавекі: вакальны і інструментальны калектывы школы, а таксама педагогі-кіраўнікі. Я спадзяюся на супрацоўніцтва са спонсарамі і надалей.

Што ж, некаторыя ўстановы культуры працуюць над прыцягненнем пазабюджэтных сродкаў для фінансавання сваёй дзейнасці няблага. Іншая справа, што Гаяў Мецэнатаў сёння знайсці не так проста, нягледзячы на іх актыўны пошук культработнікамі як праз медыя, так і праз інтэрнэт. Да таго ж, яны часта самі не надта афішуюць сваёй дзейнасці… І хто сказаў, што бескарыслівасць не ў модзе?

К

Крыжы ў Курапатах. / Фота Іллі СВІРЫНА

Сітуацыя вакол будаўніцтва офіснага цэнтра непадалёк ад урочышча, чыя назва стала сімвалам сваёй эпохі, яўна перавысіла ўсе магчымыя чаканні. Лакальны, здавалася б, эпізод (інвестар атрымаў зямлю пад забудову на ўскрайку ахоўнай зоны, заступіўшы на яе літаральна адной нагой) набыў папраўдзе агульнаграмадскі рэзананс. Не будзем пакуль прагназаваць, чым яно ўсё скончыцца, але хочацца верыць, што гэты прыкры канфлікт займее, прынамсі, адзіны плён: ён паслужыць урокам на будучыню. Прычым не толькі для інвестараў.

Урокі Курапатаў

Ілья СВІРЫН

Дыялог удзельнікаў канфлікту да пары да часу нагадваў размовы сляпога з глухім. Адзін бок казаў пра "звычайную гаспадарчую дзейнасць", другі — пра "будоўлю на касцях"… Апошняе спецыялісты лічаць не болей чым спрэчнай метафарай: верагоднасць парушыць каўшом бульдозера спакой памерлых у дадзеным выпадку падаецца мізэрнай, бо той лапік паміж украінай гарадской забудовы ды МКАД ужо капаны-перакапаны. Да ўсяго, як сведчаць старыя карты, да вайны там былі вясковыя гароды…

Ці можна назваць гэтае новае будаўніцтва "знішчэннем Курапатаў", "знявагай памяці продкаў" і сотнямі іншых пафасных выразаў, на якія ўжо расстараліся шматлікія публіцысты? Нагадаю, офісны цэнтр меўся паўстаць не на тэрыторыі самога ўрочышча і нават не ўсутыч да яго, а насупраць — па сутнасці, ва ўжо сфармаваным раней урбаністычным атачэнні.

Узнёслыя словы ўзбуджаюць пачуцці і матывуюць да дзеяння. Але, падазраю, тут варта казаць хіба пра будаўніцтва, якое мае пад сабой даволі плыткі юрыдычны падмурак. Зрэшты, ужо толькі гэта можа разглядацца як належная нагода для грамадскага абурэння. А калі ўлічыць, што пытанне, ці спрыяльным будзе для некропаля суседства з бізнес-цэнтрам, і наогул падаецца рытарычным…

Што папраўдзе здзіўляе, дык гэта бадай паталагічная цікавасць інвестараў да ваколіцаў Курапатаў — пагатоў, у ваколіцах Мінскай кальцавой аўтадарогі можна ўбачыць мноства іншых не засвоеных пакуль пляцовак, без усялякіх моцных канатацый. Здавалася б, першы ўрок ужо быў атрыманы. Загарадны комплекс, вядомы ў народзе пад кодавай назвай "Бульбаш-хол", дасюль так і не распачаў сваю працу — нават пры тым, што з юрыдычнага пункту гледжання ён, нібыта, легітымізаваны. Цяжка сказаць, што стала таму прычынай: ці то проста крызіс, ці то адпаведны іміджавы шлейф, ад якога аб'екту ніколі ўжо не пазбыцца, ці то само яго размяшчэнне — амаль на ростанях дзвюх магістраляў са звышнасычаным трафікам.

І можна сабе толькі ўявіць, што здарылася б у тым выпадку, каб амаль усутыч з некропалем усё ж распачалося будаўніцтва вялізнага выставачнага комплексу. А такія планы, як вядома, былі, і замарожаны яны, трэба меркаваць, выключна праз эканамічныя, а не ідэалагічныя прычыны. Цяпер, хочацца верыць, замарожаны ўжо назаўсёды…

Відавочна, у дэталёвым планаванні гэтых тэрыторый неабходна ісці ад вялікага да малога, беручы за кутні камень сам помнік спадчыны — месца смутку агульнанацыянальнага значэння. А далей ужо вызначаць, якое атачэнне яму пасуе.

З іншага боку, няцяжка заўважыць яшчэ адну дзіўную акалічнасць. Датычныя Курапатаў гучныя інфармацыйныя нагоды апошніх гадоў звязаныя найперш з тым, што робіцца менавіта ў ваколіцах некропаля. Куды радзей мы чуем пра тое, што адбываецца непасрэдна на яго тэрыторыі. Напрыклад, пра талаку энтузіястаў, якія вырашылі прыбраць лес ад смецця. Дзіўна і тое, што гэтая справа дасюль застаецца прэрагатывай адных энтузіястаў — і, зразумела ж, сістэмнага характару так і не набыла.

Шматлікія размовы пра стварэнне нацыянальнага мемарыяла застаюцца размовамі вось ужо без малога тры дзесяцігоддзі. Натуральна, вызначэнне архітэктурнага аблічча гэтага месца памяці патрабуе немалых сродкаў ды ўдзелу ладнай кагорты прафесіяналаў. Без дзяржавы тут цяжка будзе абысціся. Але пастаянныя захады па добраўпарадкаванні, а таксама і забеспячэнне сякой-такой аховы парадку — гэта, напэўна, пад сілу і добра арганізаваным энтузіястам, асабліва пры належным спрыянні ўладаў таго раёна, на тэрыторыі якога знаходзіцца гісторыка-культурная каштоўнасць.

Пра шашлыкі ў Курапатах напісана ўжо неаднаразова. Але варта задацца пытаннем: ці ўсё было зроблена, каб у ахвотнікаў іх адведаць кавалак устаў упоперак горла? Ды наўрад ці: нават жыхары бліжэйшых шматпавярховак не заўсёды могуць уцямна патлумачыць, што ж гэта такое за месца. Прыкра, што ў цяперашнім даволі агрэсіўным урбаністычным атачэнні той страшны гай дасюль выглядае нейкай невыразнай паводле свайго сэнсавага пасылу плямай. У адваротным выпадку, інвестар, пэўна, і сам сто разоў бы падумаў, ці варта яму мець такое суседства.

Парадаксальным чынам, інвестыцыйны праект на плошчы ўсяго ў 0,32 га ўзбудзіў глабальную праблему: грамадскае ўспрыняцце саміх Курапатаў. Здавалася б, на гэты конт ужо сказана ўсё, што толькі можна сказаць, даўно выпрацавана і афіцыйная пазіцыя, а спробы яе рэвізіі пацярпелі поўнае фіяска. Але публіцысты ўсё адно амаль слова ў слова паўтараюць пафасныя выразы сваіх папярэднікаў амаль трыццацігадовай даўніны. І здзіўляцца гэтаму не выпадае: шашлыкі ж паранейшаму смажаць…

Але ўсё ж згаданы інвестпраект мае шанец увайсці ў гісторыю. Парадаксальным чынам ён можа выступіць у ролі свайго кшталту "трыгера", які зрушыць з месца даўно застаялы воз. У найбуйнейшых дзяржаўных СМІ зноў вядзецца гутарка пра стварэнне мемарыяла, грамадскія актывісты распачалі на краўдфандынг-платформе збор сродкаў на ўсталяванне па перыметры ўрочышча 120 металічных крыжоў… І вельмі хочацца верыць, што гэты рух не счэзне сам па сабе, як гэта нярэдка бывае — да наступнага скандальнага інвестпраекта. А Курапаты паступова і планамерна пачнуць набываць іншы статус — не "сякеры пад лавай", якую пры нагодзе можна выкарыстаць для ўзбуджэння эмоцый, але месца памяці пра тыя жахлівыя падзеі, якія не выкрасліць з нашай гісторыі.

К

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на сваім афіцыйным сайце размясціла інфармацыю ў дачыненні да ўчастка па вуліцы Мірашнічэнка, 49 у горадзе Мінску.

Участак, які прылягае да дома па вуліцы Мірашнічэнка, 49 у горадзе Мінску, размешчаны за межамі тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці "Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій ва ўрочышчы Курапаты Мінскага раёна Мінскай вобласці" і зон яе аховы. Дзеючы да ўступлення ў сілу названага тэхнічнага нарматыўнага прававога акта праект зон аховы названай гісторыка-культурнай каштоўнасці, зацверджаны пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 12 мая 2004 года № 15, прадугледжваў зацвярджэнне схемы зон аховы на перыяд да распрацоўкі горадабудаўнічага праекта ўчастка стадыі Дэталёвы план.

У сувязі з праектаваннем аб'екта "Горадабудаўнічы праект дэталёвага планавання тэрыторыі ў межах: МКАД — мясцовы праезд — а/в Калодзішчы — Заслаўе — мяжа мемарыяла "Курапаты" (распрацоўшчык УП "Мінскграда") выкананы навукова-даследчыя работы па вывучэнні ўмоў фарміравання тэрыторыі, натурныя даследаванні, вывучаны матэрыялы гісторыка-архіўных, бібліяграфічных і археалагічных даследаванняў, на падставе якіх ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку зроблена карэкціроўка межаў зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Прапанова па ўсталяванні зон аховы ў складзе горадабудаўнічага праекта разгледжана на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры. Межы ахоўнай зоны ўстаноўлены з усходняга боку гісторыка-культурнай каштоўнасці, у мэтах забеспячэння захаванасці ўчастка, на якім у адпаведнасці з выяўленымі звесткамі, існавала дарога. На ўчастку з паўднёва-ўсходняга боку ад помніка гісторыі (на ўчастку ад існуючага будынка па вуліцы Мірашнічэнка, 49 да МКАД) паводле матэрыялаў гісторыка-архіўнага плана праходзіла лінія ЛЭП (у цяперашні час адсутнічае), размяшчалася спартыўная пляцоўка, наяўнасць значных у гісторыка-культурным плане аб'ектаў на гэтым участку не выяўлена.

Названыя аб'екты, уключаючы выкананыя працы па прыладзе МКАД, мелі значнае ўздзеянне на земляны пласт, падчас якіх праведзенымі археалагічнымі даследаваннямі не было выяўлена чалавечых парэшткаў.

Атрыманыя звесткі дазволілі распрацоўнікам падрыхтаваць навукова абгрунтаванае рашэнне аб усталяванні межаў ахоўнай зоны з паўднёва-ўсходу па краі лясного масіву, што адпавядае методыцы прывязкі межаў зон аховы да ўстойлівых аб'ектаў, забяспечваючы магчымасць іх выяўлення на мясцовасці.

Доўгая дарога да імені...

Чаму аўтар запісаў на CD-дадатку да кнігі не пазначаны?

У выдавецтве "Вышэйшая школа" выйшла кніга "Сямейныя абрады і звычаі". Аўтар тэксту, Тамара Варфаламеева, грунтоўна апісала сямейную абраднасць усіх гісторыка-культурных рэгіёнаў Беларусі. На электронным дадатку да кнігі змешчаны экспедыцыйныя аўдыя- і відэазапісы Ірыны Мазюк (каля 80 трэкаў), адпаведныя тэматыцы выдання. Узровень тэкстаў, запісаў і ўкладання высока ацанілі ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.
У рэдакцыю "К" звярнулася аўтарка запісаў і ўкладальніца электроннага дадатку. Імя Ірыны Мазюк не пазначана ні ў бібліяграфічным апісанні кнігі, змешчаным на абароце тытульнага аркуша, ні на паверхні дыска. Звесткі пра ўкладанне дасяжныя толькі пасля таго, як дыск устаўлены ў дыскавод. Аўтарку турбуе, што яе імя не будзе ідэнтыфікавацца падчас бібліяграфічнага пошуку, як тое было з амаль усімі дыскамі-дадаткамі да тамоў серыі "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў".

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Асноўнае месца працы Ірыны Мазюк — Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, дзе яна выкладае традыцыйнае ткацтва будучым спецыялістам па тэкстылі і дызайнерам. Запісы песеннага фальклору даследчыца робіць у свой вольны час і за ўласны кошт. Здавалася б, што прасцей — знайсці бабулю, пасадзіць, уключыць сродак фіксацыі гуку ці відэа. Але добрых спявачак засталося не так і шмат. Некаторыя ў гурце маглі толькі падпяваць, без пачынальніцы губляюцца. Бабуля можа жыць у глухой вёсцы, да якой трэба яшчэ неяк дабрацца, часта грамадскі транспарт ходзіць не штодня. Гэта вялікія фінансавыя выдаткі і нават пытанне фізічнага стану, наколькі здароўе дазваляе даследчыку вандраваць. Да бабулі ў госці трэба прыехаць не з пустымі рукамі, а хоць з нейкім гасцінцам. Настроіць яе пэўным чынам, каб яна спявала, не звяртаючы ўвагі на камеру. Такім чынам, даследчыцы даводзіцца браць на сябе ролю менеджара і рэжысёра.

Акрамя таго, Ірына вучыць народным песням зацікаўленых аматараў. Традыцыйная спеўная манера адрозніваецца ад сучаснай "прыроднасцю" падачы голасу, Ірына адзначае пэўны псіхатэрапеўтычны эфект спеваў. Для таго, каб атрымаць уяўленне пра гукападачу, недастаткова бывае паслухаць аўдыя, лепш бачыць спявачку на відэа: як яна бярэ паветра, як артыкулюе гукі. Для захавання экспедыцыйнага відэа трэба вялікія аб'ёмы камп'ютарнай памяці, а гэта таксама выдаткі. Каб наладзіць пошук, матэрыялы павінны быць апісаныя і сістэматызаваныя. Калі паўстае пытанне ўкладання дыска, аўдыя і відэа трэба апрацаваць: дзесьці прыбраць шум, дзесьці падрэзаць — гэта вялікая па аб'ёме праца, што патрабуе засяроджанасці і пэўных эмацыйных высілкаў, напрыклад, калі даследчыца ведае, што некаторыя з яе інфармантак ужо памерлі.

Карэспандэнтка "К" апытала ўсе зацікаўленыя бакі і шэраг экспертаў, каб высветліць, як жа павінны афармляцца звесткі пра электронныя дадаткі да кніг.

Наталля ЗЕЛЯНЕЎСКАЯ, загадчык аддзела бібліяграфічнай апрацоўкі дакументаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:

— Супрацоўнікі бібліятэкі правяраюць кожны дыск, што да нас паступае. У бібліяграфічным апісанні імкнемся адлюстраваць максімум звестак: абавязкова фіксуецца тое, што выдавецтва прывяло на абароце тытульнага аркуша кнігі і на паверхні дыска, што да яе прыкладаецца. Калі нейкія істотныя звесткі запісаныя на дыску, то можам увесці іх таксама, але варта разумець, што бібліёграф не можа быць спецыялістам у кожнай галіне ведаў. Таму найлепш, калі выдавецтва надае дыску ўласны загаловак, апісвае яго змест у анатацыі.

■ Добра, калі пазнака пра электронны дадатак ёсць на вокладцы кнігі, **гэта падвышае яе шанцы на продаж.** Не варта таксама забывацца на інтарэсы чытачоў: мала хто ходзіць у краму з ноўтбукам, куды можна ўставіць дыск. Таму пажадана, каб звесткі пра электронны дадатак былі надрукаваныя ў кнізе, да якой дыск прыкладаецца.

Часамі звесткі для бібліяграфічнага апісання могуць брацца з прадмовы кнігі, але самае істотнае выдавецтву лепш усё ж пісаць на абароце тытульнага аркуша. У разгорнутым бібліяграфічным апісанні ў каталогу Нацыянальнай бібліятэкі ёсць поле "Інтэлектуальная адказнасць", туды трапляюць, напрыклад, прозвішчы фатографаў, чые здымкі выкарыстаныя ў кнізе. Але бяруцца яны з абароту тытульнага аркуша, не з подпісаў уласна пад фотаздымкамі, прадмовы ці заключэння.

Што да кнігі "Сямейныя абрады і звычаі", то яна паступіла ў Нацыянальную бібліятэку зусім нядаўна, у колькасці двух асобнікаў. Разгорнутае бібліяграфічнае апісанне на яе пакуль не рабілася, падчас яго складання абавязкова прывядзем звесткі, што змешчаны на дыску.

Пасля таго, як бібліяграфічнае апісанне будзе сфармавана, мы адкрытыя да прапаноў па яго дапрацоўцы. Аўтар ці прадстаўнік выдавецтва можа звярнуцца па тэлефоне, электроннай ці звычайнай пошце. У нас быў выпадак, калі аўтар прасіў дапоўніць бібліяграфічнае апісанне некалькі разоў, і мы ішлі яму насустрач.

Святлана КАГАДЗЕЕВА, галоўны рэдактар выдавецтва "Вышэйшая школа":

— Калі ў кнігі вялікі аўтарскі калектыў, выдавецтва працуе з адным чалавекам, які бярэ на сябе адказнасць за ўзгадненне ўсіх пытанняў з іншымі аўтарамі. У аўтарскай дамове прапісана, што аўтар, які перадае матэрыялы выдавецтву, нясе адказнасць за тое, каб пазначыць усе крыніцы, адкуль ён узяў інфармацыю, і іншых аўтараў у выпадку выкарыстання іх матэрыялаў. Калі ўзнікаюць прэтэнзіі па аўтарстве, яны перанакіроўваюцца ад выдавецтва да аўтара, з якім заключана дамова.

Перад тым, як падпісаць кнігу ў друк, мы накіроўваем бібліяграфічныя звесткі на ўзгадненне ў Кніжную палату і, калі ёсць заўвагі, то выпраўляем. Што да выдання "Сямейныя абрады і звычаі", то гэта не першая кніга ў нашым выдавецтве, што выходзіць з такім афармленнем. Склалася практыка афармлення камбінаваных выданняў, што звесткі пра кнігу прыводзяцца ў бібліяграфічным апісанні на абароце тытульнага аркуша, а звесткі пра дыск — у тытульным лісце, захаваным на самім дыску. Афармленне робіцца адпаведна з ГОСТамі, а там няма патрабавання даваць звесткі пра дыск з камбінаванага выдання на тытульным аркушы кнігі. З Ірынай Мазюк была заключаная дамова на матэрыялы, што выйшлі на дыску, суадносна, яе імя было пазначала там жа. Парушэння аўтарскага права тут няма, але ўжо пасля таго, як наклад (600 асобнікаў) быў надрукаваны, мы вырашылі зрабіць уклейку ў кніжку. На ўклейку будуць вынесеныя звесткі з тытульнага аркуша дыска, там будзе апісаны ўвесь аб'ём работы, зроблены Ірынай Мазюк, і прыведзены назвы ўсіх твораў на дыску (а іх амаль 80). Гэты аркуш будзе ўклеены ў канцы кнігі, побач з дыскам, ва ўсе дасяжныя нам асобнікі, у тым ліку тыя, што знаходзяцца на рэалізацыі ў крамах Мінска. У кнігі, што ўжо перададзеныя ў іншыя гарады, на жаль, тэхнічнай магчымасці зрабіць уклейку няма.

Алена ІВАНОВА, дырэктар Нацыянальнай Кніжнай палаты:

— У выпадку з камбінаванымі выданнямі, якім з'яўляецца кніга "Сямейныя абрады і звычаі" з электронным дадаткам, выданню надаецца агульны нумар ISBN, а таксама ўласныя нумары ISBN для кнігі і дыска. Суадносна, і на кнізе, і на дыску стаіць па два нумары ISBN. Дыск не можа распаўсюджвацца асобна ад кнігі, таму калі ён нейкім чынам згубіўся, дык ідэнтыфікаваць яго прыналежнасць да камбінаванага выдання дапаможа нумар ISBN. У бібліяграфічным апісанні, якое друкуецца на абароце тытульнага аркуша кнігі, павінна быць пазначана, што выданне ўтрымлівае электронны дадатак. Што да звестак, якія павінны прыводзіцца пра дадатак, то гэта — адказнасць выдаўца, роля Кніжнай палаты толькі кансультацыйная. Па вялікім рахунку, павінны быць звесткі пра ўкладальніка дыска ў бібліяграфічным апісанні, але калі выдавец з нейкіх прычын вырашыў гэта не пазначаць, то гэта па-за кампетэнцыяй Кніжнай палаты, гэта хутчэй пытанне аўтарскага права.

Аляксей БІЧУРЫН, кіраўнік Цэнтра па калектыўным кіраванні маёмаснымі правамі Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці:

— У гэтым выпадку мы маем справу з немаёмасным правам аўтара на імя. У Законе аб аўтарскім праве і сумежных правах не прапісана дакладнага шляху, якім чынам павінна быць пазначана імя аўтара, каб яго права лічылася абароненым. Адназначны вердыкт у прыведзеным выпадку можа вынесці толькі суд. Я мяркую, што калі ўзнікне судовая спрэчка, выдавецтва будзе апеляваць да таго, што права аўтара на імя не парушанае, бо звесткі прыведзеньмі ўпісваецца ў практыку беларускай установы, з якой ён працуе, скажам, прапісаць яго імя ў праграмцы шрыфтам пэўнага памеру. Нам гэта можа здавацца надуманым, але сведчыць, што ў іншых краінах культура выкарыстання аўтарскага права склалася і яго патрабаванні звычайна задавальняюць.

Тамара ВАРФАЛАМЕЕВА, аўтар тэксту кнігі "Сямейныя абрады і звычаі":

— Праца з фальклорам — гэта сфера, не адлюстраваная ў заканадаўстве, шмат што даводзіцца вырашаць па аналогіі. Канечне, імя даследчыка павінна быць пазначана, для гэтага варта шукаць форму адпаведна ГОСТам, што рэгулююць выдавецкую справу. Кніга "Сямейныя абрады і звычаі" распачала серыю "Духоўная спадчына беларусаў", хаця яна павінна была пачацца кнігай пра каляндарныя абрады. Усё ж каляндар — аснова беларускай традыцыйнай культуры. У "Сямейных абрадах і звычаях" выкарыстаны матэрыял з тамоў серыі "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў" і новыя звесткі, што назбіралі даследчыкі за апошнія гады. Выданне атрымалася нятанным, яно каштуе ў кнігарнях каля 40 рублёў. Выдавецтва плануе тэматычныя кнігі ў працяг серыі, калі "Сямейныя абрады і звычаі" добра раскупяцца.

■■■

З усяго пачутага ад экспертаў зразумела, што лепш пазначыць імя ўкладальніка дыска ўсюды, дзе толькі можна: і на самім дыску, і на яго паверхні, і ў бібліяграфічным апісанні. У апошнім пасля надпісу "+CD" у дужках можна вылучыць нешта кшталту "аўт. зап. і укл. — Імярэк". Лічбавыя тэхналогіі імкліва развіваюцца, паступова прыходзіць усведамленне істотнасці аўтарскага права, хаця ў Беларусі гэта адносна новая юрыдычная галіна. Таму кожны выпадак выдавецтвам варта разглядаць індывідуальна, працаваць з аўтарамі, прыслухоўвацца да іх меркаванняў, узгадняць арыгінал-макеты выданняў. Магчыма, давядзецца нават змяніць нейкую звыклую выдавецкую практыку, але ж гэта непазбежна: усё цячэ, усё змяняецца.

Добра, калі пазнака пра электронны дадатак ёсць на вокладцы кнігі, гэта падвышае яе шанцы на продаж. Гэта новая рыса, уведзеная выдавецтвам "Вышэйшая школа" акурат для кнігі "Сямейныя абрады і звычаі" (на тамах серыі "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў" такая практыка яшчэ не выкарыстоўвалася). Добра было б шырэй "рэкламаваць" дыск у выдавецкай анатацыі, калі гэта дазваляюць нарматывы па яе аб'ёме: напісаць, з якіх рэгіёнаў запісы, колькі іх змешчана на дыску, магчыма, вылучыць нейкія асабліва рэдкія ўзоры песеннай творчасці (у выпадку з кнігай "Сямейныя абрады і звычаі", напрыклад, заручальныя песні ці творы, што выконваліся для сіраты).

Не варта таксама забывацца на інтарэсы чытачоў: мала хто ходзіць у краму з ноўтбукам, куды можна ўставіць дыск. Таму пажадана, каб звесткі пра электронны дадатак — назвы песень, іх працягласць, лакалізацыя, жанравая прыналежнасць — былі надрукаваныя ў кнізе, да якой дыск прыкладаецца. Зрэшты, гэта таксама спрыяла б узрастанню продажаў кнігі і знаходзіцца ў сферы інтарэсаў самога выдавецтва. К

Князь з "тутэйшых"

(Заканчэнне. Пачатак на старонках 2 — 3.)

Пільна ўглядаючыся ў пейзаж, ён выказаў недавер, маўляў, як каранаваныя асобы маглі сустрэць мядзведзя ўзімку. "Сапраўды, у гэтую пару касалапыя спяць, але дзеля кронпрынца вырашылі не чакаць вясны, а разбудзіць мядзведзя да часу", — усміхнуўся прамоўца.

У сталічную экспазіцыю арганічна ўпісаліся жывапісныя партрэты князёў Радзівілаў са збору Мастацкага, рэдкія старадрукі і прысвечаны паляванню фотаальбом Радзівілаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама дакументы з Нацыянальнага архіва нашай краіны, звязаныя з нацыяналізацыяй нясвіжскай маёмасці. Як вядома, нясвіжская рэзідэнцыя страціла статус прыватнай уласнасці толькі ў верасні 1939 года. З інструкцыі "камісару замка-музея былога маёнтка князёў Радзівілаў" бачна, што новая ўлада не змагла адразу забяспечыць бяспеку "музею вялікай навукова-гістарычнай каштоўнасці". У дакуменце таго часу пазначана: неабходна "мець на ўвазе, што ахова, якая зараз існуе, не можа абараніць музей ад расцягвання, бо прыслугі маецца больш за 100 чалавек і існуе велізарная колькасць вядомых і, верагодна, невядомых выхадаў з замка". Але ў хуткасці ад ідэі стварэння музея адмовіліся. З выпіскі з пратаколу пасяджэння ЦК КП(б)Б ад 4 студзеня 1941 года можна пабачыць, як склаўся лёс маёмасці і каштоўнасцей былога палаца: бібліятэку і архіў накіравалі ў Акадэмію навук БССР, каштоўныя мастацкія карціны і скульптуры — у Карцінную галерэю БССР, рыцарскія даспехі, зброю і іншую маёмасць рыцарскай залы — гістарычнаму музею БССР і кінастудыі, калекцыі паляўнічай залы — Беластоцкаму дзяржаўнаму запаведніку, касцюмы і мэблю — Вялікаму тэатру оперы і балета БССР, БДТ-І, Дому работнікаў мастацтваў…

Па словах гаспадара калекцыі, са з'яўленнем фатаграфіі традыцыя замаўляць партрэты членаў магнацкай фаміліі стала перарывацца, а зараз увогуле сышла. Сучаснае пакаленне, прынамсі, сам князь Мацей, яго жонка (таксама, дарэчы, з дрэва Радзівілаў) і іх пяцёра дзяцей фамільных партрэтаў не маюць. Радавы збор доўгі час бачылі толькі дамашнія і сябры княжацкага дома. Там, у Варшаве, па запрашэнні гаспадара і пабачылі экспазіцыю супрацоўнікі НММ, пасля чаго прапанавалі прывезці яе ў беларускую сталіцу. "Наша сям'я безумоўна рада такой магчымасці, бо разумее, што мастацтва толькі тады жыве, калі даступнае людзям", — падкрэсліў спадчыннік роду.

Пасля Мінска выставу чакае Гомель, потым — польская Бяла-Падляска. Як распавёў князь, экспазіцыяй зацікавіліся ў Літве, дзе гісторыю Радзівілаў таксама разглядаюць як частку летапісу краіны.

К

Наша фота і супольнасць вакол яго

"Аб'яднанне фатографаў мае быць рабочай структурай"

Мы пачалі размову са старшынёй Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў Сяргеем МІХАЛЕНКАМ з успамінаў пра выставу фотаздымкаў "Вільнюс за адзін дзень" (2007), якая адбылася ў час існавання галерэі "Znята" ў кінатэатры "Цэнтральны". Тады праходзіла шмат выстаў, была яркая хваля цікавасці да фатаграфіі, ішлі баталіі на інтэрнэт-сайтах. Зараз хваля сышла, патрабаванні да фотапраектаў сталі вышэйшымі, а настроі ў фотарэпарцёрскай і арт-супольнасці змяніліся.

Ведаць правілы і мяняць іх

— ...Ці памятаеце вы, Сяргей, што былі добрым стрыт-фатографам?

— Вядома, і мне па-ранейшаму цікавая стрыт-фатаграфія. Але больш не атрымлівалася на ёй сканцэнтравацца. Тады, у 2007 годзе, я мэтанакіравана ездзіў у Вільнюс, гэта была здымка менавіта для праекта. Тое, што здымаецца цяпер, адбываецца досыць выпадкова падчас падарожжаў. Я люблю ездзіць па Беларусі, але ў асноўным здымаю партрэты, пейзажы. Хочацца знайсці ў нашай прасторы кадры, якія маглі б стаць вядомай выявай краіны: я бачу іх чорна-белымі, графічнымі і вельмі душэўнымі. У нашым клімаце тры сезоны ператварыліся ў дэпрэсіўныя, такія, заўсёды пераходныя, восень-зіма-вясна, але "карцінкі" я бачу класныя! Тым не менш, пэўнай задумкі, ніткі, каю нешта нанізваць, пакуль няма.

— Забягаючы наперад, скажу, што ў апошні час у дакументальнай і рэпартажнай фатаграфіі нечакана з'явіліся яркія праекты. Акрамя сваіх звычайных задач у СМІ змог выйсці на выставачны ўзровень Сяргей Гудзілін, з рэпартажаў пачыналі Аляксандр Саенка, Сяргей Балай. Па-мойму, гэта цікавая з'ява.

— Так, для іх важным было сысці ў бок ад свайго мэйнстрыму. У кожнага ж сваё разуменне творчасці і аўтарства, адпаведна, складваецца вынік за межамі прафесійнай дзейнасці. У рэпартажнай фатаграфіі можа быць толькі падзейнасць, строгія правілы, а можна падысці да таго, што адбываецца, не шаблонна. Можна парушаць законы, разумеючы іх, фатаграфія ад гэтага толькі выйграе. Для гэтага, уласна, і конкурсы праводзяцца. А можна наогул адысці ад навінавага моманту і зрабіць паўнавартасны праект.

Стварыць структуру, якая працуе

— Умоўныя 100 дзён на чале творчага саюза — якімі яны былі?

— Больш дакладна, гэта "100 дзён" на пасадзе старшыні маленькай супольнасці, якая цяпер называецца "Беларускае грамадскае аб'яднанне фатографаў". Фактычна ж было вельмі шмат адміністрацыйнай працы: мы перарэгістравалі ранейшы саюз, аднавілі сваё членства ў Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў. Распрацавалі новую сімволіку аб'яднання. Прыводзім у парадак спіс яго сяброў. Гэта яшчэ не планаванне, не праектаванне, а толькі падрыхтоўка да асноўнай працы. Пакуль я не да канца ўяўляю сабе, што ў нас за арганізацыя, колькі ў ёй людзей і хто яны. Так што будзем разбірацца з гэтымі пытаннямі, збіраем каманду, ужо адрамантавалі невялікі офіс. Гэта тэхнічная праца, якая не бачная, але яна павінна быць зроблена.

— Але заяўлены прыярытэт — выданне штогадовага альманаха беларускай фатаграфіі — застаецца?

— Так, гэтая мэта пастаўлена, і я лічу, што яна рэальная. Кніга і выстава — да канца года. Ёсць разуменне, папярэдні план, веданне, як гэта зрабіць. Калі з нейкіх прычын раптам не атрымаецца, значыць, тое мая віна: заўсёды ёсць абставіны, якія могуць сур'ёзна перашкодзіць у рэалізацыі любога праекта.

— На мой погляд, у нашых культурных інстытуцыях ёсць праблема з адказнасцю. Яны разумеюць яе як бюракратычны механізм, пры гэтым мала думаючы пра культурную палітыку, пра стратэгіі, з аднаго боку, і пра жывыя ініцыятывы, з другога. У гэтым кантэксце хачу запытацца: ці бачыце вы беларускую фатаграфію ў пазакаланіяльнай культурнай парадыгме, або мы ўсё яшчэ залежым ад метраполіі? То пераймаем, то апаніруем, азіраемся на знешнія фактары.

— Думаю, мы яшчэ пасапраўднаму не адарваліся ад постсавецкай сістэмы, і нам складана адарвацца. З іншага боку, і метраполія змяняецца. Ёсць там старыя арыенціры, але ёсць і іншая Расія, арыентаваная на сусветны кантэкст, еўрапейскі, у прыватнасці. Мы сталі незалежнымі і адразу рынуліся глядзець не на свой досвед, шукаць не ўнутры сябе, а звонку. Тое ж самае было і ў Расіі, і вельмі часта мы ў адным кірунку глядзім.

Мне прасцей меркаваць па дакументальнай фатаграфіі, па вопыце "Belarus Press Photo". Хто да нас прыязджаў з майстар-класамі, у рамках адукацыйных праграм? У каго аказалася больш разумення, з кім прасцей было знайсці агульную мову? Андрэй Паліканаў, Сяргей Максімішын, Андрэй Чэжын, Юрый Козыраў, Ігар Мухін. Куратары Ірына Чмырова, Надзея Шараметава, Ганна Шпакава. Адным з першых лектараў быў выбітны даследчык фатаграфіі Аляксандр Лапін — для шматлікіх пачаткоўцаў фатографаў, іх прафесія, ці захапленне ў лепшым сэнсе слова, тады падзялілася на "да" і "пасля" Лапіна. Пагадзіцеся, гэта ж лепшыя фатографы і эксперты, якія працуюць цяпер у Расіі, а пры ўсіх магчымасцях і адкрытасці межаў людзі звяртаюць увагу на тое, што блізка.

— Ну, літоўскія выставы таксама гадамі да нас вазілі... Ды і польскія. І нямецкая фатаграфія была.

— Так, з вялікіх выстаў — "Мая Літва" Антанаса Суткуса, але гэта класіка! Гэта не новае пакаленне! А сучасная фатаграфія ў Літве таксама іншая. Пры тым, што творчая сустрэча, адукацыйны курс і выстава — не адно і тое ж.

— Мабыць, нагадаем яшчэ Ракаўскаса, Вікшрайціса, Каваляўскаса.

— ...І яны таксама ўплываюць на нашу фотакультуру. Ёсць пытанне, хто і што ўспрымае... Цяпер некаторыя здымаюць рэгулярна, ходзяць на выставы і лекцыі, але самі не выстаўляюцца. Мы не ведаем, што яны робяць, але можна сказаць дакладна — не ўсе фатографы ўспрымаюць праектную еўрапейскую фатаграфію. Я падзяляў бы актыўную і менш актыўную частку супольнасці — на каго і што ўплывае, як ўсё развіваецца.

Думаю, навінная фотаграфія ў нас з Літвой у нейкай ступені падобная. Але калі параўноўваць з літоўцамі, ёсць адчуванне, што, у цэлым, яны глядзяць больш на сябе: вось мы такія, мы так здымаем, і нам не трэба камусьці падабацца. У беларусаў пакуль ёсць матыў, як бы так зняць, каб гэта спадабалася. Хоць фатографы са сваім почыркам з'яўляюцца, яны вызначыліся выразна і працуюць так, як самі вырашылі. Гэта Сяргей Гудзілін, Аляксандр Васюковіч, Сяргей Балай, вядомы Вадзім Заміроўскі — у іх з'яўляецца стыль. Разам з тым, мы ўсё яшчэ азіраемся на тое, як нас успрымуць. Так, патрэбныя свае інстытуцыі, якія і ў гэтым таксама дапамогуць фатографу.

Практыкі аб'яднання

— Летась адзначалася 120-годдзе Ігната Абдзіраловіча, да гэтага часу не асабліва вядомага беларускага філосафа. Ён напісаў усяго адзін тэкст — "Адвечным шляхам" (1921), але прапанаваў цалкам новую і вельмі канструктыўную канцэпцыю "формы, што ліецца", якую цяпер бачаць як цалкам рэлевантную для развіцця нашай культуры. У яе рамках можна казаць пра змянлівую беларускую ідэю, і паспяховую самаідэнтыфікацыю на мяжы ўсходняй і заходняй цывілізацый, на межах XIX — XX стагоддзя, а зараз і XX — XXI. Гэта, вядома, не ісціна ў апошняй інстанцыі, але... Мо ёсць прыклады такой "формы, што ліецца" ў фотапраектах?

— Вельмі цікава, але пакуль я бачу толькі, як змяняецца аб'яднанне. Яно было зусім іншым пры першым старшыні Валерыі Лабко, пастаянна ішлі змены ўсе гэтыя гады, вельмі розныя і няпростыя. А цяпер, у першую чаргу, я думаю пра структуру, якая не столькі дэкларуе, колькі дапамагае фатографам рэалізоўваць праекты, дапамагае куратарам і крытыкам. Для гэтага трэба разумець, якія ў нас ёсць магчымасці і рэсурсы. Для гэтага трэба знайсці сілы для першапачатковых задач, каб далей ужо весці дыялогі, разважаць і гэтак далей. Мы пакуль мала што ведаем пра саму супольнасць, у нас фатографы разышліся па нейкіх групах, і няма нават паўнавартаснага сканцэнтраванага інфармацыйнага поля. Банальна, але вось у рэгіёне чалавек нешта зрабіў, прыдумаў — да каго яму звяртацца? Ці ёсць людзі, якія падтрымаюць яго? Часам трэба звярнуцца ў пасольствы, у іншыя інстытуцыі, часта ўзнікаюць пытанні абароны аўтарскіх правоў — зразумела, што калі чалавек не адзін, калі за ім стаіць арганізацыя, усе яны вырашаюцца лягчэй. Можа, нам патрэбны такі вось прафсаюз шырокага спектра?

Дарэчы, у Літве засталося аб'яднанне фотамастакоў, як і ў савецкія гады. А ў Злучаных Штатах іншая практыка — там працуюць вялікія профільныя, тэматычныя асацыяцыі, якія дапамагаюць фатографу хутчэй як прафсаюзы: аказваюць юрыдычную і страхавую падтрымку, ствараюць адукацыйныя праекты і гэтак далей. Таму пакуль я бачу сваю задачу ў стварэнні рабочай мадэлі, дзе ўсё будзе дакладна адладжана. Каб пры зменах старшыні новаму кіраўніку саюза не давялося зноў пачынаць з нуля.

— А гэта ўтопія! У вас жа творчая арганізацыя і грамадская, тут як нідзе, важныя персаналіі. Вам ці вераць, ці не. Вам асабіста.

— Удакладню: сістэма павінна быць наладжана да такой ступені, каб яна працавала пры любым кіраўніку. Ёсць рэсурсы, каманда, людзі. Цяжка, але трэба вырашыць адміністрацыйныя задачы, каб перайсці да творчых.

Гэта праўда, што многае залежыць ад фігуры кіраўніка: за гэтым чалавекам ідуць адны людзі, за тым пойдуць іншыя. Але павінна быць ясна і зразумела, як працаваць. А калі мы гэта зробім, думаю, прапанаваць фатографам розных напрамкаў аб'яднацца ў свае прафесійныя "блокі", каб там яны ўжо вызначалі сваю творчую палітыку. Напрыклад, travel-фатаграфія — не маё захапленне, але яна цалкам творчая і мае папулярнасць. Рэпартажная, дакументальная фатаграфія мне бліжэйшая, тут людзі добра разумеюць адзін аднаго — значыць, маглі б аб'ядноўвацца, рабіць свае праекты. Гэта ўсё ў перспектыве. Падобна да "формы, што ліецца"?

— Вернемся да таго, з чаго мы пачалі: ці не хочаце на час пакінуць грамадскія справы і зрабіць вялікі ўласны праект?

— Вельмі хочацца зрабіць такі праект. Некалькі ідэй недапрацаваныя, частка знятая і пакінутая да пераасэнсавання ці чакае сваіх рэсурсаў. А сёе-тое — у працэсе здымкі. Для мяне гэта важна, і для членаў аб'яднання таксама важна было б разумець, што я за чалавек, і які фатограф. Спадзяюся, людзі ўсё ж такі ведаюць мае перавагі, хоць я імкнуся іх пашырыць, каб нікога не абмяжоўваць сваім густам. Нейкія рэчы я, напэўна, не разумею, але гэта мая праблема. І ёсць планка візуальнай культуры, ніжэй за якую апускацца нельга.

Пры падрыхтоўцы таго ж альбома будзем збіраць рэдактарскую групу, каб не было аднаго погляду. Але, вядома, выніковае меркаванне будзе маё — проста таму, што гэта мая адказнасць. Увогуле, "пачні гаварыць, каб цябе пачулі".

Любоў ГАЎРЫЛЮК, арт-журналіст

Жаночая лабараторыя

Вераніка Фаміна. "Галава ў аблоках".

Алена Толабава. "Хроніка возера".

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

У прэс-рэлізе да праекта сказана, што асноўная ідэя — паказаць жаночы свет вачыма жанчыны з дапамогай лямцу. Для раскрыцця тэмы гэты матэрыял, на маю думку, нават больш пасуе. Дык аб чым думаюць мастачкі? Мастачкі закранаюць тэмы ўзаемаадносін, дзяцінства ды не толькі. Так, у работах Настассі Арайс падсвечаныя "Нябесныя плыні", мяккія "Плыні", "Сэ ля ві" (мелодыя жыцця чырвонага цюльпана), Галіны Блажэўскай пушыстыя "Крылы" і Веранікі Фамінай "Галава ў аблоках" (замест капялюшыка з палямі — воблака) — жаночае — летуценнасць, бесклапотнасць. Лілія Бусарава раскрывае тэму з дапамогай атрыбутаў. У "Цнатлівасці", акрамя лямцавай "постаці" дзяўчынкі, знаходзяцца газавая лямпа, старажытны прас і дзве невялічкія з карычнятымі старонкамі кнігі, якія падказваюць, чым займаецца сціплая незнаёмка. У аснове твора Наталлі Аждэр "Не зышліся характарамі" — драўляны стул, адзін бок які абвівае, быццам вінаградная лаза, мудрагелісты лямцавы ўзор, а на другі, — па-мужчынску прытулілася з таго ж матэрыялу форма. Выстава не нясе нейкую ідэю, яна — рэфлексія. Між тым, хочацца адзначыць высокі тэхнічны ўзровень твораў і вобразнасць.

Аб'ёмныя работы Настасся Арайс і Настасся Глушко падмацавалі фотавыставай "Шапавальства: рамяство будучага", дзе паказана, як мужчыны вырабляюць валёнкі, а таксама іншыя моманты з працоўных будняў. А пасля вырашыла прагледзець кнігу водгукаў, дзе адна спадарыня "адкрыла новы погляд на проста-няпростыя рэчы". Мо такога кшталту выставы і ёсць вяртанне да сябе?..

У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў (пляцоўка на Някрасава, 3) адкрыўся арт-праект "Чысціня і гігіена", кураторам (а таксама і ўдзельнікам) якога выступіла Марта Шматава. Менавіта гэтым разам хочацца пачаць гаворку з афішы праекта (так, ніколі яшчэ не даводзілася мне да такой звяртацца), дзе ідэя "забіла" адразу двух трусаў: паказана разнастайнасць удзельніц пры дапамозе адной з першых асацыяцый ад "Чысціні і гігіены" — 11 розных па форме кавалкаў мыла. Афіша адразу нагадала "Праект стагоддзя (12 з XX)" Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі, дзе 12 скульптурных партрэтаў-вобразаў прадстаўляюць значных асоб — Іосіфа Бродскага, Казіміра Малевіча, Пабла Пікаса, Уладзіміра Маякоўскага ды іншых. Гэтыя 12 асоб выявілі ды сфарміравалі густ і свядомасць грамадства, паўплывалі на творчую дзейнасць у тым ліку і нашых сучаснікаў. Штосьці падобнае прадстаўлена і ў арт-праекце "Чысціня і гігіена", але, канешне, не ў такім маштабным кантэксце.

"Чысціня і гігіена" зусім не пра здаровы лад жыцця. Удзельніцы закранаюць душэўную і духоўную чысціню, каханне (у шырокім сэнсе), экалогію, прыгажосць… У кожным міні-праекце (назавём "Чысціню і гігіену" "праектам у праекце") закладзена не проста ідэя, а штосьці больш маштабнае, выразнае. Так, работы Кацярыны Сумаравай заўсёды нейкім чынам звязаны са стыхіяй вады. Гэтым разам яна з'яднала жывапіс з аб'ектамі — шкляннымі банкамі, у якіх знаходзіцца рознай чысціні вада з розных жа кропак Беларусі. Кацярына дапоўніла візуальны шэраг адпаведным гукам. Адна з наведвальніц, школьніца ці студэнтка, сказала: "Як у кабінеце хіміі!" А мне памяшканне Сумаравай нагадала лабараторыю, дзе гук расслабляе, а вада з Нямігі, Прыпяці, наадварот, засяроджвае на праблемах экалогіі. Такім чынам, мастачка ставіць наведвальніка ў памежны стан.

Тэма экалогіі працягваецца ў экспазіцыі "Хроніка возера" Алены Толабавай. Усю ўвагу прыцягваюць не работы, а чорныя шарыкі, раскіданыя на падлозе. Алена ўзяла за аснову рэальны факт — падзею, якая адбылася ў 2007 годзе ў Лос-Анджэлесе, і ў вобразнай форме "распавяла" пра яе.

Галіна Раманава ў "Лабараторыі" аналізуе памяць мастака. Што ёсць смецце? Спачатку — непрыемныя ўспаміны, якія пасля пэўным чынам адлюстроўваюцца ў работах. Галіна задаецца пытаннем: "Ці ёсць гэтае адлюстраванне асабістых творчых этапаў і самавыяўленне аўтара "адпрацаваным" рабочым матэрыялам?"

Вельмі элегантны шэра-белы жывапіс Ілоны Касабука нагадвае нейкі гарманічны, чысты, некрануты свет, у якім галоўныя героі — маладая жанчына і дзіця. Ілона паказвае схаваную прыгажосць узаемаадносін. Прыгажосць, але зусім іншая — яскравая, індывідуалістычная — у Зоі Луцэвіч. Як бачна, кожная з удзельніц (названы не ўсе) закранае вельмі тонкія пытанні, адказы на якія знайсці даволі складана, але над імі хочацца разважаць і спрачацца.

Юлія Гайдукова. "Ружовы вечар".

Ілона Касабука. "Сон".

Кацярына Сумарава. "Reservuarium".

Нядаўна злавіла сябе на думцы, што класічныя пейзажы ды кветкі ў вазах на выставах надакучылі, і нават была ўпэўнена: грамадству не хапае "драйву", новага, свежага. Але падчас напісання матэрыялу спынілася: мо сутнасць такіх твораў — у адпаведным унутраным стане, "душэўнай канструкцыі", і мастачкі нават не спрабуюць прытрымлівацца новых тэндэнцый, да якіх мы ўжо прывыклі і кожны раз чакаем новай правакацыі ад аўтара (як сабака — ежы ад свайго гаспадара), яны — фіксацыя таго, што бачым кожны дзень і ўжо не звяртаем увагу на жывое ў сабе, не "запэцканае" Сецівам і інфармацыяй. Магчыма, зараз да пейзажаў, нацюрмортаў моладзь ставіцца абыякава, бадай, этап пройдзены яшчэ падчас навучання ў каледжы ды вышэйшай навучальнай установе. Але ўсе не змогуць агулам перайсці на хвалі канцэптуалізму (дзе галоўны складнік — думка, сэнс, што значна цяжэй выразіць), бо якія веянні ні былі б, усё роўна гэты "постпост-" павінен быць закладзены ў творцы, інакш атрымаецца фальш. Звычайныя пейзажы ды нацюрморты, якія напаўняюць музеі асабліва напярэдадні свята, — як "класіка жанра", і гэта не лічу традыцыяй, якую адзін творца пераступае і ідзе далей, а другі — застаецца з ёю, няхай і адчувае сабе ў пэўных межах, а як — "парыў душы", без якога творчая дзейнасць некаторых мастачак будзе, магчыма, непаўнавартаснай.

Адсюль і наступныя пытанні: чаму выставы жанчын-мастачак набываюць шырокі размах менавіта напярэдадні свята? Я пакуль спынілася на наступных. Класічныя нацюрморты ды пейзажы не карыстаюцца папулярнасцю ў грамадстве, таму музеі не змогуць на такога кшталту творах зарабіць. З іншага ж боку, той жа шматгранны арт-праект "Чысціня і гігіена" паказаў: жанчыны — сіла, у якой з'ядналіся пяшчота, прыгажосць, арыгінальнасць ды байцоўскі дух. І, думаецца, быў бы не менш актуальны ў любую іншую пару года.

К

На маю думку…

"Жаночае пытанне" ў экспазіцыі музея

Таццяна НЯКЛЮДАВА,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея

Больш за 30 гадоў таму ў сусветнай музейнай справе адбыліся падзеі, якія даследчыкі назвалі "фемінісцкай інтэрвенцыяй у музей". Зараз гарачыя спрэчкі ў мінулым. Усё зразумела: жанчыне ў музейнай прасторы быць. Але якім чынам?

Гендарная рэпрэзентацыя ў пастаяннай гістарычнай экспазіцыі музея з'яўляецца, магчыма, найбольш складанай задачай. Пры ўключэнні гэтай тэматыкі неабходна пазбягаць абагульненняў, "ідэалізацыі", "выключнасці", памятаць пра неабходнасць паказаць усе сацыяльныя слаі, пры гэтым без адрыву ад "агульнага", у тым ліку "мужчынскага". Важнымі з'яўляюцца і выкарыстаныя сродкі — прадметы і дакументы, экспазіцыйныя і метадалагічныя прыёмы. І ўсё гэта пры неабходнасці раскрыць пэўны гістарычны перыяд па ўсіх напрамках на абмежаванай плошчы! Тым не менш, пры планаванні і пабудове залы "Брэстчына ў 1921 — 1939 гг." гістарычнай экспазіцыі Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея была зроблена спроба адлюстравання "жаночай тэматыкі" ў экспазіцыі.

Міжваенны перыяд — складаны і супярэчлівы час, калі Брэстчына знаходзілася ў складзе Польскай дзяржавы. З аднаго боку, канстытуцыйна былі гарантаваны роўныя правы ўсіх грамадзян, з другога — заставалася шмат дыскрымінацыйных абмежаванняў жанчын. Велізарны працэнт непісьменнасці сярод жанчын Палескага ваяводства (80 %), які паступова змяншаўся дзякуючы пашырэнню адукацыі — але польскай, а не нацыянальнай. Удзел жанчын у грамадскіх арганізацыях, у тым ліку ваенізаванага кірунку, — і амаль поўная адсутнасць жанчын у органах улады ваяводства. Вялікі працэнт занятых у прамысловасці жанчын — і аплата гэтай працы ў 1,5 — 2 разы менш за мужчынскую. Ці не вынік — актыўны ўдзел жанчын у Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, шмат у чым дзякуючы яе рыторыцы адносна "жаночага пытання"?

Такім чынам, асноўнай мэтай пры стварэнні залы стаў паказ грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця Палескага ваяводства і адлюстраванне ўдзелу жанчын у гэтых працэсах. Паспрабуем прааналізаваць, як гэта атрымалася. Напрыклад, тэма дзейнасці шматлікіх грамадскіх аб'яднанняў абыграна амаль выключна праз жаночыя арганізацыі. Таксама праз жаночыя вобразы адлюстравана тэма эміграцыі. Прапарцыйна прадстаўлена традыцыйная жаночая і мужчынская праца ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці, адлюстравана занятасць жанчын у гандлі. Культурнае жыццё раскрываецца праз "бібліятэчны куток", дзе прадстаўлены кніга "Lekarka domowa" і часопісы "Moja przyjacolka" — найбольш папулярны жаночы часопіс міжваеннай Польшчы. У тэме "Адукацыя" з дапамогай табліцы паказаны працэнт непісьменных сярод мужчын і жанчын. Актыўны ўдзел жанчын у Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі прадстаўлены фотаздымкамі Веры Харужай, Рэгіны Каплан, Васілісы Селівонік, Соф'і Панковай і лістоўкай са зваротам да працоўных жанчын.

Калі ацэньваць паспяховасць гендарнай рэпрэзентацыі ў зале, можна з упэўненасцю сказаць пра баланс. Нягледзячы на абмежаванасць фондаў па гэтым перыядзе, перавага заўсёды аддавалася арыгінальным прадметам і фотаздымкам. Удалося адлюстраваць усе сацыяльныя слаі грамадства. Але, дарэчы, цяжка паказаць адсутнасць (напрыклад, адсутнасць жанчын ва ўладзе) — гэтую праблему вырашыць, магчыма, толькі паясняльны тэкст. Напэўна, усё ж прыйшоў час звярнуць увагу на праблемы гендарнай рэпрэзентацыі ў музейнай прасторы, а для паспяховасці яе ўвасаблення — аб'яднаць намаганні музейшчыкаў, гісторыкаў, краязнаўцаў і іншых.

Невядомы Бялыніцкі-Біруля

На ўнікальных кадрах з архіва мастацкай дынастыі Бархатковых

Не так даўно мастак Ігар Бархаткоў выставіў у сацыяльнай сетцы шэраг фотаздымкаў з сямейнага архіва. На здымках — Вітальд Бялыніцкі-Біруля і бацька мастака Антон Бархаткоў, вядомы як вучань гэтага геніяльнага пейзажыста. Усведамляючы каштоўнасць згаданых фрагментаў сямейнай хронікі для гісторыі нацыянальнай культуры, мы звярнуліся да спадара Ігара з просьбай распавесці пра згаданыя здымкі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ



Вітальд Бялыніцкі-Біруля.





Партрэты В.К. Бялыніцкага-Бірулі работы Антона Бархаткова.

Радзіма знакамітай "Вясны..."

У асноўным кадры зроблены ў 1947 годзе ў час знаходжання Бялыніцкага-Бірулі ў Беларусі, куды яго запрасіў Панцеляймон Панамарэнка, тагачасны першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі. Запрасіў на эцюды. Для шаноўнага госця быў створаны максімальна магчымы ва ўмовах разбуранай Беларусі камфорт. У прыватнасці, яму быў прадстаўлены прысталічны асабняк, вядомы як Белая дача, і аўтамабіль з вадзіцелем. Менавіта ў гэты час і быў напісаны вядомы пейзаж "Вясна прыйшла", што зараз захоўваецца ў нашым Нацыянальным мастацкім музеі.

Ёсць мазкі пэндзлем мэтра

Аўтара двух здымкаў з нашага сямейнага альбома, дзе мой бацька побач з Вітальдам Каэтанавічам, я не ведаю. Зроблены яны якраз на эцюдах. Бацька суправаджаў Бялыніцкага-Бірулю. У іх нават эцюды падобныя, бо пісаныя з аднаго месца. Да ўсяго, на некаторых эцюдах бацькі ёсць мазкі, зробленыя мэтрам. Разам з Вітальдам Каэтанавічам прыехала ягоная жонка Алена Аляксееўна, якая таксама штосьці пісала (яна ёсць на адным са здымкаў). Кожны вечар пасля эцюдаў яны збіраліся разам і рабілі "журы", абмяркоўваючы работы, зробленыя за дзень.

Новы абутак

Ёсць і фотакопія аднаго з апошніх лістоў Бялыніцкага-Бірулі майму бацьку. На ім размытыя радкі, бо Вітальд Каэтанавіч плакаў, калі яго пісаў. А пісаў ён, што час, праведзены ў Беларусі, быў лепшым у ягоным жыцці. У часе знаходжання ў Беларусі Бялыніцкі-Біруля, ягоная жонка, мой бацька былі ў гасцях у Якуба Коласа па ягоным запрашэнні. А як ехалі назад, завязлі ў каляіне. Самі разумееце, якія пасля вайны дарогі былі. Дык вось, ім усім разам з шафёрам да Белай дачы па брудзе брысці. Абутак разбілі ўшчэнт. Але раніцай Вітальд Каэтанавіч выправіўся на рынак і ўсім новы абутак набыў.

Выбраў "дарагога земляка"

Мой бацька мусіў суправаджаць Бялыніцкага-Бірулю як памагаты. Той быў ужо немалады чалавек, ці мала што магло здарыцца. Дык вось, бацька быў, так бы мовіць, на падстрахоўцы. Спачатку Вітальду Каэтанавічу вызначылі суправаджаючым маладога расійскага мастака Рамадзіна, але мэтр заявіў, што памочнікам у яго можа быць толькі Анатоль Бархаткоў. Бацьку ён называў "Мой дарагі зямляк Антон". А пазнаёміліся яны ў час вайны ў Маскве.

На эцюдах. Антон Бархаткоў, Вітальд Бялыніцкі-Біруля, ягоная жонка Алена Аляксееўна. 1947 год.

Перад сустрэчай у Траццякоўцы

Перадгісторыя такая. У 1942 — 1943 гады бацька партызаніў. Ваяваў ён ва Украіне. Трапіў у палон, збег з палону і паўгады дабіраўся да Беларусі. Тут далучыўся да партызан. Паколькі ён быў мастаком, дык мог быць стаць летапісцам партызанскага жыцця, але аловак давялося на пэўны час закінуць. Камандзір сказаў яму: ты патрэбны як баец, а не як мастак. А ў 1943 годзе, яшчэ да аперацыі "Баграціён", была вызвалена частка Магілёўшчыны, дзе бацька партызаніў. На яго, як на ўнікальную ў сваім родзе асобу — і партызан, і мастак, — звярнулі ўвагу людзі з Цэнтральнага штаба партызанскага руху. І з гэтага моманту ён у Маскве пры згаданым штабе, і сярод іншых спраў займаецца арганізацыяй мастацкай выставы ў гонар 25-й гадавіны ўтварэння БССР. Яна адбылася ў 1944 годзе, праходзіла ў Траццякоўскай галерэі. Вось тады бацька і пазнаёміўся з Вітальдам Каэтанавічам.

Адзіны вучань

Варта нагадаць, што Бялыніцкі-Біруля вельмі любіў Беларусь. Няма мастака больш беларускага, чым ён. Таксама як і наш Марк Шагал самы яўрэйскі мастак у свеце. Жывапіс Бялыніцкага-Бірулі гэта ўвасабленне беларускай ментальнасці, хоць творчую кар'еру ён зрабіў у Расіі і там пражыў большую частку жыцця. А бацька мала таго, што з Беларусі, дык яшчэ і з роднай Вітальду Каэтанавічу Магілёўшчыны. Мой бацька бываў у маскоўскай майстэрні Бялыніцкага-Бірулі і на ягоным лецішчы Чайка. Антон Бархаткоў — адзіны вучань вялікага майстра. Свой творчы вопыт Вітальд Каэтанавіч спрабаваў перадаваць і іншым, але зручнасці купіў сабе лецішча, якое стала для ягоных сяброў і калег аналагам сучасных дамоў творчасці. "Чайка" вельмі прыдалася яму ў 1930-я. Тут, у глыбінцы, нікому не патрэбны, незапатрабаваны, не здольны і не ахвочы адпавядаць канонам афіцыйнай культуры, ён пераседзеў палітычныя жарсці. Вітальд Каэтанавіч быў шляхціч — ужо адзін гэты факт біяграфіі ў пэўны перыяд мог каштаваць яму жыцця, калі ён быў публічнай асобай.

Заліты слязьмі ліст

Апошні здымак — гэта 1954 год. У тым жа годзе напісаны і прыведзены тут ліст. На пачатку 1950-х мастак захварэў, фактычна страціў зрок. Гэты заліты слязьмі ліст, што пачынаецца зваротам "Дарагі мой зямляк Антон", датаваны тым жа часам. Вітальда Каэтанавіча не стала ў 1957 годзе.



Ліст да Антона Бархаткова.

Замест P.S.

У Белай дачы, якой ніяк не могуць прыдумаць вартага прыстасавання, мог быць быць мемарыяльны музей генія беларускага краявіду. Ён насамрэч тут жыў і працаваў, Але на будынку няма нават мемарыяльнай шыльды. Мяркую, мясцовыя мастакі спачатку баяліся канкурэнцыі з мэтрам і не жадалі бачыць яго ў кантэксце беларускага мастацтва, а потым пра Бялыніцкага-Бірулю паспяхова забылі, аддаўшы яго Расіі. Памылкі, аднак, трэба выпраўляць.

К

Тым часам

Сёння Курасоўшчына перыферыйны раён сталіцы, а калісьці гэта была вёска ў ваколіцах Мінска. Аддаленасць ад цэнтра вызначала драматычныя варункі гісторыі Белай дачы — галоўнай культурнай каштоўнасці Курасоўшчыны. Каб гэты шыкоўны асабняк знаходзіўся паблізу праспекта Незалежнасці, у ім даўно была б амбасада, праўленне якогасьці банка. Мо нават музей. А так сярод грашавітай публікі ахвочых выпраўляцца на ўскраіну не знайшлося. Будынак у розны час належаў розным установам, яго спрабавалі скарыстаць для культурных мэтаў. Але неяк справа не ладзілася, і помнік гісторыі паціху гібеў і разбураўся. Быў момант, калі ўзнікла надзея, што для Белай дачы знайшоўся руплівы гаспадар. Ім мусіў стаць Мемарыяльны музей-майстэрня Заіра Азгура. Меркавалася, што пад эгідай музея-майстэрні сядзіба стане цэнтрам эксперыментальнага мастацтва, які разварушыць на карысць крэатыву жыццё навакольнага спальнага раёна. Але дырэктар музея-майстэрні Аксана Багданава ад самага пачатку гаварыла пра такую перспектыву вельмі асцярожна. Маўляў, будзем радавацца, як справа зробіцца. Атрымалася, як у ваду глядзела…

Летась будынак быў выстаўлены на аўкцыён. З першага разу прадаць Белую дачу не атрымалася. Новы гаспадар з'явіўся толькі з трэцяга заходу. Гэта беларускае прадстаўніцтва расійскай кампаніі, назва якой трымаецца ў сакрэце. Новыя ўладальнікі дэкларавалі намер зрабіць у будынку Белай дачы карцінную галерэю. Бяручы да ўвагі, што сядзіба звязана з імем Бялыніцкага-Бірулі, такое прыстасаванне можна лічыць амаль ідэальным.

Але грамада, навучаная горкім вопытам ператварэння сядзібы Ваньковічаў у Сляпянцы з мемарыяльна-культурнага помніка ў рэстаран, жадае ў справе Белай дачы сапраўднай празрыстасці. На гэтым пакуль паставілі шматкроп'е і дамо абяцанне сачыць за станоўчымі, спадзяемся, пераўтварэннямі.

Кадр ля фантана са Станютай і Макаравай

Выпадкова распаведзеная гісторыя аднаго фотаздымка з легендамі беларускай сцэны — народнымі артысткамі па званні і па прызванні Стэфаніяй Станютай і Галінай Макаравай — адкрыла цікавыя факты іх біяграфій, а таксама кадры з асабістага фотаархіва саліста кіеўскай нацыянальнай аперэты Анатоля Підгарадэцкага. Лёсы ўсіх гэтых творцаў, а таксама іншых зорак з пакалення легендарных купалаўцаў аказаліся паяднанымі самым нечаканым чынам.

Сяргей ТРАФІЛАЎ

1.

Урэшце, так і бывае: знаходзішся ты з чалавекам у "фрэндах" у сацыяльнай сетцы, часам ставіш "лайкі" на яго запісы і фота, раз-пораз ён падабае твае ці са старонкі газеты "Культура" (у нашым канкрэтным выпадку) — і ўсё. Ніякіх спробаў увайсці ў больш шчыльны кантакт, наладзіць стасункі. Напэўна, пакуль нешта не закране, не вымусіць задаць пытанне і чакаць на яго адказу. Такая сітуацыя днямі склалася ў мяне, калі я пабачыў здымак у стужцы навінаў артыста Кіеўскага нацыянальнага акадэмічнага тэатра аперэты Анатоля Підгарадэцкага. На кадры ён сам з чвэрць стагоддзя таму і дзве народныя артысткі СССР — знакамітыя беларускі Стэфанія Станюта і Галіна Макарава. "Было б цікава даведацца пра гісторыю гэтага фота", — адразу напісаў я ў каментарыі да паста. А ўвечары атрымаў адказ, які за пару гадзін перапіскі з Анатолем Мікалаевічам удалося разгарнуць у падрабязны аповед вакол аднаго, лічы, гістарычнага здымка.

Станюта

"Пра фота ўсё проста, — пачаў нашу гутарку Підгарадэцкі. — Зроблена яно ў 1991, увесну, калі я завітаў у Мінск і па справах, і сустрэцца са сваімі даўнімі знаёмымі — акцёрамі-купалаўцамі старэйшага пакалення. Гэтак ужо склалася ў маім жыцці. Да прыкладу, Станюта — мая хросная. Так сама Стэфанія (нягледзячы на значную розніцу ва ўзросце, мы называлі адно аднаго па імёнах: Стэфанія і Толя) казала ўсім. Хаця, вядома ж, гаворка ішла не ў літаральным сэнсе. Скажам, гэтак жа яна называла і акцёра Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Ігара Дзянісава, але яна сапраўды яго хрысціла.

2.

3.

4.

5.

6.



7.

На здымках з архіва героя матэрыяла: 1. Анатоль Підгарадэцкі. 2. Анатоль Підгарадэцкі на тым самым здымку з Галінай Макаравай і Стэфаніяй Станютай. 3. Макарава і Станюта: з поглядам ужо пражытага жыцця. 4. Ці не адзіны здымак Стэфаніі Станюты, дзе яна апранула свае ўзнагароды. 5. Анатоль Підгарадэцкі і Стэфанія Станюта ў Траецкім прадмесці. 6. Партрэт Підгарадэцкага Стэфаніі Міхайлаўна захоўвала дома. 7. Аўтограф Стэфаніі Станюты Анатолю Підгарадэцкаму.

Дарэчы

Марыя Капніст на кадры з фільма "Бронзавая птушка".

Знаёмства Анатоля Мікалаевіча з Марыяй Капніст ускосна звязанае з жахлівым перыядам яе жыцця, калі яна з 1941-га па 1956-ы адбывала тэрмін па абвінавачванні ў "антысавецкай прапагандзе і агітацыі" (далося ў знакі ейнае паходжанне: спадчынная дваранка, графіня, з нашчадкаў украінскага паэта канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя Васіля Капніста і кашавога атамана Запарожскай Сечы Івана Сірко). І першы тэрмін у 8 гадоў папраўча-працоўных лагераў прыпаў на Карлаг — Карагандзінскі лагер. А ў 1967-м у пасёлку Абай Карагандзінскай вобласці нарадзіўся Підгарадэцкі. Наладжаную сувязь з Марыяй Расціславаўнай спадар Анатоль не губляў, дзе б ні працаваў — у Карагандзе ці ў Саратаве, — а пасля смерці Капніст яго дапусцілі да архіваў і асабістай справы актрысы, якая раскрывала перыпетыі яе складанага лёсу.

Дадамо, што шлях да здзяйснення мары пра акцёрскую прафесію ў Марыі Капніст расцягнуўся амаль на тры дзесяцігоддзі — з самага пачатку 1930-х. Але першыя ролі яна атрымала толькі пасля поўнай рэабілітацыі ў 1958 годзе, запомніўшыся гледачам вобразамі характарных персанажаў — графіня, загадкавая старая, вядзьмарка, чарадзейка, цыганка... І некалькі з яе роляў былі ў стужках кінастудыі "Беларусьфільм": "Сыны сыходзяць у бой" (1969) і "Гора баяцца — шчасця не відаць" (1973) Віктара Турава, "Бронзавая птушка" Мікалая Калініна (1974), "Дзікае паляванне караля Стаха" Валерыя Рубінчыка (1979), "Андрэй і злы чарадзей" Генадзя Харлана (1981), "Белыя адзенні" Леаніда Белазаровіча (1992).

Звяла нашы са Станютай лёсы заслужаная артыстка Украіны Марыя Капніст. Я гадоў дзесяць у 1970-х прыязджаў у Мінск, на "Беларусьфільм", на пробы да дзіцячых стужак рэжысёраў Мікалая Калініна, Леаніда Нячаева, Валерыя Рубінчыка. Праўда, паспяхова іх не праходзіў праз праблемы са зрокам. Дык вось, акурат падчас "кастынгу" да "Бронзавай птушкі" Марыя Расціславаўна "здала" мяне, школьніка, у рукі Стэфаніі".

Наогул маленькаму Толю пашанцавала — у час знаходжання ў Мінску таленавітым школьнікам апекаваліся беларускія зоркі першай велічыні: Зінаіда Браварская, Павел Кармунін, Мікалай Яроменка, Галіна Макарава, Стэфанія Станюта. "Але сувязяў з Беларуссю ў мяне даўно няма — гэтых цудоўных людзей і бліскучых артыстаў даўно не стала, — дадае спадар Анатоль і прыгадвае колішняе: — А раней стасункі не губляліся нават у тыя гады, калі мы не бачыліся. Са Стэфаніяй, скажам, паштоўкі да святаў у нас былі традыцыйк. Выпадкова, па сутнасці, але ўдалося захаваць дзясяткі такіх картак, а таксама лістоў. Таму няхай творчага супрацоўніцтва ў нас не склалася (хаця адна з тых дзіцячых кінапробаў і была акурат да фільма са Станютай), было яднанне на побытавым узроўні, амаль роднаснае. Скажам, у іншы свой прыезд, у 1992-м, змог умовіць Стэфанію надзець усе свае ўзнагароды і сфатаграфавацца з імі — ні да, ні пасля такога кадра няма, як зроблены ў яе кватэры на вуліцы Караст-янавай".

— Апошнім разам я гутарыў са Стэфаніяй літаральна за дзень да яе смерці, — прыгадвае спадар Анатоль. — Прычым яна развіталася, адчуваючы хуткі канец. Задыхаючыся, прамовіла: "Толя. Это всё, всё…" Пасля слухаўку ўзяла яе памочніца Ірына, сказала, што рука Стэфаніі ўжо не трымае трубкі. Я тады быў у Кіеве, рыхтаваў прэм'еру, а праз два дні прыйшла паштоўка ад Ніны Рэвінскай, маёй калегі з Беларускай музыкамедыі, з сумнай весткай пра сыход Станюты.

Макарава

У руках Галіны Макаравай на гэтым фота сцэнарый фільма "Той, што выжыў" (па-казахску — "Жансебіль"), які ёй прывёз Анатоль Підгарадэцкі. Выкарыстаў "сувязі" з казахстанскімі кінатворцамі, прапанаваўшы ім на галоўную ролю знакамітую беларуску. Сам ён на здымках стужкі ўлетку 1991-га не прысутнічаў, але ведае, што аказаліся яны для Галіны Кліменцьеўны складанымі і нават драматычнымі. Па-першае, пералёты з Мінска ў Маскву, а пасля ў Алматы і далей — у Ленінагорск (цяпер мае назву Рыддэр), амаль на Алтайскіх гарах. Па-другое, народная артыстка СССР мела атрымліваць асобны ганарар, аднак інфляцыя тых гадоў паўплывала на яго памеры. Нарэшце, на здымках пад яе рукой абрынулася дэкарацыя, перылы на драўлянай лесвіцы, і Галіна Кліменцьеўна ўпала ды зламала руку.

"Мяркую, і гэта паўплывала на яе хуткі сыход, — кажа Анатоль Підгарадэцкі. — Праўда, даведаўся пра ўсё тое я выпадкова, нават не скажу дакладна, ад каго — мо ад дачкі Галіны Кліменцьеўны. Памятаю, з усіх гэтых абставінаў ды з прычыны агульнай неўладкаванасці я выказваў сваю крыўду за Макараву рэжысёру Аягану Шажымбаеву, паколькі менавіта я зацягнуў яе ў той фільм. Дарэчы, лёс склаўся так, што Аяган памёр праз год ва ўзросце 42 гадоў".

Яроменка

Мяркую, пасля гэтага падзагалоўка чытач уважліва яшчэ раз пераглядзеў здымкі на паласе "К" з думкай: "Не, я не мог прапусціць…" Дык вось, шаноўныя, ніхто і нічога не прапусціў. Асоба аўтара фотаздымка з артыстычным трыа падчас размовы са спадаром Анатолем высветлілася ці не мімаходзь, калі ён зазначыў: "Дарэчы, фатограф — Мікалай Мікалаевіч Яроменка". Тут мне заставалася толькі выгукнуць: "Нічога сабе фатограф!" — што я адразу зафіксаваў у перапісцы. Анатоль Мікалаевіч у адказ патлумачыў: "Яроменка рабіў кадр, дзе паміж Станютай і Макаравай я. Сам жа ў кадр — ні-ні! Затое бабулямі камандаваў так, што тыя ледзь не апынуліся ў фантане!" Прыгледзьцеся: сапраўды, месца дзеяння — знакаміты фантан у Аляксандраўскім скверы ля будынка тэатра. За спінамі "дзейных асоб" — пастамент, на якім знаходзіцца скульптура хлопчыка з лебедзем, якія ў кадр не патрапілі.

Напрыканцы

Як бачыце, і ў серыі здымкаў ля тэатра, і ў ліку тых, што былі зроблены дома ў Стэфаніі Станюты, — па некалькі кадраў. Анатоль Підгарадэцкі асабліва вылучыў адно фота з "каляфантанных", зробленае праз пару хвілін пасля здымка ад Яроменкі: "Там Галіна Макарава і Стэфанія Станюта ўдваіх з нейкім поглядам ужо пражытага жыцця".

Вось такая гісторыя з аднаго выкладзенага ў сеціва фота. Усё настолькі проста, а нібыта цэлае жыццё разгарнулася… Жыцці! Лёсы!

К

Экспрэс-тур з V.I.P.-земляком: Косава

Сяргей Суцько каля Косаўскага замка. / Фота Алега КЛІМАВА

Паездка ў Косава: амаль без замка і Касцюшкі

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Цудоўныя справы твае...

Тэму "балбеса", пазначыўшы яе ў больш мяккай форме, я папрасіў развіць дырэктара Дзіцячай школы мастацтваў Святлану Фядосік. Высветлілася, што, па ўспамінах настаўнікаў, Суцько ярка выяўленай адоранасцю не бліскаў, талент яго быў прыхаваным, але тое, з чаго можа вырасці нешта, у ім адзначалі.

— Здавалася, ён быў з хлопцаў звычайных, — кажа Святлана Мікалаеўна, — з тых, хто проста вучыўся сабе і вучыўся, не прэтэндуючы на большае, як бы неахвотна, і вось — глядзі ты...

— Ацэнкі ў яго былі сярэднія, — далучаецца да размовы загвуч Ірына Іванова. — А ў кансерваторыю з нашых вучняў паступілі і закончылі яе толькі два чалавекі, адзін з якіх — Сяргей.

Чагосьці абсалютна яркага не бачаць дырэктар з загвучам у сваёй установе і цяпер, але поспехі на міжнародных конкурсах прыходзяць да яе выхаванцаў рэгулярна, як гэта адбылося зусім нядаўна, калі ў Польшчы сталі лаўрэатамі інструментальны калектыў ды саліст-гітарыст. Можа, і ў дадзеным выпадку са спачатку невідавочнага пад чулым кіраўніцтвам педагогаў ужо нараджаюцца будучыя знакамітасці?

За без малога паўстагоддзя існавання ўстановы падрыхтавана 445 выпускнікоў, у музычнай прафесіі з іх засталося 35... Сёння ў ёй і трох яе класах у сельскай мясцовасці 23 выкладчыкі навучаюць 145 чалавек (месяц заняткаў, напрыклад, на фартэпіянным аддзяленні каштуе 13 рублёў 80 капеек). Дзяцей, якія жадаюць атрымаць пачатковую музычную адукацыю, шмат, але павялічыць колькасць навучэнцаў магчымасці няма. Тым не менш, абставіны прыпіраюць...

— З-за таго, што, згодна з планам платных паслуг, у гэтым навучальным годзе ўстанова павінна зарабіць (канцэртамі, пракатам інструментаў, прадастаўленнем нотнай літаратуры) амаль удвая больш у параўнанні з годам мінулым, мы ўшчыльную задумаліся аб стварэнні пры ёй платнай школы ранняга развіцця, — дзеліцца Святлана Мікалаеўна. — Цікава жывем — выконваем яшчэ план па зборы другаснай сыравіны (макулатуры, пластыкавых ёмістасцяў...): кожны настаўнік павінен здаць яе за год 45 кілаграм. І нас яшчэ "прашчупваюць" на прадмет таго, каб ДШМ цалкам перайшла на самаакупнасць...

Некалькі гадоў таму выконваць ды перавыконваць дапамагалі выступленні творчых калектываў ДШМ у населеных пунктах, якія знаходзяцца побач з горадам. Сёння "лішніх" грошай у іх жыхароў няма. Паездкі гэтыя не спыніліся, але фінансавую аддачу паступова замяняюць маральнае задавальненне ды піяр...

Галоўная "кватэра" займае трынаццаць кабінетаў першага з трох паверхаў сярэдняй школы. (Цікава, што першапачаткова пад ДШМ "замахнуліся" аддаць увесь будынак, улічваючы дзятву з бліжэйшых вёсак...) Пакоі кампактныя, утульныя, вось толькі амаль ва ўсіх сцены ды столевыя стыкі ў расколінах — падмурак з-за спецыфікі глебы асядае, і незразумела што з гэтым рабіць: па розуме, будынак трэба зносіць наогул, а ўстановы перабазаваць у іншыя памяшканні, але, хутчэй за ўсё, абыдуцца рамонтам ды агульным умацаваннем аснавання.

А парк інструментаў, якія патрабуюць сталага рамонту (майстар, які бярэ за свае паслугі няслаба, прыязджае раз на год), у ДШМ умацавалі ў 2014-м новымі, калі былі набытыя два баяны, акардэон, ударная ўстаноўка, дзве электрагітары, клавішныя, а ў 2016 годзе набытыя калонкі.

...Развітваючыся, "бакі" дамовіліся аб будучым супрацоўніцтве. Якім яно выйдзе — у выглядзе ці майстар-класаў, ці канцэртаў — пакажа час. Сяргей Аляксеевіч, скажам, гатовы пахадайнічаць перад кіраўніцтвам свайго тэатра, каб ён прыняў арганізаваны выезд навучэнцаў ДШМ на адну з пастановак, можа, і кошт квіткоў для такога выпадку быў бы льготны (не выключана, што гэта будзе аперэта "Містэр Ікс", дзе ён іграе галоўную мужчынскую ролю, або рок-опера "Юнона" і "Авось" (граф Разанаў)...

Дзе культуры больш

Гарадскі дом культуры некалі пераехаў у будынак былога кінатэатра, займеўшы дадатковую прыбудову. Фільмы тут не дэманструюць — як сцвярджаецца, няма глядацкага попыту (толькі часам наведваецца перасоўка). З тых калектываў ды аб'яднанняў, што функцыянуюць у установе, дырэктар Людміла Малчановіч асоба вылучае "Косаўскую скарбніцу", яе народных умельцаў, якія працуюць з пацеркамі, вышыўкай, саломкай... Дуэт з гуртка "Ліра" толькі што стаў лаўрэатам на фестывалі "Суквецце культур", які прайшоў у Івацэвічах. У рэпертуары лялечнага тэатра ёсць тры спектаклі. Людзі ва ўзросце спяваюць у хоры ветэранаў "Спатканне". Усяго ў ГДК займаецца каля 150 чалавек ("руляць" імі чацвёра — дырэктар, рэжысёр, хормайстар ды мастацкі кіраўнік).

Як установы культуры ў горадзе на дзве тысячы жыхароў зарабляюць

Святлана Фядосік.

Ірына Іванова.

На сцэне Гарадскога дома культуры.

— Праўда, моладзі не так шмат, — паведамляе Людміла Уладзіміраўна. — Але гэта характэрна для нашага часу, калі такія ўстановы як наша, у асноўным, наведваюць дзеці і людзі сярэдняга ды старэйшага пакаленняў.

У старым будынку дома культуры Сяргей Суцько зрэдку выступаў на канцэртах мясцовай мастацкай самадзейнасці — як навучэнец музычнай школы: "раздзіраў" баян ды вырабляў танцавальныя па. І, натуральна, дыскатэка. "Выпляскваюць" тут дзяўчаты ды юнакі і сёння, але з прычыны таго, што тыя, каму не споўнілася васямнаццаць гадоў, могуць працягваць "шалець" пад мелодыі і рытмы нашай і нянашай эстрады пасля 22-й толькі пры наяўнасці ў зале ўласных бацькоў, мерапрыемствы гэтыя сыходзяць на нішто. Такое становішча, вядома, адбіваецца на выкананні плана платных паслуг, наогул на заробку ўстановы. (Дапусцім, патрэбны мікрафон коштам у 150 у.а. — занадта вялікая раскоша, каб яго купіць. А студыя гуказапісу была пабудавана сіламі саміх работнікаў ГДК, фінансы на забеспячэнне яе апаратурай таксама "спяваюць рамансы".) Пазабюджэт акрамя даходаў з культурна-масавых мерапрыемстваў прырастае сродкамі, атрыманымі, да прыкладу, ад арганізацыі і правядзення вясельных урачыстасцяў, у тым ліку на выездзе. Некалькі з імпрэз вяліся на беларускай мове.

— Аднак праграмы, заснаваныя на беларускіх традыцыях, абрадах, мы не рыхтуем, — тлумачыць дырэктар. — Спрабавалі, але яны, што называецца, "не пайшлі". Звязана гэта з асаблівасцю нацыянальнага складу ваколіц, у якіх пераважаюць іншыя народнасці. Брэндам Косава, на мой погляд, сёння можа быць толькі ўсё, што звязана з Тадэвушам Касцюшкам і замкам. Але заўтра, я спадзяюся, беларускасць заваюе належнае ёй месца ў культуры Косаўшчыны.

Сяргей Аляксеевіч прапанаваў свае паслугі ў плане такі заваёвы: выступ вакальнага гурта "Арнамент", у якім ён заняты акрамя службы ў тэатры, з адпаведным "меню". Людміла Уладзіміраўна абяцала падумаць...

— Я люблю нямінскую публіку, — прызнаецца спадар Суцько. — Нераспешчаная, максімальна шчырая, якая вельмі эмацыйна, нават неяк па-дзіцячы перажывае ўсё тое, што адбываецца на сцэне. Абавязкова чакае таго моманту, пакуль заслона за артыстамі не зачыніцца канчаткова, і толькі пасля гэтага пакідае залу. А ў Мінску акцёры яшчэ толькі выходзяць на фінальныя паклоны, як людзі ўжо натоўпам пачынаюць бегчы з залы…

Не вельмі высокай думкі Сяргей Аляксеевіч і пра сучасную беларускую музычную культуру. У першую чаргу развіваць яе павінны, мяркуе ён, не нейкія праекты, падзеі, напрамкі, а асобы, якія, як гэта бачыць Суцько, з краіны з'язджаюць, адчуваючы сябе ў ёй запатрабаванымі не ў тых маштабах, на якія яны здольныя (і ўносяць сваё майстэрства ў творчую скарбонку іншых дзяржаў, узбагачаючы яе). "Маё адчуванне такое: пазбаўляючыся людзей неардынарных, сумна ў Беларусі працякае музычнае жыццё..."

А ў Косава — перыядычна весела і гучна, калі ГДК, прапісаны на вуліцы Ціхай, падчас розных святаў транслюе на ўвесь горад музыку. "Я ў добрым сэнсе здзіўлены таму, што, аказваецца, з культурным жыццём на маёй радзіме ўсё ідзе больш-менш нармальна, — вынікае рэзюмэ ад Сяргея Суцько. — Думаў, што ўсе хоць колькі-небудзь крэатыўныя людзі адсюль з'ехалі. Але ж не: тыя, што засталіся, лічаць сваім абавязкам рабіць нешта карыснае для горада і яго жыхароў. І ў іх гэта атрымліваецца. Я шчаслівы!"

І пра актуальнае

...У нейкага з перакрыжаванняў на шляху да Косаўскага замка сядзелі два цалкам чароўныя беспародныя далікатныя сабачкі-жабракі, што, мабыць, рэгулярна выходзяць да дарогі за халяўнай ежай. У горадзе і прылеглых да яго тэрыторыях гэтыя жывёлы і коткі сустракаліся нам ледзь не часцей, чым людзі (адзін такі ўкормлены вусаты-паласаты зладзіў цэлае цыркавое прадстаўленне перад Сяргеем Аляксеевічам ля ганка Мемарыяльнага музея-сядзібы Тадэвуша Касцюшкі). Дарэчы, аб замку. Не ўсё так відавочна ў сітуацыі з яго рэстаўрацыяй, як пра тое было нядаўна агучана ў Брэсце на пасяджэнні абласных вярхоў. Прынамсі, нядрэнна дасведчаны інфарматар на ўмовах ананімнасці распавёў аб сваёй няўпэўненасці ў тым, што ў гэтым годзе частка Косаўскага замка будзе адкрыта для наведвальнікаў. Маўляў, унутраныя рэстаўрацыйныя працы сапраўды амаль завершаны, а да заканчэння вонкавых яшчэ далекавата. Хоць "запускаць у строй" замак плануецца насамрэч паэтапна. Ну а пакуль у дзень нашага знаходжання ў Косава на шчыце пашпарта аб'екта дата тэрміну яго здачы не была паказаная...

К

Шаноўныя чытачы, не падумайце, што я вас вучу. Я сам вучуся ў дасведчаных людзей і атрымліваю ад гэтага творчае задавальненне. Ім і хачу з вамі падзяліцца. Як падаецца, рубрыка "Лабараторыя" дае цудоўную магчымасць разважаць, аналізаваць і прагназаваць вынік уласных намаганняў. Тэарэтычныя даследаванні — першы крок да практычных эксперыментаў. Так што далучайцеся да думання, якое непазбежна прывядзе да "дзелання".

Яўген РАГІН

Падзеі — розныя...

Што такое event-індустрыя? Падавалася б, адказ — на паверхні. Паколькі "event" з англійскай мовы — гэта падзея, дык гаворка пра тэхналогію арганізацыі нешараговай падзеі, нешараговага мерапрыемства. Нешараговага, значыць, яркага ды запамінальнага. Інакш кажучы, гэтым займаюцца ўсе лепшыя нашы ўстановы культуры. Так? "Не зусім!" — паправілі мяне выкладчыкі кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алена Макарава, Святлана Майсейчук, Дзмітрый Матуйза і Віталь Монцік. Аказваецца, event-індустрыя з'явілася ў нас адносна нядаўна, тады, калі прадпрыемствы і арганізацыі сталі задумвацца пра свой пазітыўны імідж — як сярод уласных супрацоўнікаў, так і ў свядомасці навакольнага свету. Атрымліваецца, гаворка пра карпаратыўныя мерапрыемствы? Так. Але не пра тыя, пасля якіх усім сорамна.

Алена Макарава падкрэслівае, што такія мерапрыемствы (ток-шоу, канферэнцыі, экскурсіі, выставы-кірмашы і гэтак далей) ладзяцца для рэкламы (піяру), умацавання прэстыжу прадпрыемства, больш выгоднай прэзентацыі ў соцыуме яго прадукцыі ці паслуг.

Event-мерапрыемствы заўсёды арганізуюцца ў адпаведнасці з карпаратыўнымі патрэбамі арганізацый і прадпрыемстваў. Кожнае такое мерапрыемства мае на мэце фарміраванне пазітыўнага іміджу арганізацый і прадпрыемстваў, а таксама прасоўванне тавараў або розных паслуг, якія яны прапануюць.

Попыт на такія мерапрыемствы — велізарны. Прынамсі, у буйных гарадах. Але сёння сям-там event-агенцтвы ўзнікаюць і ў раённых цэнтрах. Пакрысе ўцягваюцца ў працэс і работнікі культуры, бо тэхналогіі тут — вельмі падобныя да клубнай дзейнасці. Аднак, удакладнім яшчэ раз, гаворка не пра клубныя мерапрыемствы ды самыя розныя прафесійныя святы, калі пасля ўрачыстага сходу адбываецца канцэрт, няхай сабе і шыкоўны па рэпертуары і рэжысуры. Гаворка пра цэлы комплекс захадаў, у выніку якіх умацоўваецца сацыяльна-псіхалагічная атмасфера ў калектыве, падвышаецца гонар за сваю дзейнасць, за кошт інтэрактыву вышукваюцца нефармальныя лідары (пры гэтым вырашаюцца кадравыя пытанні), нармалізуюцца стасункі паміж людзьмі... У выніку — паляпшаецца эканамічная сітуацыя.

Я доўга шукаў у памяці прыклады такой дзейнасці сярод нашых РДК, ГК, СДК і СК. Не знайшоў. Згадалася, бадай, адзінае: з дзясятак гадоў таму пісаў пра выдавецкую дзейнасць Асіповіцкай бібліятэчнай сістэмы, калі ўстановы вывучалі гісторыю мясцовых арганізацый ды прадпрыемстваў, лёс іх работнікаў і рабілі вялікія карпаратыўныя альбомы, рэалізацыя якіх прыносіла гарантаваныя пазабюджэтныя сродкі. Затое іншых прыкладаў у памяці — мора. Яны ў асноўным такія: насупраць раённага дома культуры — рэстаран, які пастаянна перацягвае ўсю публіку да сябе. Канкурэнтаздольнасць першай установы — нулявая.

Што атрымліваецца? Работнікі культуры выкарыстоўваюць далёка не ўсе рэзервы пазабюджэтнай дзейнасці. Алена Макарава сцвярджае: не варта чакаць, калі з арганізацыі ці з прадпрыемства прыйдуць у клуб і прапануюць наладзіць карпаратыўнае мерапрыемства. Трэба самім ісці і прапаноўваць. Скажам, аграфірме — 50 гадоў. Падзея? Безумоўна! Значыць мясцовыя работнікі культуры павінны загадзя паклапаціцца пра стварэнне аргументаванай канцэпцыі будучага мерапрыемства. Толькі пры яе наяўнасці можна пераканаць кіраўніцтва прадпрыемства і арганізацыі ў неабходнасці будучай акцыі. Дык якімі павінны быць складнікі будучай канцэпцыі? Па меркаванні спецыялістаў, трэба шырока адлюстраваць значымасць вытворчасці, зрабіць усе рэкламныя захады па павышэнні рэпутацыі фірмы і яе прадукцыі.

Алена Макарава падкрэслівае, што event-мерапрыемствы могуць ажыццяўляцца ў форме святаў, канцэртаў, конкурсаў, прэзентацый, выстаў, ток-шоу, экскурсій, спартыўных і гульнявых праграм, сімпозіумаў, канферэнцый, семінараў і гэтак далей. Разам з тым, event-менеджмент павінен вырашаць задачы рэкламавання арганізацый і прадпрыемстваў, стымулявання іх развіцця, павышэння карпаратыўнай культуры. Галоўнае, што event-мерапрыемствы пераўтвараюцца ў значныя падзеі, у свята, якія маюць як сацыяльныя, так і эканамічныя мэты.

Блок мерапрыемстваў павінен прысвячацца кіраўніцтву і супрацоўнікам прадпрыемства і іх сем'ям (маўляў, рэпутацыя фірмы — справа кожнага). Дакладна варта прапісаць удзел партнёраў і журналістаў. Не трэба забывацца: блок забаўляльны дапаможа вырашыць многія пытанні сацыяльна-псіхалагічнага плана (выяўленне актыўных, таленавітых, камунікабельных супрацоўнікаў паспрыяе іх кар'ернаму росту), інакш кажучы, нефармальнага лідара event-дзеі кіраўніцтва не можа не заўважыць. Віталь Монцік дадае: "І не забывайцеся на тое, што канчатковы вынік такога мерапрыемства — заўжды эканамічны (інвеставанне ў будучыню, так бы мовіць). Калектыў, прасякнуты духам карпаратыўнай еднасці, пачынае працаваць з большай аддачай".

Канешне, работнікам культуры канкурыраваць з event-агенцтвамі надзвычай цяжка. Кажуць, ганарар толькі за складанне сцэнарыя спецыяльнага мерапрыемства дасягае па буйных гарадах тысячы долараў. У раённых цэнтрах, тым больш на сяле, прадпрыемствы ці арганізацыі з такімі магчымасцямі — вялікая рэдкасць. Але гэта не азначае, што работнікі культуры павінны працаваць, як і раней, — па званку. Сітуацыю неабходна прагназаваць і загадзя прапаноўваць свае паслугі. У адваротным выпадку іх прапануюць іншыя.

Так, сцэнарый такога падзейнага мерапрыемства не "злепіш" за адзін вечар, не дапаможа і бяздумны плагіят: для кожнага новага выпадку патрэбны абсалютна новы сцэнарый. Такое падзейнае мерапрыемства — з'ява вельмі сучасная і актуальная, таму любы фальш тут — справе не на карысць.

Алена Макарава, Святлана Майсейчук, Дзмітрый Матуйза і Віталь Монцік перакананы, што ўстановы культуры яшчэ недастаткова займаюцца піярам (і сваёй дзейнасці, і чужой), не могуць правільна пазіцыянаваць сябе і свой станоўчы вопыт работы з насельніцтвам, і як вынік — зарабляць дывідэнды на зробленым. Івэнт і клубная дзейнасць існуюць пакуль паралельна. І гэта кепска.

Дык што рабіць работніку культуры? Святлана Майсейчук падказвае: "Прагугліць" грамадскую арганізацыю "Клуб беларускіх івэнтараў" (створаны ў 2013 годзе). Любы ахвотны можа стаць яго сябрам і атрымаць бясплатныя майстар-класы. А Дзмітрый Матульза дадае, што заказчыку паслугі ўсё роўна, хто яе выканае, бо галоўны крытэрый — якасць мерапрыемства. Так што работнік культуры можа і павінен канкурыраваць з прадстаўнікамі event-бізнесу. Апошні пакуль перамагае.

Работнікі культуры павінны і могуць авалодаць тэхналогіямі event-менеджменту як своеасаблівай праграмай кіравання маркетынгавым праектам; бо event-менеджмент — гэта дзейнасць спецыялістаў, накіраваная на дасягненне пэўных мэт рэалізацыі сацыяльна значнай падзеі шляхам рацыянальнага выкарыстоўвання творчых, інфармацыйных і эканамічных і іншых рэсурсаў.

Я дапісваю гэтыя радкі і выпраўляюся ў наш чарговы з Кастусём Антановічам аўтатур. Цікава будзе супаставіць тэарэтычныя напрацоўкі "Лабараторыі" па выкарыстанні самых розных тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці з тым, што адбываецца ў нашых установах культуры насамрэч. Чарговыя публікацыі паводле журналісцкага аўтатура (як і працяг матэрыялаў пад рубрыкай "Лабараторыя") чытайце ў наступных нумарах "К".

К

Бібліятэка "Лабараторыі"

Пра свой соцыум

Працягваем знаёміцца з "Тэхналогіямі культурна-дасугавай дзейнасці". Аўтарамі дапаможніка для работнікаў культуры з'яўляюцца выкладчыкі кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУКіМ Алена Макарава, Святлана Майсейчук і Ірына Смарговіч.

Яўген РАГІН

Рэальную і патэнцыйную аўдыторыю ўстаноў культурна-дасугавай сферы звычайна дзеляць на наступныя ўзроставыя групы: дзеці, падлеткі, моладзь, людзі сярэдняга веку, сталыя людзі; асобна вылучаюць сям'ю як аб'ект уплыву.

Апрача ўзросту, сямейнага становішча і сацыяльнага статусу існуюць іншыя крытэрыі, якія дазваляюць сегментаваць дасугавы сэрвіс, у найбольшай ступені ўлічваючы асаблівасці запытаў.

Дыферэнцаваны падыход рэалізуецца і з улікам гендарных прыкмет. Часцяком інтарэсы мужчын і жанчын у культурна-дасугавай сферы розняцца. Для жанчын ствараюцца адпаведныя клубы, спартыўна-аздараўленчыя групы гімнастыкі, усходняй медыцыны, гурткі ўсходняга танца, курсы кройкі і шыцця, вядзення хатняй гаспадаркі. Мужчыны наведваюць клубы аўтааматараў, паляўнічых і рыбаловаў, спартыўных заўзятараў; яны ствараюць байкерскія клубы і іншыя.

Важным фактарам з'яўляецца таксама ўлік месца пражывання. Перавагі жыхароў горада і сяла заўважна адрозніваюцца і ў сілу традыцый, і праз наяўнасць інфраструктуры. Вясковы клуб ці бібліятэка часта з'яўляюцца адзіным цэнтрам культуры.

Дзіцячы ўзрост — да 11-12 гадоў. Ствараючы ўмовы для развіцця асобы і маючы гуманістычную скіраванасць, культурна-дасугавая дзейнасць дазваляе задаволіць патрэбу дзіцяці ў творчай рэалізацыі. Такі дасуг важны для зняцця эмацыйнага напружання, гарманізацыі псіхалагічнага стану.

Культурна-дасугавая дзейнасць садзейнічае выхаду са стрэсаў і дробных непакойстваў, а таксама прызнаецца значным арттэрапеўтычным сродкам у папярэджанні разумовай адсталасці і рэабілітацыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

К

Працяг — **у наступных нумарах "К".**

З "Куфра-радцы"

Прэзентацыя страў беларускай кухні

(з вопыту дзейнасці народнага жаночага клуба "Залаты ўзрост" Мазалаўскага сельскага дома культуры Віцебскага раёна)

Першы варыянт

Гучыць прывітальная песня.

1-я жанчына:
А ў нас сёння свята!
І народу тут багата.
Вас вітае ў поўны рост
Мазалаўскі "Залаты
ўзрост"!

2-я жанчына:
Мы прысмакаў нарабілі —
Усіх будзем частаваць!
А што каму паспрабаваць,
Прапануем выбіраць.

3-я жанчына:
Спяклі слаёны наш пірог,
Каб адведаць кожны змог.

1-я жанчына:
Рагалік — сёння
брэнд у нас,
А прыпудрылі для вас.

2-я жанчына:
А налівачка з каліны
Вельмі прыбаўляе сілы!

3-я жанчына:
Паглядзіце, калі ласка,
Піражкі, як тая казка,
Булачкі і пернікі,
Ласункам ўсім сапернікі.

1-я жанчына:
То не простыя бліны
З начынкай рознаю яны!
Блінчыкі пшанічныя —
Свае, не заграніччныя.

2-я жанчына:
З блінамі верашчаку
прапануем,
Бо мы ўсіх любім
і шануем!

1-я жанчына:
У кожнай хаце беларус
Бульбу ставіць на абрус.
Бульба ёсць —
не быць бядзе.

Усе:
З ёй беларус
не прападзе!

Гучыць беларуская народная песня "Бульбачка".

Другі варыянт

(прэзентацыя падчас абласнога свята аматарскіх аб'яднанняў "Яблычны фэст")

Гучаць беларускія найгрышы, удзельніцы чытаюць вершы.

1. Мы прыехалі ў Алашкі
Святкаваць Яблычны Спас.
Па спіне бягуць мурашкі,
Як тут хораша ў вас.
2. На Радзіме ў Сікоры
Гуляць будзем да ўпору.
Будуць песні, будзе смех
Будзе жартаў поўны мех.
3. Мы прысмакаў нарабілі,
Будзем зараз частаваць.
А што каму паспрабаваць,
Прапануем выбіраць.

Падыходзіць гаспадыня да гасцей з падносам, на якім знаходзяцца каляровыя надпісы з назвай прысмакаў.

1. Пірог "Тры накаты"
Пірог слаёны
ў тры накаты,
Частуем ім толькі
на свята!

2. Бліны з начынкай
То не простыя бліны,
З начынкай
яблычнай яны.

3. Яблыкі на мёдзе
Тут і яблыкі на мёдзе —
Дэлікатэсы ў гэтым годзе.

4. Аладкі
І аладкі ім пад стаць,
Іх мы просім паспытаць.

5. Спасаўскі яблык
Яблык еш замест яды —
Не захварэеш ты тады!

6. Рагалікі
Рагалік — брэнд
сягоння ў нас!
Пячэм яго
на Святы Спас!

Гучаць беларускія найгрышы, адбываецца прэзентацыя нарыхтовак.

1. А вось і наша
нарыхтоўка,
Зімаваць з ёй
будзе лоўка.
Зімою трэба мець павідла,
Каб холад, сцюжа
не абрыдлі.
2. Вось тут і з яблыкаў
варэнне —
Для душы заспакаенне.
3. Калі будзеш піць кампот,
Не будзе тоўстым
твой жывот.
4. Асалоду ты адчуеш,
Калі яблык паспрабуеш.
5. Як паспрабуеш
мармелад,
Адразу ўсё ідзе на лад.
6. З вітамінамі сокі
Ужывай, пакуль
не выйдуць срокі!
7. Не будзем мы
зімы чакаць,
А будзем сёння
спрабаваць!

Трэці варыянт

(прэзентацыя падчас фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі Віцебскай вобласці "Дажынкі-2016")

1-шы вядучы:
У Талочыне "Дажынкі"
Услаўляюць працы плён.
І не ў чым не уступае
І наш Віцебскі раён!

2-гі вядучы:
Усіх сардэчна мы вітаем!
Да стала к нам запрашаем.

3-ці вядучы:
Не трэба вам ісці далёка,
Частуйцеся ў нас,
на што кладзецца вока!

1-шы вядучы:
Паспрабуйце вы наш квас
Вельмі смачны ён у нас!

2-гі вядучы:
Верашчаку прапануем,
Усіх мы любім і шануем!

3-ці вядучы:
Верашчака — гэта брэнд,
Смачней нічога
ў свеце нет!

1-шы вядучы:
А выпечка ў нас якая —
З мучыцы новага
ўраджаю!

2-гі вядучы:
Прысмакі нашы
паспытайце,
І добрых слоў нам
пажадайце!

Аўтары — кіраўнік клуба Ірына ТОЛКАЧ і ўдзельніца клуба Таццяна КАСТЭНКА

З "Куфра-радцы"

Гімн работнікаў культуры

Словы Алега Князева і Мар'яна Зелянкевіча
Музыка Мар'яна Зелянкевіча



1. Вздохнула струна в тишине,
Рассыпалась вдруг и погасла.
И звуки напомнили мне,
Что все мы хранители
счастья.
Хранить это значит сберечь,
Нести осторожно и нежно.
Тот свет, чтобы в душах зажечь
Огонь доброты и надежды.
Припев:
Если зал рукоплещет стоя
И от браво трепещут
струны —
Это значит, что мы достойны
Быть работниками
культуры.
2. Чтобы праздник
расцвел, словно сад,
И светились в улыбках лица,
Наш работник культуры рад
Теплотою сердец поделиться.
И живут на земле чудаки:
Музыканты, певцы и диджеи.
С их талантливой
легкой руки
Оживают искусства идеи.
Припев
3. Пускай в нашей
жизни порой
Бывает не всё очень гладко,
Зажги в своем сердце огонь
И залу отдай без остатка.
Где рампы горит яркий свет,
Где сцена опять же
проснулась…
Вздохнула струна в тишине
И песнею вновь обернулась.
Припев

Ад рэдакцыі. *Публікацыя нот і тэкста гэтай песні — хутчэй, выключэнне з правіла, паколькі наша натуральная першасная ўвага надаецца песенным творам на беларускай мове. Аднак у гэтым выпадку нам падалася цікавай сама ідэя спробы стварэння гімна работнікаў культуры. Нагадаем, у рэдакцыі "К" у свой час таксама быў рэалізаваны такі праект у супрацоўніцтве з кампазітарам, народным артыстам Беларусі, народным артыстам СССР, старшынёй Беларускага саюза кампазітараў Ігарам Лучанком і паэтам Віктарам Шніпам да аднаго з Дзён работнікаў культуры.*

Рэабілітолаг усміхаецца

Пра Таццяну Падкапаеву, культарганізатара Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя Пятра Машэрава "К" даведалася праз водгукі пацыентаў гэтай унікальнай медыцынскай установы. Сёння распавядзем пра спецыфіку працы культработніка ў нетыповых для культурнай дзейнасці ўмовах.

Аліна САЎЧАНКА

Шпіталю летась споўнілася 70 гадоў. З 1972 года ён, па даручэнні Пятра Машэрава, быў пераведзены ў новыя карпусы ў гарпасёлку Бараўляны. Прыблізна з тых часоў у сцянах бальніцы завіравала і самадзейнасць. А Таццяна Падкапаева на пасадзе з 2006 года. Па ейным прызнанні, прыйшла на ўжо сфармаваную творчую глебу.

Ці патрэбны культарганізатар?

Шпіталь мае статус бальніцы прафілактычна-рэабілітацыйнага плана, куды прыязджаюць людзі з усёй краіны на 14 — 16 дзён. Разам з тым, параўнаць установу з шараговым санаторыем нельга — узровень медыцынскіх паслуг вельмі высокі. Лячэнне аказваюць не толькі ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны (гэтых людзей засталося, на жаль, мала), а і воінам-інтэрнацыяналістам, ліквідатарам аварыі на Чарнобыльскай АЭС, колішнім малалетнім вязням канцлагераў, ветэранам працы. Дарэчы, зараз актыўна ідзе рэарганізацыя шпіталя, у ходзе якой у адным з карпусоў адкрыецца аддзяленне актыўнага даўгалецця — ён жа цэнтр геранталогіі — і кафедра пры ім. Хутчэй за ўсё там будуць запатрабаваныя сацыяльныя работнікі і работнікі культуры. Пакуль жа Таццяна Міхайлаўна працуе адна на ўсіх. Але вышэйназваны кантынгент, пацыенты, — не адзіная аўдыторыя для Падкапаевай, бо ўвагу яна надае і самім работнікам шпіталя. У тым ліку дзякуючы намаганням культурнага работніка шпіталь можа ганарыцца калектывам. Што цікава, іншыя медыцынскія ўстановы краіны выкарыстанне культуры дзеля кансалідацыі не практыкуюць.

Як пабудавана работа?

За подпісам галоўнага ўрача, а сёння гэта Віктар Лішакоў, зацвярджаецца план на год. Там і дзень народзінаў шпіталя, Дзень блакадніка, Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, Дзень медработніка, Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці... Для пацыентаў штотыднёва праводзіцца два-тры мерапрыемствы. Гэта можа быць канцэрт, сустрэча, вечар паэзіі, вусны часопіс, штотыдзень паказваюць кіно. Усё гэта адбываецца ў актавай зале пасля 14-й. Таццяна Міхайлаўна называе сваіх гледачоў удзельнікамі хутчэй пасіўнага плану: калі падпяваць яны могуць з радасцю, дык танцы ім ужо супрацьпаказальныя.

З галоўнай задачай Таццяна Падкапаева спраўляецца самастойна, тым больш ветэраны самі прапаноўваюць свае таленты, прыходзячы па ўласнай ініцыятыве. "Людзі выходзяць на пенсію, адчуваюць адзіноту, і ім хочацца рэалізавацца. Хтосьці страціў блізкіх, хтосьці абцяжараны праблемамі, хваробамі. Творчасць тут з'яўляецца відам лекаў. Тыя, хто ўдзельнічаць не можа, проста з задавальненнем прыходзяць паглядзець. Для гэтых людзей са сцэны сказанае добрае слова аказваецца вельмі важным. Я тое не разумела, пакуль працавала з дзецьмі і моладдзю. Калі ж толькі прыступіла да працы тут, галоўны ўрач мяне выклікала і пытаецца: як вы спраўляецеся? Я адказваю: як у дзіцячым садку — усе хочуць спяваць, выступаць і ўвагі", — выказваецца культарганізатар.

Таццяна Падкапаева на сцэне. / Фота аўтара

А вось для работы з персаналам патрабуецца актыў. Раней з супрацоўнікаў бальніцы склаўся тэатральны калектыў, цяпер — яшчэ і каманда КВЗ. Разам яны ладзяць спектаклі і гумарыстычныя спаборніцтвы. Мінулай вясной змагаліся ў рамках клуба вясёлых і знаходлівых з камандай КДБ. Пра супрацоўніцтва з калектывам шпіталя Таццяна Міхайлаўна кажа цёпла: "Усе гэтыя людзі — наш касцяк. Нехта адказны за святло, іншы за заслону. Хтосьці — саліст. Мерапрыемства можна арганізаваць лёгка і хутка, бо людзі ведаюць, што ім рабіць".

Дапаможныя рэсурсы

Таццяна Міхайлаўна працуе ў звязцы са шпітальнай бібліятэкай, фонд якой налічвае каля 14 тысяч адзінак. У памяшканні кніжніцы можна ладзіць выставы, а з дапамогай літаратуры арганізоўваць чытанні. Мінскі клуб "Прырода і фантазія" таксама супрацоўнічае са шпіталём і часцяком выстаўляе творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў чытальнай зале. Там жа Таццяна Падкапаева арганізуе і майстар-класы па бісерапляценні, стужцы, вязанні, упрыгожванні стала — карысныя практыкаванні.

Святы — добрая нагода запрасіць не толькі аматараў, але і прафесіяналаў. Гасцямі бальніцы становяцца артысты Белдзяржфілармоніі (з аркестра імя Жыновіча і ансамбля "Свята"), ансамбль "Бяседа" і хор Белтэлерадыёкампаніі, хор "Агеньчык" Палаца ветэранаў, ансамбль курсантаў Ваеннай акадэміі, Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Прадастаўляецца пляцоўка і вучням бараўлянскай музычнай школы: дзеці рэпеціруюць, а пацыентам гэта толькі ў радасць. Сяброўскія адносіны ў шпіталя з мясцовымі царквой і касцёлам.

Поруч з медыцынай

Шлях Таццяны Міхайлаўны да гэтай пасады нельга назваць прадказальным. Пасля Універсітэта культуры яна была размеркавана ў Быхаўскі раён, у дом культуры. Потым працавала ў бальніцы не па спецыяльнасці, затым зноў вярнулася да паклікання — была кіраўніком дзіцячага фальклорнага калектыву ў Ляскоўскім ДК. Работа ішла па ўзоры эстэтычнай школы: дзеці і танцавалі, і спявалі, і малявалі. Гэту дзейнасць спадарыня Таццяна сумяшчала з працай у дзіцячым садку, які пазней зрабілі прытулкам для сацыяльных сірот. Потым зноў — ці — саліст. Мерапрыемства можна арганізаваць лёгка і хутка, бо людзі ведаюць, што ім рабіць".

Прыгоды беларускіх бібліятэкараў за акіянам

а"К"но ў свет

Частка III

ЗША

Дэлегацыя айчынных бібліятэкараў пабывала ў ЗША. Нататкі ад візіту — ад адной з яго ўдзельніц.

(Працяг. Пачатак у №№ 7 — 8.)

У бібліятэцы ўніверсітэта Мінесоты.

Параўнанні бібліятэкі акругі Уошу з паркам недарэмныя.

Рыдар з кніжнымі навінкамі з Карсан-сіці.

Сталіца Нявады — Карсан. Залы мясцовай публічнай бібліятэкі напоўнены наведвальнікамі. У асноўным гэта — падлеткі і моладзь, у сярэднім тысяча за дзень. Вельмі неблагі паказчык, бо насельніцтва ў горадзе — каля 60 тысяч.

Чым жа прыцягвае ўстанова? Добра абнаўляльным фондам не толькі друкаваных, але і электронных выданняў. У кожны "Кіндл" (прыстасаванне для чытання электронных кніг) запампоўваецца каля сотні найменняў. Кошт аднаго — 10 долараў. Па словах супрацоўнікаў, сярэдні кошт друкаванага выдання — 20 долараў. Яшчэ адна цікавостка для моладзі — дзігіторыум: спецыяльна абсталяванае памяшканне для заняткаў з 3D-прынтарам, маленькай студыяй гуказапісу, зялёнай сцэнай для здымак і гэтак далей. Усё набыта на сродкі гранту.

Цяга дзяцей да камп'ютарных гульняў выкарыстоўваецца для іх навучання. Аказваецца, і пад гэта можна атрымаць грант. У бібліятэцы Карсан цягам васьмі месяцаў раз у тыдзень збіралася група дзяцей узростам ад 12 да 14 гадоў для сумеснай пабудовы камп'ютарнага горада. Перад гульнёй яны выслухоўвалі паўгадзінную лекцыю спецыялістаў па самых розных кірунках: па транспартным забеспячэнні, архітэктуры, азеляненні...

Пабывалі ў цэнтральнай бібліятэцы акругі Уошу (прыблізна наша раённая). Яна нагадвае парк: панаванне святла і дзіўных раслін. Установа пабудавана ў 1966 годзе і ўваходзіць у рэестр гістарычных будынкаў. Але здзівіла не толькі гэта. На карэньчыках кніг, у тым ліку і дзіцячых, — індэксы дзесяцічнай класіфікацыі. На маё пытанне, ці часта чытачы выкарыстоўваюць гэтую інфармацыю для пошуку неабходнай літаратуры, пачула адказ ад дырэктара: "Часта!" Па яго словах, навучанне такому пошуку пачынаецца з дзіцячага ўзросту і робіцца гэта ў працэсе абслугоўвання.

У ЗША існуе і практыка складання спісаў літаратуры, якая часта аспрэчваецца. Займаецца гэтым Амерыканская бібліятэчная асацыяцыя на падставе справаздач бібліятэк, школ і сродкаў масавай інфармацыі. Такія спісы складаюцца для інфармавання грамадскасці аб спробах увядзення цэнзуры ў бібліятэках і школах.

дзіцячы садок. Менавіта адтуль яна і атрымала запрашэнне на пасаду культарганізатара ў шпіталь.

Наша гераіня добра ведае, што яе задача — быць памочнікам у лячэнні. У некаторым сэнсе яе можна назваць рэабілітолагам для сваіх няпростых пацыентаў. Яна дапамагае ў арганізацыі медінфармацыйных мерапрыемстваў: забяспечвае апаратурай, прэзентацыямі і, галоўнае, слухачамі лектараў для "Школы цукровага дыябету" ды іншых ініцыятыў. Па сутнасці, Таццяна Міхайлаўна сумяшчае функцыі дырэктара дома культуры, культарганізатара, адказнага за матэрыяльную базу.

Вопыт і кругазварот

За 11 гадоў, што Таццяна Падкапаева працуе ў шпіталі, яна ні разу не была на падрыхтоўчых курсах па спецыфіцы дзейнасці. Магчыма, таму, што такіх у нашай краіне няма. І звярнуцца па міжнародны вопыт працы культработніка з інвалідамі і ветэранамі таксама магчымасці не маецца. Таму спадарыня Падкапаева вучылася сама і зараз, як падаецца, можа даваць кампетэнтныя парады калегам. Але Таццяна Міхайлаўна марыць прайсці хаця б адзін курс па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, звязаным з рэабілітацыйнай дзейнасцю. Тут і падказка ёсць, работа з пяском, напрыклад, для развіцця і падтрымкі малой маторыкі рук сталых людзей. Дарэчы, культарганізатар прызнаецца, што мінулы вопыт работы з дзецьмі вельмі дапамагае ёй зараз, у сітуацыі поўнай адсутнасці спецыяльнай літаратуры.

Але Таццяна Міхайлаўна ведае галоўны сакрэт, якому не вучаць ва ўніверсітэтах і да якога кожны прыходзіць сам: "Канешне, пацыенты патрабуюць асаблівай увагі. Але ласкавае слова растопіць любое сэрца. Як казала галоўная гераіня фільма "Блаславіце жанчыну": "Усміхацца, усміхацца!"

К

Век Шмакава

1 сакавіка споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння народнага артыста СССР Фёдара Шмакава, акцёра-коласаўца, для якога нават вызначэнне "чалавек-легенда" замалое. 70 гадоў творчага жыцця ён аддаў сцэне, яго ведалі і любілі гледачы розных пакаленняў — і не толькі заўзятыя тэатралы. Слава, аўтарытэт Шмакава былі непераўзыдзенымі далёка за межамі Віцебска.

Учора з нагоды векавой даты на малой сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа адбыўся вечар памяці Фёдара Іванавіча "Мая партыя — мастацтва" (у назву вынесены словы самога Шмакава). Прагучалі ўспаміны калег па сцэне, былі паказаныя ўрыўкі са спектакляў (як у відэазапісе, так і "жывым планам", калі ролі Шмакава прымервалі на сябе іншыя акцёры) і кінафільмаў, дзе ён іграў… А "К" прапануе некалькі цікавых, а мо і малавядомых фактаў з біяграфіі Шмакава.

Слесар дакладнай механікі

У 1918 годзе бацькі Федзі пераязджаюць у падмаскоўны гарадок Рашаль. Тут на крылах піянерскіх і камсамольскіх песень імкліва імчаць дзіцячыя і юнацкія гады будучага майстра беларускай сцэны. Школа-сямігодка, ФЗН пры заводзе, дзе бацька працуе рабочым, а сын ужо слесар дакладнай механікі. І нічога ў жыцці Фёдара не змянілася б, каб да яго аднойчы не падышоў заводскі інжынер, са старых інтэлігентаў: "Табе трэба вучыцца на акцёра", — сказаў ён.

Адмовіўся ад Меерхольда

Праз некаторы час Шмакаў пабачыў аб'яву ў газеце: "Студыя МХАТа аб'яўляе першы набор". На экзамен спазніўся, але яго згадзіліся прагледзець два масцітыя акцёры. Чытаў вершы і апавяданні Зошчанкі. І пры гэтым так цікава рухаўся, такія выкрутасы паказваў, што яму параілі студыю Меерхольда. Але Фёдар паступіў у Ленінградскае тэатральнае вучылішча. Яго педагогам быў знакаміты артыст Васіль Мяркур'еў.

Выбраў Магілёў

Па заканчэнні вучобы ў 1939 годзе, калі Шмакаў атрымаў шэраг запрашэнняў з ленінградскіх тэатраў, а таксама з тэатра Паўночнага флоту, узнікла заманлівая прапанова стварыць у Магілёве новую маладзёжную трупу. Так Шмакаў са сваімі аднакурснікамі апынуўся на Беларусі. Якраз большая частка выпускнікоў мяркур'еўскага курса склала ядро Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра ў Магілёве, мастацкім кіраўніком якога быў рэжысёр і педагог Дзмітрый Арлоў. З першых жа крокаў малады Шмакаў звярнуў на сябе ўвагу яркай індывідуальнасцю, шырынёй творчага дыяпазону. Ён смела браўся за ролі рознага плану — ад Важаватава ў "Беспасажніцы" Астроўскага і Аргона ў "Прытворным хворым" Мальера да Віктара ў "Казцы" Святлова.

Вайна "выбрала" Віцебск

У чэрвені 1941 года тэатр выправіўся на гастролі ў Беласток, дзе артыстаў і напаткала вайна. У нейкім эшалоне Фёдар трое сутак дабіраўся да Віцебска. Тут артыст Аляксандр Ільінскі, які ведаў маладога Шмакава па спектаклях, прапанаваў уладкавацца на працу. Але неўзабаве і віцебскі тэатр становіцца "на колы", выпраўляецца ў эвакуацыю ў далёкі Уральск. Потым былі незабыўныя чатыры месяцы ў франтавой брыгадзе артыстаў-коласаўцаў. Фёдар Шмакаў там аказаўся самым маладым. Іх брыгада абслугоўвала Першы Беларускі фронт. У дзень адбывалася па пяць — шэсць выступленняў, нярэдка на перадавой. Але якраз тады, на вайне, прызнаваўся потым Фёдар Іванавіч, ён добра ўсвядоміў, як патрэбна чалавеку мастацтва.

Фёдар Шмакаў у вобразах Несцеркі ў аднайменным спектаклі...

...Прысыпкіна ў спектаклі "Клоп"...

...Сілы Гразнова ў спектаклі "Праўда добра, а шчасце — лепш"...

...Гарацыя ў спектаклі "Гамлет"...

...Леніна...

Шмакаў і Канапелька

Віцебск ляжаў у руінах, а Коласаўскі тэатр даваў першыя прадстаўленні ў будынку былога клуба металістаў (зараз гэта будынак па вуліцы Ільінскага). Сярод іншых асаблівым поспехам у гледача карысталіся спектаклі з удзелам маладых Фёдара Шмакава і Зінаіды Канапелькі (на той час — мужа і жонкі).

Абаянне псіхалагізму

Артыст з рэдкім абаяннем і шчырасцю, ён умеў прыцягнуць гледача да мыслення і перажыванняў героя. Для мастацтва Шмакава і ў 1940-я — 1950-я, і ў больш познія гады былі ўласцівыя псіхалагічная характарыстыка вобразаў, лаканізм і прастата ў спалучэнні з яркімі, тэатральна выразнымі фарбамі. Асабліва тонка ён мог даследаваць прыгожы ўнутраны свет сучаснікаў. Гаворка пра ролі Лабанава ў інсцэніроўцы рамана Данііла Граніна "Шукальнікі", Сяргея з "Іркуцкай гісторыі" Аляксея Арбузава.

Сяброўства з Шамякіным

Адметныя ролі дырэктара школы Лемяшэвіча з "Крыніц", хірурга Яраша з "Сэрца на далоні", камуніста Антанюка са "Снежных зімаў". Апошнія тры — пастаноўкі па творах народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, з кім Фёдара Іванавіча звязвалі доўгія гады сяброўства.

Сыграў "вешальніка"

Сатырычная завостранасць, дакладны сцэнічны малюнак уласцівыя створаным ім адмоўным персанажам. Салавейчык у "Амністыі" Мікалая Матукоўскага, Альховік і Кузьміч ("Трывога" і "Укралі кодэкс" Алеся Петрашкевіча), Разаеў ("Стары дом" Аляксея Казанцава), Грушэўскі ("Блытаныя сцежкі" Кандрата Крапівы), Мураўёў-"вешальнік" ("Кастусь Каліноўскі" Уладзіміра Караткевіча)...

Не аднойчы — Ленін

Не абмінеш і ролю, якая з'яўлялася этапнай у біяграфіях артыстаў савецкай эпохі. За яе стварэнне Фёдар Іванавіч быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР. Гэта вобраз Леніна. Прычым спярша Шмакаў сыграў маладога Валодзю Ульянава ў спектаклі "Сям'я" па п'есе Іосіфа Папова, а потым паказаў правадыра ў першыя гады савецкай улады ў спектаклях "Вечная крыніца" Дзмітрыя Зорына, "Шостага ліпеня" Міхаіла Шатрова і "Трэцяя, патэтычная" Мікалая Пагодзіна.

"ЧП…" з Гараднічым

Сярод вобразаў класічнага рэпертуару можна вылучыць яго Гарацыя, Эдгара, Ларэнца ("Гамлет", "Кароль Лір", "Рамэа і Джульета" Уільяма Шэкспіра), Акіма з "Улады цемры" Льва Талстога, Прысыпкіна з "Клопа" Уладзіміра Маякоўскага, Мурамскага з "Вяселля Крачынскага" Аляксандра Сухава-Кабыліна, Бессяменава з "Мяшчан" Максіма Горкага, Гараднічага з "ЧП-1" — "ЧП-2" (паводле "Рэвізора" Мікалая Гогаля). Дзіўна, але факт: артыст адчуваў сябе ў апошнім з названых спектакляў — эксперыментальнай пастаноўцы Барыса Эрына — вельмі натуральна. Хітрасць, езуіцкае крывадушша, прыстасавальніцтва, нахабнасць, цынізм, адчуванне сваёй беспакаранасці — усе гэтыя агідныя чалавечыя якасці выдатна раскрываў Фёдар Іванавіч у хрэстаматыйным вобразе Гараднічага.

Спадчынны Несцерка

Знакаміты шмакаўскі Несцерка ў аднайменным спектаклі-візітоўцы калектыву паводле твора Віталя Вольскага цягам дзесяцігоддзяў нязменна адкрываў тэатральныя сезоны ў коласаўцаў. Гэтая роля была і для самога Фёдара Іванавіча любімай. Магчыма, таму, што была прынятая ім у спадчыну ад карыфея беларускай сцэны Аляксандра Ільінскага.

Кантрасны Шмакаў

У апошнія гады ў спектаклі "Лебядзіная песня" паводле Антона Чэхава ўражваў шмакаўскі Светлавідаў — стары акцёр, забыты ў тэатры пасля бенефісу. У камедыі Астроўскага "Праўда добра, а шчасце — лепш" (дарэчы, Фёдар Іванавіч стаў і пастаноўшчыкам спектакля) артыст стварыў каларытны вобраз гэткага хітраватага, "сабе на розуме", старога унтэра Сілы Гразнова, які хоць і ўладкоўвае шчасце маладой пары, але ж і пра сябе не забываецца.

Пэн у 1937-м

Зусім іншая роля — вострадраматычная па гучанні, трагедыйная па змесце — Юдаль Пэн, славуты віцебскі мастак. П'еса "Ружа ў чыстым полі" была хутчэй эскізам, чым цэласным творам. Тым не менш, артысты змаглі знайсці цікавыя фарбы для сваіх персанажаў. Якраз тут Шмакаву і спатрэбілася яго ўменне жыць унутраным жыццём персанажа, здольнасць прыцягнуць увагу гледача да працэсу мыслення на сцэне. Пэн-Шмакаў быццам адчужаны ад тых страшных падзей, што адбываюцца за сценамі яго жытла ў 1937-м. Ён быццам ведае, прадчувае: яго зямное жыццё адлічвае апошнія гадзіны, хвіліны. Мабыць, таму ён існуе ў нейкім сваім свеце памяці, кіруючыся згадкамі, успамінамі далёкай маладосці, няспраўджанага кахання…

Апошняя роля

Апошняй роляй на коласаўскай сцэне і ў творчым жыцці знакамітага артыста стаў Маргарытаў з камедыі Аляксандра Астроўскага "Позняе каханне". Спектакль адмыслова да 90-годдзя Фёдара Іванавіча паставіў колішні мастацкі кіраўнік Віталь Баркоўскі. Пайшоў з жыцця доўгажыхар віцебскай сцэны 1 мая 2009 года…

Юрый ІВАНОЎСКІ,
тэатразнаўца
Віцебск
Фота з архіва тэатра

Міні-студыя гуказапісу ў бібліятэцы Карсана.

Шыфры з Уошу.

Штат Мінесота. Пастаянная змена часавых паясоў не дазваляе дакладна арыентавацца ў часе сутак, што ўскладняе ўспрыняцце плыні найцікавейшай інфармацыі. Але мы шчыра стараемся праглынуць усё. Ва ўніверсітэце Святой Кацярыны сустрэліся з бібліятэкарамі, выкладчыкамі і студэнткай магістарскай праграмы бібліятэчных і інфармацыйных навук. Праграма ўключае 12 курсаў, сем з якіх — па студэнцкім выбары. Універсітэцкая бібліятэка скарыла прасторай. Цікава, што расклад заняткаў складаюць бібліятэкары.

Супрацоўнікі Мінесоцкай лічбавай бібліятэкі распавялі аб праекце "Minnesota Reflection". Яны робяць тое, што мы збіраліся зрабіць у мінулай пяцігодцы — Нацыянальную электронную бібліятэку. Тут яна называецца "Лічбавая публічная бібліятэка Амерыкі".

У кожным штаце культурная спадчына, што захоўваецца ў фондах бібліятэк, архіваў, музеяў, гістарычных таварыстваў, алічбоўваецца. У Мінесоце гэта робіцца ў рамках праекта "Minnesota Reflection".

Марына ПШЫБЫТКА,
загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Дызайнерскі ход

"Перабудова" ды кабіна Неферціці

1.

2.

1988 год, Парыжскі аўтасалон. Сенсацыяй стала распрацоўка беларускіх дызайнераў — аўтацягнік МАЗ-2000 пад гордым імем "Перабудова" (падзеі ж адбываліся ў разгар перабудовы, якая тады натхняла савецкіх людзей). Аўтамабіль жа і сапраўды быў незвычайным.

3.

Нетрадыцыйнае кампановачнае рашэнне — кіраваны рухавіковы модуль, кабіна над рухавіком, габарыты кабіны, якія дазваляюць знаходзіцца ў ёй у поўны рост. Незвычайным аўтамабіль быў і знешне: кабіна мяккай абцякальнай формы, цэльнае ветравое шкло на даўжыню ўсяго салона, прыборная панэль сучасных скульптурных формаў, а грузавая частка з'яўлялася арганічным працягам пластыкі кабіны... Можна сказаць, тады беларускі дызайн гучна заявіў пра сябе на міжнароднай арэне. Вядучым жа дызайнерам пры стварэнні названай машыны быў мінскі дызайнер Станіслаў Паланевіч.

На жаль, аўтацягнік "Перабудова" так і не быў пастаўлены на масавы выпуск: яго чакаў такі ж лёс, як і саму перабудову. Але гэта не выбіла з сядла нашых дызайнераў. Станіслаў Паланевіч і ў постперабудоўчы час працягваў актыўна працаваць над дызайнам беларускіх аўтамабіляў. У пачатку 2000-х у Беларусі робяцца пэўныя крокі ў развіцці практыкі прамысловага дызайну. Так, у Нацыянальным дызайн-цэнтры ажыццяўлялася работа над праектамі ў галіне машынабудавання. Тады па ініцыятыве кіраўніцтва Нацыянальнага цэнтра праблем механікі і машын побыту была зацверджана Дзяржаўная праграма белаўтатрактарабудавання. Дык вось, у адпаведнасці з апошняй ставілася задача стварыць цягач новага пакалення "МАЗ" для магістральных перавозак з каютай павышанай камфортнасці і роўнай падлогай ды з наступным стварэннем модульных аўтацягнікоў. Над распрацоўкай дызайнерскай часткі праекта працавала група пад кіраўніцтвам Станіслава Паланевіча. У яе таксама ўваходзілі Віктар Сонца, Андрэй Фандзюхін, Віктар Сівалобаў.

На здымках:
1. Аўтацягнік МАЗ-2000 "Перабудова";
2. Трактар "Беларусь" МТЗ-142; 3. Каток асфальтавы "Амкадор". Праект; 4. Трактар для горнага земляробства. Дыпломны праект.



4.

Распрацаваная імі новая мадэль па вобразе нагадвала хуткасны экспрэс. Асабліва арыгінальна была вырашана форма кабіны, у абрысах якой чытаўся знаёмы вобраз Неферціці. Месца вадзіцеля размяшчалася па цэнтры, за кошт чаго пярэдняя частка кабіны рабілася больш завужанай, што надавала машыне павышаныя аэрадынамічныя якасці. Меўся ў ёй і кухонны блок, а таксама каюта з размешчанымі ўздоўж кірунку асноўнага руху койкамі для вадзіцеляў, душ і санвузел. Кабіна была зроблена ўперадзе рухавіка, таму з'явілася магчымасць рабіць яе з роўнай падлогай.

Калі Паланевіч працаваў над стварэннем аўтацягніка "Перабудова", ён ужо быў галоўным дызайнерам праектаў беларускага філіяла Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута тэхнічнай эстэтыкі (УНДІТЭ). Пачаўся ж яго творчы шлях у дызайне ў 1973 годзе, калі ён скончыў аддзяленне прамысловага мастацтва Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Дыпломны праект Станіслава быў незвычайны. Крутасклонны трактар мог лёгка змяняць становішча колаў, дапускаў мацаванне рабочых машын у розных месцах рамы. Нават кабіну можна было перасоўваць і ўмацоўваць там, дзе яна патрабуецца для канкрэтных работ. Трактар мог прыстасоўвацца да рэльефу мясцовасці, захоўваючы ўвесь час вертыкальнае становішча кабіны і працуючы чаўночным спосабам (назад-наперад, следуючы адной траекторыі і контуру рэльефа).

Наогул, час, калі Станіслаў скончыў інстытут, быў рамантычнай парой станаўлення і развіцця айчыннага дызайну. Папулярнасць гэтай сферы дзейнасці ў тыя гады была параўнальная толькі што з касманаўтыкай. Станіслаў быў накіраваны працаваць у беларускі філіял УНДІТЭ. Тут ён сустрэўся з Віктарам Сонца, з якім стаў цесна супрацоўнічаць у галіне стварэння новых аб'ектаў машынабудавання, і гэтае супрацоўніцтва працягваецца ўжо больш чым сорак гадоў (за час сумеснай працы яны атрымалі больш за сем дзясяткаў аўтарскіх пасведчанняў на прамысловы ўзор). Вынікам іх сумеснай творчасці сталі ўніфікаваная кабіна трактара "Беларус", якая ўжо 40 гадоў у вытворчасці, аўтобус "Нёман", грузапасажырскі аўтобус "КАЗ", дызайн большасці трактараў розных заводаў Савецкага Саюза. Разам з Віктарам Сонца Паланевіч працаваў і над аўтацягнікам "Перабудова".

…Не так даўно Станіславу споўнілася 75 гадоў, але дызайнер у добрай творчай форме. Зараз ён разам са сваім верным сааўтарам працуе ў холдынгу "Амкадор". Былі распрацаваны: комплекс лесапрамысловых машын, тэлескапічны пагрузчык, пагрузчык з бартавым паваротам, самазвал павышанай праходнасці грузапад'ёмнасцю 25 тон, экскаватар-пагрузчык, група франтальных пагрузчыкаў, каткі грунтовы і асфальтавы. "Безумоўна, — гаворыць Паланевіч, — наша супрацоўніцтва з заводам "Амкадор" наклала свой адбітак на стылістыку яго прадукцыі. Але гэта ў меншай ступені з'явілася адлюстраваннем нашых стылявых пераваг, а, у асноўным, формаўтварэннем пад уплывам новых тэхналагічных магчымасцяў, такіх як ужыванне стандартных профіляў, уклейвальных вокан, гнуткага шкла, шырокіх магчымасцяў ужывання кампазітных матэрыялаў. Гэтыя формаўтваральныя фактары з'явіліся вызначальнымі і для аналагічнай прадукцыі ў сусветным машынабудаванні. З нашых, і безумоўна маіх, асабістых пераваг у дадзенай рабоце былі імкненне да канструктыўнай мэтазгоднасці, эканамічнасці і чыстаце форм вырабу. Для такой прадукцыі, як дарожна-будаўнічая тэхніка, гэтыя правілы формаўтварэння лічу асноўнымі без залежнасці ад модных часовых пераваг".

Якаў ЛЕНСУ,
Анатоль ЦЕХАНОВІЧ,
члены Беларускага саюза дызайнераў

Гістарыёграф

Лёс бібліятэк народнікаў у Мінску

Народнікі Георгій Пляханаў і Ісак Гурвіч, чые жыцці і дзейнасць былі шчыльна звязаныя з Мінскам ды іншымі гарадамі Беларусі, увайшлі ў гісторыю не толькі як стваральнікі сацыял-дэмакратычных партый і іншых рэвалюцыйных арганізацый, але і як вучоныя, асобы, неабыякавыя да культуры, знаўцы мастацтва, крытыкі і літаратары.

Рэвалюцыйным цэнтрам становіцца Мінск

У снежні 1876 года Пляханаў стаў адным з арганізатараў і актыўных удзельнікаў палітычнай дэманстрацыі, якая адбылася на плошчы каля Казанскага сабора ў сталіцы Расійскай імперыі Пецярбургу. У гэты час малады Георгій, як і старэйшыя таварышы-народнікі, быў прыхільнікам Вісарыёна Бялінскага (сваяк Пляханава па маці) і Мікалая Чарнышэўскага. Не выпадкова, што першае сур'ёзнае палітычнае мерапрыемства, у якім удзельнічалі рабочыя і студэнты, ураджэнцы беларускіх губерняў, было прысвечана Чарнышэўскаму, які знаходзіўся ў той час у ссылцы. Сярод пецярбургскіх аднадумцаў Георгія Пляханава, а пазней і актыўных удзельнікаў "Чорнага перадзелу" ў Мінску, былі былыя студэнты пецярбургскага ўніверсітэта Анатоль Бонч-Асмалоўскі (ураджэнец Віцебска), мінчане Ісак Гурвіч і ягоная сястра Яўгенія — арганізатар пляханаўскай друкарні ў Мінску, перакладчыца "Капітала" Карла Маркса, актыўная ўдзельніца падрыхтоўкі I з'езда РСДРП і I з'езда Бунда, а таксама (у 1917 годзе) член выканкама Мінскага савета дэпутатаў.

Калегі і сябры Георгія Пляханава, у прыватнасці тыя, з кім ён ствараў арганізацыю "Вызваленне працы", паўплывалі на ягоныя ідэйна-тэарэтычныя погляды. Сярод іх былі людзі, якія мелі беларускія карані і звязвалі сваё жыццё з этнічнымі беларускімі землямі — Вера Засуліч, ураджэнка Смаленскай губерні, Павел Аксельрод, што доўгі час жыў і вучыўся ў Магілёве (там жа — і народніца Ганрыета Дабрускіна, якая дастаўляла рэвалюцыйную літаратуру ў Беласток і Варшаву), а пазней і Любоў Аксельрод з Віленскай губерні.

У 1877 і 1878 гадах за сваю рэвалюцыйную дзейнасць Пляханаў арыштоўваўся. З прычыны ўзмацнення ціску ўладаў ён вымушаны быў некалькі разоў эміграваць за мяжу, але сувязі з Расійскай імперыяй, у прыватнасці, з беларускімі народнікамі (у першую чаргу з "чорнаперадзельцамі"), не спыніліся. Гэтаму садзейнічала тое, што да эміграцыі Пляханаў неаднаразова прыязджаў у Мінск, дзе займаўся арганізацыяй падпольнай друкарні "чорнаперадзельцаў" (у ёй выйшлі газеты "Чорны перадзел" (№№ 3 — 5) і "Зерне" (№№ 3 — 6). Частка супрацоўнікаў друкарні мінскай групы пад пагрозай арышту была вымушана з'ехаць за мяжу). Наогул, у заходніх губернях імперыі народнікі першапачаткова (пасля расколу арганізацыі "Зямля і воля") прытрымліваліся пазіцый пляханаўскага "Чорнага перадзелу". Асабліва шмат яго прыхільнікаў знаходзілася ў Мінску. Да ліку самых актыўных адносяць Анатоля Бонч-Асмалоўскага, Яўгенію Гурвіч і членаў іх сем'яў.

1880 год Пляханаў з жонкай пад прозвішчам дваран Сямашкаў сустрэлі ў Пецярбургу, адкуль Георгій Валянцінавіч павінен быў зноў тэрмінова з'ехаць. Спачатку ў Мінск, куды перамясціўся цэнтр палітычнага жыцця "Чорнага перадзелу", а потым — за мяжу. У гэты час у сталічных гарадах і буйных губернскіх цэнтрах вяліся масавыя арышты рэвалюцыянераў-народнікаў — асабліва пасля каранацыі імператара Аляксандра III. Рэпрэсіі значна ўзмацніліся і ў заходніх губернях, у тым ліку ў Мінску, Магілёве, Віцебску, Гродне і Вільні. Разам з тым, Аляксандр III у 1883 годзе амнісціраваў удзельнікаў паўстання 1863 — 1864 гадоў. Верагодна, гэтыя абставіны надалі дадатковы аптымізм студэнцкім арганізацыям Пецярбурга, якія выступалі з ініцыятывай аб'яднання народніцкіх арганізацый Беларусі і стварэння групы "Гоман". Сярод галоўных ідэолагаў і арганізатараў "Гомана" быў Аляксандр Марчанка, які ў 1881 годзе ўзначальваў студэнцкі гурток "Беларуская грамада".

Замоўца кніг — паэт Адам Гурыновіч

Народнікі-эмігранты значна паўплывалі на аднапартыйцаў, што засталіся, у прыватнасці, у Беларусі, у тым ліку на паэта і рэвалюцыянера Адама Гурыновіча, ягоных аднадумцаў, а таксама на дэлегатаў I з'езда РСДРП ды іншых беларускіх сацыялістаў. Так, Адам Гурыновіч стварыў у Пецярбургу групу рэвалюцыйнай моладзі. Затым праз сваіх сяброў звязаўся з Георгіем Пляханавым і замаўляў рэвалюцыйную літаратуру. Па меркаванні даследчыка Івана Лушчыцкага, замовы кніг Пляханава і ягоных калег дасягалі 30 — 50 і нават 200 экзэмпляраў. Вядома і тое, што Гурыновіч падтрымліваў сувязь з

Георгій Пляханаў.

Зніклыя “Грацыі” з Гомеля

У гады Вялікай Айчыннай вайны музеі Беларусі страцілі вялікую колькасць сваіх калекцый. Не стаў выключэннем і сучасны музей Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Аснову тады яшчэ гістарычнага музея складалі прадметы, якія належалі сям’і князёў Паскевічаў, у чыім палацы і размясцілася ўстанова. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны было прынята рашэнне аб эвакуацыі артэфактаў. Пунктам назначэння быў выбраны горад Сталінград, куды ў ліпені 1941 года вывезлі большасць каштоўнасцяў з Гомельскага гістарычнага музея. Але забраць усё, на жаль, не атрымалася — у Гомелі засталося больш за 10 тысяч прадметаў. Лёс большасці з іх застаецца невядомым.

Скульптура Антоніа Кановы “Тры грацыі” са збору Эрмітажа. / Фота hermitagemuseum.org

Фотаздымак з выявай скульптурнай групы, які выкаўляўся на інтэрнэт-аўкцыёне “Ebay”. / Фота з калекцыі аўтара

Летась на інтэрнэт-аўкцыёне “Ebay” з’явіўся фотаздымак, зроблены салдатам Вермахта ў 1943 годзе, на якім была адлюстравана скульптурная група з трох жанчын. Фатаграфія ішла ў падборцы са здымкамі Гомеля, таму і гэтая выява, магчыма, была знята ў горадзе над Сожам. Такая скульптура магла знаходзіцца толькі ў палацы Паскевічаў, у сувязі з чым неабходна было праверыць яго вопісы маёмасці, якія захоўваюцца ў гомельскім музеі.

У “Вопісе наяўнасці гомельскага замка”, зробленым у 1910 годзе, сярод іншых прадметаў калекцыі князёў Паскевічаў згадвалася статуя “Тры грацыі” з белага мармуру на мармуровым жа пастаменце. Сапраўды, жанчыны на фатаграфіі падобныя на трох грацый, якія ў старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай міфалогіі былі даравальніцамі натхнення і набліжанымі да мастацтва як багіні вытанчанасці, харастава і прыгажосці. Але ці тая ж гэта скульптурная група, якая знаходзілася ў Гомелі?

Пацвердзіць здагадку дапамог нядаўна набыты музеем Гомельскага палацава-паркавага ансамбля альбом “Homel 1911” з відамі палаца і парка. На адной з фатаграфій з выявай паўднёвай галерэі злева сярод раслін бачна мармуровая статуя. Несумненна, гэта і ёсць “Тры грацыі”, чыя выява была на фотаздымку нямецкага салдата.

Існуе меркаванне, што скульптура была прывезена Фёдарам Іванавічам Паскевічам пасля яго паездкі па Італіі ў 1860 — 1870-я. Аўтар яе, на жаль, не вядомы, але зроблена яна была з арыгінала знакамітага італьянскага майстра-класіцыста канца XVIII — пачатку XIX стагоддзяў Антоніа Кановы. Арыгінал быў выраблены паміж 1813 і 1816 гадамі. Да 1901 года ён захоўваўся ў герцага Лейхтэнбергскага ў Санкт-Пецярбургу, а затым быў прададзены ў Эрмітаж, дзе і знаходзіцца па сёння.

На мармуровым пастаменце гомельскай скульптуры быў накрэслены знак: “Ш/–/7”, што ён азначае, сказаць праблематычна. Не выключана, што гэта мог быць подпіс аўтара.

Дзякуючы знойдзенай нямецкай фатаграфіі, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што гомельскія “Тры грацыі” не былі эвакуіраваны ў Сталінград, а заставаліся ў будынку музея, прынамсі, да 1943 года. На здымку бачна, што скульптурная група была пашкоджана, на ёй прысутнічае мноства трэшчын. Але што з ёй здарылася пасля вызвалення Гомеля 26 лістапада 1943 года, можна толькі здагадвацца: яе маглі знішчыць, увезці ў Германію, скінуць у раку ці схаваць у горадзе. Камісія па ацэнцы шкоды, прычыненай Гомельскаму гістарычнаму музею, створаная 15 снежня 1944 года, ацаніла “Тры грацыі” ў 500 тысяч рублёў. Мармуровая скульптурная група стала самай дарагой сярод усіх згубленых скульптур гомельскага музея.

Сёння застаецца толькі спадзявацца, што “Тры грацыі” не былі страчаны назаўсёды і змогуць калі-небудзь зноў з’явіцца ў гомельскім музеі. Альтэрнатывай жа можа служыць стварэнне яшчэ адной копіі з арыгінальнай скульптуры Антоніа Кановы, якая экспануецца ў Эрмітажы.

Юрый ПАНКОЎ,
супрацоўнік музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля

Фрагмент з “Вопісу наяўнасці гомельскага замка” 1910 года.

Фрагмент фотаздымка Паўднёвай галерэі палаца са скульптурай “Тры грацыі” з альбома “Homel 1911”. / Асобнік з фондаў музея.

Ці застаўся кніжны “след” Пляханава і Гурвіча ў Беларусі?

Яўгенія Гурвіч.

Ісак Гурвіч.

Стары будынак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску.

Пляханавым і ягонай групай “Вызваленне працы”. Наогул, Лушчыцкі быў перакананы: на светапогляд беларускага паэта, мысліцеля і членаў ягонай групы вялікі ўплыў аказалі работы Пляханава “Сацыялізм і палітычная барацьба” і “Нашы рознагалоссі”. Такія высновы былі зроблены на аснове ліста Адама Гурыновіча (ад 2 лістапада 1892 года) у Швейцарыю, а таксама іншых архіўных дакументаў.

Мінскія бібліятэкі Пляханава і Гурвіча

Вядома, што ў 1922 годзе бліжэйшы паплечнік Пляханава па рэвалюцыйным руху і мінскім народніцкім падполлі Ісак Гурвіч, які да гэтага часу стаў доктарам філасофіі і аўтарытэтным вучоным-эканамістам у Нью-Ёрку, падарыў нядаўна створанаму Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту асабістую бібліятэку, у якой налічвалася некалькі тысяч тамоў. Менш вядомы лёс значнай часткі бібліятэкі Георгія Пляханава, збіраць якую ён пачаў яшчэ ў той час, калі адкрываў у Мінску друкарню і ствараў органы кіравання народніцкай арганізацыі “Чорны перадзел”.

Наогул, унікальную бібліятэку Пляханава дапамаглі стварыць ягоныя беларускія паплечнікі і сябры. Асабліва вялікую ролю ў яе фарміраванні аказала фінансавая падтрымка Мікалая Судзілоўскага (нарадзіўся ў Магілёве), больш вядомага як доктар Русэль. Пляханаў набываў (часта галадаючы) кнігі, у прыватнасці, “Капітал” Маркса, накіроўваў на выданне і набыццё кніг амаль усе сродкі сям’і (так, да канца XIX стагоддзя ў ягонай бібліятэцы налічвалася амаль дзве тысячы кніг на 18 мовах).

Лёс кнігазбору

Легенда бібліятэчнай справы ў Беларусі Іосіф Сіманоўскі (1892 — 1967) не толькі стаў першым дырэктарам Дзяржаўнай бібліятэкі БССР. Яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі ён скончыў Бернскі ўніверсітэт (1914) і быў знаёмы з першымі сацыял-дэмакратамі Расіі, у тым ліку з Пляханавым, Гурвічам і іншымі вядомымі асобамі. Сярод іх была і Яўгенія Гурвіч, у якой у 1922 годзе ён прымаў бібліятэку БДУ.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце і яго бібліятэцы дасюль шануюць першую загадчыцу і складальніцу кніжнага фонду БДУ Яўгенію Адольфаўну Гурвіч, сястру вядомага народніка і сацыял-дэмакрата, бліжэйшую супрацоўніцу друкарні Пляханава ў Мінску. Аднак і старажылы БДУ не могуць згадаць лёс вядомай бібліятэкі ў некалькі тысяч тамоў, што была падаравана ўніверсітэту прафесарам з Нью-Ёрка Ісакам Гурвічам (зразумела, у ёй маглі аказацца і кнігі са збору Пляханава). А справа ў тым, што бібліятэка БДУ ў 1922 годзе была аб’яднана з Дзяржаўнай бібліятэкай БССР. Апошняй (цяпер гэта галоўная бібліятэка краіны) быў перададзены амаль увесь фонд кніг БДУ, у тым ліку і падараваная бібліятэка Гурвіча.

Пасля трагічных падзей Другой сусветнай вайны ў Нацыянальнай бібліятэцы засталося літаральна некалькі кніг, гаспадаром або аўтарам якіх з’яўляўся Ісак Гурвіч. Супрацоўнікі аддзела рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі дапамагалі аўтарам знайсці гэтыя вельмі ўнікальныя выданні.

■ ■ ■

Сувязі “Вызвалення працы” з рэвалюцыянерамі Беларусі былі распаўсюджаны на працягу ўсяго перыяду дзейнасці гэтай арганізацыі. Яны садзейнічалі пераходу перадавой часткі рэвалюцыянераў ад народніцтва да сацыял-дэмакратыі, а пазней і арганізацыі ў Беларусі вялікай колькасці рэвалюцыйных партый. Значную ролю ў гэтым адыгралі газеты, кнігі і іншая літаратура з бібліятэк Георгія Пляханава, Ісака Гурвіча і іх аднадумцаў, якія засталіся ў Мінску, Вільні — гарадах, што адыгралі адметную ролю ў будучым лёсе незалежнай Беларусі.

Рыгор ЛЯНЬКЕВІЧ,
дацэнт кафедры культуралогіі БДУ, кандыдат філасофіі,
Вольга СТАШКЕВІЧ,
навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:
■ Выстава твораў з калекцыі Мацея Мікалая Радзівіла **"Радзівілы: лёсы краіны і роду"** — да 16 красавіка.
■ Выстава **"Мемарыяльны пейзаж В.К. Бялыніцкага-Бірулі"** (да 145-годдзя з дня нараджэння мастака) — да 14 сакавіка.
■ Выстава **"Віцебская школа гравюры"** — да 19 сакавіка.
■ Выстава **"Век Антона Бархаткова"** — да 12 сакавіка.
■ Выстава твораў Юліі Гайдуковай **"Замілаванне простым"**— да 13 сакавіка.
■ Выстава акварэльных пейзажаў літоўскага мастака Раманаса Барысаваса **"Паэзія руін"** — да 20 сакавіка.
■ Цыкл лекцый **"XX стагоддзе. Рэвалюцыі ў думках і мастацтве"** — кожную сераду а 19-й, Малая зала.
■ Цыкл лекцый **"Радзівіліяна"** — кожную суботу а 16-й, з 4 сакавіка да 8 красавіка.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Музычная вечарына **"Ты всех милей и краше..."** з удзелам ансамбля "Патаемнае" Рэспубліканскага Палаца культуры ветэранаў — 10 красавіка. Пачатак а 18-й.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект **"Вяселле Заходняга Палесся"** — да 30 красавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".

Выставы:
■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"** — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 мая.
■ Выстава **"Уладзімір Мулявін. Спадчына вялікага маэстра"** — да 9 красавіка.
■ Выставачны праект беларускага дызайнера Надзеі Хімдзіят **"Дарога да дрэва жыцця"** — да 26 сакавіка.
■ Інтэрактыўны выставачны праект **"Анатомія цуду"** — да 16 красавіка.
■ Унікальны інтэрактыўны праект **"МирРаж"** — да 9 красавіка.
■ **"Кветкавы"** майстар-клас — 4 сакавіка а 12-й, 5 сакавіка а 15-й.
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.

Філіялы музея
ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.
■ Выстава эксперыментаў **"Музей навукі"** — да 31 сакавіка.
■ Выстава **"Савецкі плакат"** — да 26 сакавіка.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.
■ Выстава **"Беларусь і Кітай: 25 гадоў паспяховага супрацоўніцтва"** — да 31 сакавіка.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ "Выстава насякомаедных раслін".

г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.
■ Выстава **"Шумлівая пярнатая вясёлка"** — да 13 сакавіка.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Выстава **"Сафары парк"** — да 1 верасня.
■ Выстава **"Птушкі ўзімку"** — да 12 сакавіка.
■ Выстава кветак **"Архідэі"** — да 10 сакавіка.
■ Атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 1 красавіка.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава **"Гітары мінулай эпохі"** (з прыватнага збору мінскага калекцыянера Уладзіміра Мітраева) — да 24 сакавіка.
■ Выстава **"Ідылія"**, прысвечаная пастаноўцы (1852 года) музычна-драматычнага твора, оперы В.Дуніна-Марцінкевіча "Ідылія" — да 1 красавіка.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.
■ Выстава акварэльнага жывапісу Ларысы Стрыжак і Наталлі Харольскай **"Мы любім кветкі..."** — з 4 да 26 сакавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Пастаянная экспазіцыя.
■ Паказы ў рамках праекта **"KINOPORT"** — кожную суботу.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Экспрэс-выстава **"Палітычная прапаганда ў Афганістане"** — да 6 сакавіка.
■ Экскурсія **"Ішлі дзяўчынкі па вайне..."**, прымеркаваная да Дня жанчын — 4, 5, 7 і 9 сакавіка па папярэднім запісе.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+ 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава твораў Таццяны Осіпавай **"Фарбы вясны"**— да 16 сакавіка.
■ Выстава **"Тутэйшы дызайн. Простыя рэчы"** з калекцыі Беларускага саюза дызайнераў — да 2 красавіка.
■ Культурна-адукацыйны праект **"Тэатр ценяў у замку Радзівілаў"**. Пастаноўкі тэатра праводзяцца 8 і 9 сакавіка па папярэдніх заяўках.
■ Дзіцячыя тэатралізаваныя экскурсіі з элементамі квэсту — з 28 сакавіка да 2 красавіка па папярэдніх заяўках.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
■ Выстава **"Замалёўкі з натуры"** Ганны Сілівончык — да 8 сакавіка.
Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Анімацыйная праграма **"Немагчымае магчыма: на аўдыенцыі ў войта!"**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"** — да 30 верасня.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа ў гаспадарчай пабудове.
■ Выстава фотаздымкаў і невядомых рэчаў Песняра **"Якуб Колас: вядомы і невядомы"** з фондаў музея — да 15 сакавіка.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам, для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.

Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.
■ Выстава **"Родныя крыніцы. Рідні джерела"**, прымеркаваная да дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі — з 6 да 18 сакавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава твораў Кірылы Мельніка **"Адлюстраванне часу"** — да 5 сакавіка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Выставачна-інтэрактыўны праект **"Сустрэча з майстрам"**.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава жывапісу Рыгора Іванова **"Пад знакам святла"** — да 19 сакавіка.
■ Выстава **"Мінск Іосіфа Лангбарда"** — да 2 красавіка.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).
■ Выстава **"Вышываная прыгажосць"** — да 1 мая.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.
■ Новая экспазіцыя **"Мінская конная чыгунка"**.
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МѢСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Арт-праект **"Апладненне"** — да 12 сакавіка.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава **"Па слядах мамантаў"** — да 15 сакавіка.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Салдат заўсёды салдат"**.
■ Выстава **"Броня крепка"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2-68-96
■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Беларускія яўрэі", "Другая сусветная вайна"**.
■ Выстава жывапісу Сержа Філінгера **"Святло будучага мыслення"**.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка".

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Выстава ізраільскага фатографа Дафны Таль **"Цвёрдая Вера: Праваслаўе на Святой Зямлі"** — да 15 сакавіка.
■ Выстава сучасных ікон **"Апакаліпсіс"** па выніках Міжнародных майстар-класаў іканапісу ў Навіцы (Польшча) — да 18 сакавіка.

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41,
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **4 — Канцэрт "Штраус запрашае..."** (Музычныя вечары ў Вялікім).
■ **4 — "Zarzuela" ("Свята галубкі")**. Камерная зала імя Л.П.Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **5 — "Маленькі прынц"** (балет у 2-х дзеях) Я.Глебава. Пачатак аб 11-й і а 18-й.
■ **7 — святочны канцэрт "Для вас, душы маёй царыцы"**. Пачатак а 19-й.
■ **9, 10 — "Шчаўкунок, або Яшчэ адна калядная гісторыя"** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **10 — Вечар музыкі Сяргея Рахманінава.** Камерная зала імя Л.П.Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **11 — "Пікавая дама"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **4 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.
■ **5 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.
■ **7 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.
■ **9 — "Адэль"** (гісторыя кахання) Я.Таганава.
■ **10 — "Дзед"** (трагікамедыя) В.Паніна.
■ **11 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** (сучасная драма) Д.Балыка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

Гастролі Калінінградскага абласнога музычнага тэатра
■ **4 — "Новыя прыгоды Бураціна"** (мюзікл для дзяцей) А.Рыбнікава. Пачатак аб 11-й.
■ **4 — "Кахаць Нерона"** (рок-драма) В.Болычавай. Пачатак а 18-й.
■ **5 — "Царэўна-жабка"** (мюзікл) Н.Кузьміных, Я.Шашына. Пачатак аб 11-й.
■ **5 — "Асада"** Я.Грышкаўца. Пачатак а 18-й.
■ **6 — "Чалавек з Ламанчы"** (мюзікл) М.Лі.
■ **7 — "Спаталі смагу"** (правакацыйная камедыя 18+) В. Болычавай.
■ **8 — святочны канцэрт "Рамансы для каханых".** Пачатак а 18-й.
■ **9 — "Хаакін"** (рок-опера) А.Рыбнікава.
■ **10 — "Незвычайны талент"** (мюзікл) А.Шелыгіна.
■ **11 — "Востраў скарбаў"** Р.Стывенсана. Пачатак аб 11-й.
■ **11 — "Ігральны дом"** (мюзікл) А.Шаўцова. Пачатак а 18-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **4 — "Умка"** (кранальная гісторыя на адну дзею) Ю.Якаўлева. Пачатак аб 11-й.
■ **5 — "Брэменскія музыкі"** (музычная казка) В. Ліванава, Ю.Энціна. Пачатак аб 11-й.
■ **11 — "Ямелева шчасце"** (па матывах рускіх народных казак). Пачатак аб 11-й.